WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

*Родная газета на роднай мове*

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

11 снежня 2010 г.
СУБОТА
№ 243 (26851)
Кошт 650 рублёў



Фота БЕЛТА.

# БЕЛАРУСЬ ПРАПАНУЕ СТВАРЫЦЬ ІНСТЫТУТ ПАРТНЁРСТВА АДКБ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора ўзяў удзел у сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў — членаў АДКБ і пасяджэнні Савета калектыўнай бяспекі АДКБ.**

Беларусь у якасці прыярытэтных напрамкаў дзейнасці АДКБ на сярэднетэрміновую перспектыву выдзяляе стварэнне дзейснай сістэмы рэагавання на крызісныя сітуацыі. Аб гэтым гаварыцца ў зварoце Прэзідэнта Беларусі да кіраўнікоў дзяржаў — членаў АДКБ.

«Мінулы год для нашай арганізацыі быў вельмі няпросты. Існуючая ў зоне адказнасці АДКБ сітуацыя доказала, што неабходна выразна бачыць праблемы, своечасова і адэкватна на іх рэагаваць, — гаворыцца ў звароце. — Беларусь у перыяд свайго старшынства прыкладала і будзе прыкладаць усе намаганні для павышэння эфектыўнасці функцыянавання арганізацыі».

У час папярэдняй сустрэчы ў Ерэване быў пакладзены пачатак гэтаму працэсу, а менавіта прынята рашэнне па неабходнасці ўдасканалення патэнцыялу АДКБ у сферы крызіснага рэагавання. У развіццё гэтых дамоўленасцяў абмеркаваны і, у выпадку адабрэння членамі Савета, падпісаны адпаведныя дакументы ў гэтай сферы.

«Разам з тым мы толькі ў пачатку шляху. Нам неабходна будзе прыкласці намаганні, каб выпрацаваныя механізмы арганічна ўпісаліся і дапоўнілі ўжо існуючы інструментарый АДКБ па рэагаванні на крызісныя і канфліктныя сітуацыі», — адзначае кіраўнік беларускай дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка лічыць, што эфектыўнае і канструктыўнае ўзаемадзеянне ў знешнепалітычнай сферы застаецца актуальным для ўсіх дзяржаў — членаў АДКБ.

СТАР. 4

Еўрапейскі вопыт

# ПЕРШЫ АРЭНДНЫ ДОМ ПАБУДУЮЦЬ У СТАЛІЦЫ ЎЖО ПРАЗ ГОД

**Сістэму будаўніцтва і абслугоўвання арэндных дамоў актыўна распрацоўвалі ў Мінбудархітэктуры ўжо на працягу некалькіх апошніх гадоў. Цяпер канчаткова вырашана і зацверджана на ўрадавым узроўні, што стартаваць будаўніцтва такога жылля будзе ў якасці эксперыменту ў Мінску, — паведаміў рэдакцыі намеснік начальніка ўпраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Уладзімір ДАРАПІЕВІЧ.**

Кіраўніцтва УКБ Мінгарвыканкама спадзяецца, што пілотны праект па ўзвядзенні такіх аб'ектаў будзе арганізаваны ўжо ў пачатку наступнага года. Пасля плённых кансультацый спецыялістаў з нямецкімі калегамі, якія займаюцца сістэмай жыллёвай арэнды ўжо дзясяткі гадоў, было вырашана будаваць невялікі 9-павярховы жылы дом у панэльным выкананні вытворчасці МАПІД па амаль самай таннай серыі. Спачатку гарадскія чыноўнікі прапанавалі ўзвесці 19-павярховы жылы дом, сабекошт якога значна даражэйшы.

За тры бліжэйшыя гады ў сталіцы запланавана пабудаваць не менш за 250 кватэр такога жылля. Сёння актыўна шукаюць і рыхтуюць будпляцоўкі для ўзвядзення арэндных дамоў. Прагназуецца, што першыя муніцыпальныя дамы пабудуюць у Каменнай горцы ці ў мікрараёне Дружба. А ўвогуле, падбіраць месца будучаму арэнднаму дому трэба вельмі старанна і ўважліва, лічаць нямецкія спецыялісты. Трэба дакладна ўсвядоміць, што муніцыпальныя дамы будуць адрозніваецца ад іншых жылых будынкаў сваім спецыяльным статусам. У доме будуць жыць незнаёмыя людзі розных прафесій і сямейнага становішча. Гэта будзе такі своеасаблівы інтэрнат, дзе кліентам прапануецца жыллёвае памяшканне на ўмове доўгатэрміновай арэнды. Аднак, у адрозненне ад таннага інтэрната, тут не будзе вахцёрак і кастэлянак, а за кватэру неабходна плаціць за камунальныя паслугі плюс арэндную плату. Плануецца, што памер такой арэнднай платы будзе толькі нязначна ніжэйшым за сярэднюю рыначную арэнду ў горадзе.

Сёння прагназуецца, што такое жыллё ў першую чаргу будзе прапаноўвацца ўрачам, маладшаму медперсаналу, настаўнікам і іншым спецыялістам бюджэтнай сферы, дзе існуе праблема кадравага дэфіцыту. Вядома, што цяпер многія арганізацыі і прадпрыемствы згаджаюцца часткова аплачваць арэнду жылля сваім спецыялістам, калі апошнія прадастаўляюць афіцыйна аформленыя дакументы аб такой плаце. У гэтым выпадку распрацоўшчыкі сістэмы арэнднага жылля могуць удакладніць нарматыўную базу такім чынам, каб арэндную плату можна было аплачваць і па безнаяўным разліку.

У буйных гарадах багатых краін інстытут муніцыпальнага жылля актыўна функцыянуе ўжо даўно. Доля арэнднага жылля ў краінах Заходняй Еўропы складае ад 50 да 70 працэнтаў, у ЗША і Японіі — каля 35 працэнтаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**



# АДЧУЦЬ ТАЯМНІЦУ

**«Беларускі. Жанчыны Еўропы».** Пацверджана дакументальна і не падлягае сумненню! А цяпер яшчэ і замацавана ў музеі рэдкай кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, дзе будзе захоўвацца 5 тамоў кніг фотамастачкі Алены Адамчык.

СТАР. 4

Здароўе нацыі

# НАРАДЖАЙ, НЕ БОЙСЯ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## або Чаму нельга абязболіць усе роды?

**Як трапна было заўважана ў адной тэлеперадачы, жанчына — гэта дрэва, на галінах якога «размяшчаюцца» муж, дзеці, сваякі, а таксама сабака, кошка ці хамячок. Так што палівайць гэтае дрэва трэба залатым дажджом! Ну, а цяжарную жанчыну (дадам я ад сябе) трэба, відаць, паліваць... пяцінавым дажджом! А цяпер пра канкрэтнае. Самым вядомым страхам жанчын, якія жадаюць нарадзіць дзіця, застаецца страх перад болем у родах. Адной з самых вострых праблем у галіне акушэрства і гінекалогіі з'яўляецца невыношванне цяжарнасці. У розных краінах існуюць розныя падыходы для перамагання гэтых сітуацый. Пра айчынныя варыянты расказвае дацэнт кафедры акушэрства і гінекалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук Віталь ДУДА.**

СТАР. 6



АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Дорожно-строительный трест № 5» (продавец)** проводит открытый аукцион по продаже двухэтажного, кирпичного, незаконченного строительством, законсервированного здания административно-бытового корпуса (готовность – 91 %), инв. № 633/U-8105, общ. пл. 585,3 кв.м, расположенного по адресу: **Минская обл., Мядельский р-н, Нарочанский с/с, д. Рудошаны.**

**Начальная цена с НДС – 188 040 000 бел. руб.**

Площадь земельного участка – **0,1819 га.**

**Задаток в сумме 15 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, ***если иное не предусмотрено договором купли-продажи.***

**Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.**

Аукцион состоится **12.01.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.01.2011** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**

| *Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.12.2010 г. (для б/н разлікаў)* | | *Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ* |
|---|---|---|
| 1 долар ЗША 3 011,00 | 1 чэшская крона 158,82 | USD 30,8604 |
| ▼ 1 еўра 3 985,36 | 1 польскі злоты 988,31 | 10 UAH 38,7426 |
| 1 латвійскі лат 5 617,01 | ▲ 1 расійскі рубель 97,57 | 1000 BYR 10,2458 |
| 1 літоўскі літ 1 154,50 | 1 украінская грыўня 377,98 | EUR 40,9394 |

# Пагадненне аб бяспошлінных пастаўках нафты і нафтапрадуктаў у Мытным саюзе будзе бестэрміновым

**Аб гэтым паведаміў у Маскве журналістам першы віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка, перадае БЕЛТА.**

Паводле слоў Уладзіміра Сямашкі, адбылася надзвычай плённая сустрэча Аляксандра Лукашэнкі і Дзмітрыя Мядзведзева, і як вынік былі прыняты прынцыповыя рашэнні. «Падпісана бестэрміновае пагадненне. Пастаўкі нафты, нафтапрадуктаў і прыроднага газу ўнутры Мытнага саюза трох дзяржаў будуць ажыццяўляцца без пошлін, кватавання і абмежаванняў», — падкрэсліў ён.

Першы віцэ-прэм'ер адзначыў, што зроблена ўсё для таго, каб пагадненне ўступіла ў дзеянне з 1 студзеня 2011 года. «З 1 студзеня 2011 года мы будзем атрымліваць нафту і нафтапрадукты бяспошлінна, — растлумачыў ён. — Газ мы атрымлівалі бяспошлінна, але заўсёды былі нейкія сумненні. Цяпер гэта прэферэнцыя пастаянная ў рамках Мытнага саюза».

Уладзімір Сямашка растлумачыў механізм раздзялення экспартных пошлін: пры экспарце ў трэція краіны нафты, якая здабываецца ў Беларусі, а гэта прыкладна 1,7 млн тон, «уся вывазная мытная пошліна будзе заставацца ў бюджэце Беларусі». «А ўсе пошліны на нафтапрадукты, нягледзячы на паходжанне: ці то з расійскай нафты яны, ці то з беларускай, — пойдуць у бюджэт Расіі. У гэтым заключаецца кампраміс», — дадаў ён.

Паводле слоў першага віцэ-прэм'ера, дасягнута дамоўленасць, што такая схема будзе дзейнічаць на працягу трох гадоў да таго моманту, пакуль тры краіны не выпрацуюць іншы механізм падзелу вывазных мытных пошлін.

Адносна венесуэльскай нафты, а таксама нафты з трэціх краін ён адзначыў, што «ўсе трэція краіны выведзены за межы гэтых пагадненняў». «Па-за Мытным саюзам такая нафта ўвозіцца ў рэжыме часовай перапрацоўкі, — падкрэсліў Уладзімір Сямашка. — Усе пошліны пры вывазе гэтай прадукцыі будуць заставацца ў бюджэце Беларусі».

## Абзац

◢ **Сярэдняя заработная плата працаўнікоў Віцебскай вобласці ў снежні наступнага года павінна скласці Br1,9 млн. Пра гэта заявіў учора на чарговай сесіі абласнога Савета дэпутатаў старшыня аблвыканкама Аляксандр Косінец.**

◢ Генеральны дырэктар ЗАТ «Холдынгавая кампанія» «Пінскдрэў» Ларан Арыніч падаў заяву аб складанні з сябе паўнамоцтваў кіраўніка холдынгу. Як вядома, 25 кастрычніка на прадпрыемстве адбыўся выбух, які забраў жыцці 14 работнікаў прадпрыемства. У бальніцах Брэста і Мінска на лячэнні застаецца пяць пацярпелых работнікаў. Рашэнне наконт адстаўкі кіраўніка плануецца разгледзець на пазачарговым сходзе акцыянераў. Дата яго правядзення пакуль не прызначана.

◢ **У сталіцы кіроўца збіў трох чалавек і нават не спыніўся. Інцыдэнт адбыўся на вуліцы Солтыса ў Мінску. Вінаваты — кіроўца аўтамабіля «Форд-Сіера». Інспектары ДАІ знайшлі разбітую машыну ў двары дома непадалёк. Машыну кінулі, нават не замкнуўшы. Хто сядзеў за рулём у момант аварыі, невядома. Уладальнік аўтамабіля сцвярджае, што машыну сагналі за пэўны час да аварыі. Двое з пацярпелых пешаходаў атрымалі сур'ёзныя траўмы і зараз знаходзяцца ў бальніцы.**

◢ Следчае аддзяленне Кобрынскага РАУС распачало справу аб махлярстве ў асабліва буйным памеры. 15 верасня невядомы, назваўшыся дырэктарам прыватнай сталічнай гандлёвай фірмы, махлярскім шляхам атрымаў прадукцыю аднаго з прадпрыемстваў Кобрына — поліэтыленавую плёнку на суму звыш 66,3 млн. рублёў. Зламыснік выкарыстаў падроблены пашпарт на чужое імя, а таксама дакументы і пячатку мінскай фірмы. Аналагічная справа распачата Гродзенскім РАУС. Махляр, які дзейнічаў ад імя гэтай жа мінскай фірмы і з тым жа пашпартам, завалодаў прадукцыяй аднаго з прадпрыемстваў Гродна.

## Поўны абзац

◢ **У Вялікабрытаніі бабуля «вырубіла» амаль паўсотні байцоў спецназу. Пакаштаваўшы прыгатаваныя яе «клапатлівымі» рукамі гатовыя сняданкі, адразу 47 афіцэраў брытанскай паліцыі, членаў спецыяльнага атрада па барацьбе з вулічнымі беспарадкамі, апынуліся на бальнічнай койцы. Некаторым спатрэбілася інтэнсіўная тэрапія для выратавання жыцця. 70-гадовая гаспадыня кавярні пакарміла вартавых парадку нясвежым курыным мясам і бутэрбродамі з тунцом — са 100 набораў амаль палова аказалася нягоднай для выкарыстання, сапсаваныя прадукты шчодра былі пасыпаны спецыямі. Калі б на месцы паліцэйскіх апынуліся менш фізічна моцныя людзі, смяротных зыходаў не ўдалося б пазбегнуць, адзначыў суддзя пры вынясенні прысуду. Бабулі-«дыверсантцы» прысудзілі 4 месяцы турмы... умоўна.**



◢ Швейцарская кампанія «Каралеўская мануфактура» выпусціла самыя дарагія ў свеце гадзіннікі. Кошт новай маркі гадзінніка-акардэона дасягае $1,2 млн. Хранометры ў корпусе з колцаў звычайнага і 18-каратнага золата, што расцягваецца, як акардэон, з сапфірамі, працуюць на адным заводзе 100 гадзін. Усяго выраблена 12 экзэмпляраў такіх гадзіннікаў. Навінка выпускаецца самым высокім стандартам якасці, які выклікае захапленне калекцыянераў.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

# ДРУГОЕ ДЫХАННЕ

**Парламенцкі дзённік**

## ...адкрылася ў беларуска-ўкраінскім гандлі, і парламентарыі дзвюх краін абмяркоўваюць, як стварыць для яго максімальна спрыяльны прававы клімат

**Звізітам у Беларусі цяпер знаходзіцца ўкраінская парламенцкая дэлегацыя. Адносіны з тутэйшымі калегамі ў іх на досыць высокім узроўні: ёсць нават сумесная міжпарламенцкая камісія. І цяперашнія перамовы — трэцця па ліку за час яе існавання. Задзел ёсць, але ж патэнцыял яшчэ багацейшы. Парламентарыі, зразумелая рэч, засяродзіліся на абмеркаванні дамоўна-прававой базы: як яе ўдасканаліць і паспрыяць найперш гандлёва-эканамічным стасункам.**

— Вынік гандлёва-эканамічных адносін паміж Беларуссю і Украінай сёлета значна больш важкі, чым летась, — акцэнтуе **намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Віктар ГУМІНСКІ**. — Прычым Беларусь сёння мае станоўчае сальда гандлю з Украінай. І варта абмеркаваць, што нам, парламентарыям, трэба зрабіць у прававой сферы, каб даць больш магчымасцяў для гандлю, каб не было ў нас бар'ераў для тых жа бізнесменаў.

Спадар Гумінскі нагадаў пра сумесныя прадпрыемствы, якія працуюць ва Украіне: па зборцы трактароў МТЗ, ліфтаў, тэхнікі «Лідаграпраммаш». Пачалі пастаўляць у суседнюю краіну беларускую сельскагаспадарчую тэхніку на ўмовах доўгатэрміновага лізінгу. І калі раней, паводле звестак В. Гумінскага, Украіна, наш стратэгічны партнёр у галіне гандлёва-эканамічных адносін, была на чацвёртым месцы, то сёлета ўжо за 10 месяцаў патрапіла ў тройку ў структуры нашага знешняга гандлю.

— Быццам бы адкрылася другое дыханне ў гандлі з Украінай і мы набіраем абароты, — дзеліцца сваім успрыманнем беларускі віцэ-спікер. — Будзем рухацца наперад у гэтым кірунку.

На думку кіраўніка ўкраінскай дэлегацыі, **віцэ-спікера ўкраінскага парламента Мікалая ТАМЕНКІ**, у першую чаргу неабходна «больш сур'ёзная сінхранізацыя нашых падыходаў у галіне міжнароднага гандлю».

Паміж краінамі ўжо заключана 160 дамоў рознай скіраванасці. Толькі сёлета ратыфікаваныя пяць дакументаў. Сярод іх і такія важныя, як пагадненні аб дзяржаўнай мяжы і аб бязвізавых паездках грамадзян. Таму не менш актуальныя за эканамічныя аспекты і чыста побытавыя праблемы.

— Нам трэба ўрэгуляваць усе пытанні, звязаныя са знаходжаннем грамадзян адной краіны на тэрыторыі іншай, — упэўнены В. Гумінскі. — Мець належную прававую базу, каб з медыцынскім абслугоўваннем і іншымі падобнымі пытаннямі ніякіх непаразуменняў не было.

Зверылі таксама гадзіннікі і па дзейнасці ў міжнародных парламенцкіх структурах.

— Каб дамагацца станоўчых вынікаў падчас прыняцця міжнародных рашэнняў, павінна быць узаемадзеянне. Дагэтуль яно атрымлівалася, — адзначае намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў. — Украінскі бок падтрымлівае нас у ПА АБСЕ, атрыманні статусу спецзапрошанага ў ПАСЕ, у Міжнародным парламенцкім саюзе садзейнічаем адно аднаму пастаянна.

Намеснік старшыні Вярхоўнай Рады Украіны канстатаваў:

— Сёння мы сінхранізуем нашу работу ў рамках Усходняга партнёрства, іншых сусветных міжпарламенцкіх праектах. Мы зацікаўлены ў гэтым і бачым Беларусь у новых і традыцыйных еўрапейскіх праектах.

На яго думку, важна абмеркаваць дамоўна-прававыя нюансы афармлення беларуска-ўкраінскай мяжы і магчымасці выкарыстання для яе ўладкавання рэсурсаў у рамках Усходняга партнёрства.

Падчас сустрэчы з кіраўніцтвам Савета Рэспублікі Мікалай Таменка прапанаваў стварыць, у дадатак да міжпарламенцкай камісіі па супрацоўніцтве, яшчэ і традыцыйныя групы сяброўства. Для ўмацавання сувязяў паміж Нацыянальным сходам і Вярхоўнай Радай, актывізацыі народна-парламенцкай дыпламатыі. Ён таксама афіцыйна запрасіў **старшыню Савета Рэспублікі Анатоля РУБІНАВА** наведаць Украіну.

— У нас з Украінай заўжды былі, ёсць і будуць самыя добрыя, блізкія, сяброўскія, братэрскія адносіны, — запэўніў гасцей кіраўнік верхняй палаты беларускага парламента. — Паміж намі не тое што кошка не прабягала, нават мурашка не прапаўзала. Беларускія і ўкраінскія людзі вельмі блізкія па натуры — добразычлівыя, шчырыя, ім лёгка ўзаемадзейнічаць. Аб'ектыўна мы зацікаўленыя адно ў адным — каб развіваць нашы эканамічныя адносіны. У нас шмат агульнага: абедзве краіны транзітныя, абедзве маюць пытанні, якія трэба вырашаць і на Захадзе, і на Усходзе. Разам гэта рабіць лягчэй. Нашы кіраўнікі заўжды добра кантактавалі, не было супярэчнасцяў. Умовы для далейшага развіцця на карысць нашых народаў ёсць.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

# А СТЫМУЛЫ ДЛЯ КАГО?

Адкрываючы чарговае пасяджэнне сесіі, **старшыня Савета Рэспублікі Анатоль РУБІНАЎ** падагульніў вынікі вельмі важнага рэспубліканскага форуму, які нядаўна сабраў каля 2,5 тысячы ўдзельнікаў з усіх куткоў краіны. На IV Усебеларускім сходзе, на думку спікера, была дадзеная дастаткова яркая карціна сітуацыі ў краіне:

— Яна дае нам цвёрдую ўпэўненасць у тым, што мы слушна дзейнічалі ўчора і дасягнём сваіх мэтаў заўтра.

А мэты гэтыя — ні больш, ні менш як імкнуцца да самых развітых краін Заходняй Еўропы і па ўзроўні жыцця, і па ўзроўні эканомікі.

— Гэта складаная задача, але рэальная, — перакананы спікер.

І сенатарам, паводле меркавання кіраўніка Савета Рэспублікі, варта ўключыцца ў гэтую работу — актыўна працаваць на месцах, даводзіць наяўную карціну.

— Я ніколі не кажу: галасуйце за некага. Трэба проста паказваць, якая Беларусь, чаго яна дасягнула, чаму ідзе такім шляхам, а не іншым, якая ў нас будучыня. Каб людзі ўсведамлялі сябе грамадзянамі і свядома працавалі на карысць нашай Радзімы.

Станоўча адгукаўся спікер і пра нядаўнія дамоўленасці, дасягнутыя падчас перамоў адносна Адзінай эканамічнай прасторы.

— Нядаўнія рашэнні — сапраўдны прарыў, — мяркуе кіраўнік верхняй палаты беларускага парламента.

У гэтым ён прасочвае паслядоўную пазіцыю нашага Прэзідэнта, «якога нішто не змагло збіць са шляху». Нападкі, ініцыяваныя «нейкімі недалёкімі людзьмі, якія дбалі пра ўласныя карпаратыўныя інтарэсы», мінуліся. «І Прэзідэнт вытрымаў непахісную пазіцыю. Яна слушная, і яе падтрымліваюць беларускі і расійскі народы». Зроблены прарыў, паводле ўражанняў спікера, беспрэцэдэнтны.

— Упершыню за многія гады мы з вамі будзем сустракаць Новы год, абсалютна не думаючы пра тое, ці будуць у нас нафта і газ, ці будуць зноў нейкія канфлікты. У нас, як ніколі, выразная дарога наперадзе.

Прычым новыя перспектывы, на яго думку, адкрываюцца не толькі для Беларусі, але і для іншых дзяржаў постсавецкай прасторы.

Наблізіцца да заходнееўрапейскіх стандартаў Беларусі, несумненна, дапаможа і з'яўленне новага закона — аб узнаўляльных крыніцах энергіі. Праект яго ўчора ўхвалілі сенатары. Дакумент рэгламентуе вытворчасць электраэнергіі ўзнаўляльнымі крыніцамі, запасы якіх мала таго, што невычарпальныя (у адрозненне ад традыцыйных нафты, газу ды вугалю), дык яшчэ і экалагічна бяспечныя.

Вытворцам вечнай энергіі беларускія заканадаўцы абяцаюць падключэнне да дзяржаўнай энергасеткі і набыццё выпрацаванага. Прычым па стымулюючых тарыфах. Ветру — свая надбаўка, вадзе — свая... Распрацоўшчыкі кіраваліся тым, што ў вытворцаў будуць розныя першапачатковыя выдаткі. Тэрмін дзеяння бонусных тарыфаў падоўжаны дакументам да 10 гадоў. Ад вытворцаў жа чакаюць выкарыстання эфектыўных тэхналогій пры ўстаноўцы, паасобнага ўліку энергіі, выдаткаў на падключэнне ўласных установак да дзяржаўных энергасетак.

**Старшыня пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Генадзь НАВІЦКІ** падчас гутаркі з журналістамі выказаў упэўненасць у тым, што з'яўленне закона прывабіць інвестараў. Інтарэсу да рэалізацыі падобных праектаў у Беларусі — хоць адбаўляй. Бадай, адзінае, што стрымлівала дагэтуль бізнесменаў, у тым ліку і замежных, — недасканаласць нашай прававой базы: адсутнасць дастатковага рэгулявання, стымулаў, гарантый.

— Разавыя капіталаўкладанні пры ўзвядзенні аб'ектаў узнаўляльнай энергетыкі большыя за тыя, што выдаткоўваюцца на традыцыйныя, — адзначае старшыня пастаяннай камісіі. — Дзяржава за кошт бюджэту стварае такія ўмовы, каб для тых, хто будзе займацца ўзнаўляльнай энергетыкай, гэта было больш выгадна.

Аднак галоўнае, што турбуе ва ўсім гэтым простага смяротнага — наколькі скокне кошт электрычнасці з развіццём альтэрнатыўнай энергетыкі?

— Розніцы ў аплаце электраэнергіі спажывец не адчуе,— запэўнівае Генадзь Навіцкі, — ёсць гэта ці няма, і ў якім аб'ёме выкарыстоўваецца ў краіне.

Многа чуецца, ды пакуль мала верыцца... Павышальныя каэфіцыенты, між іншым, уключаны ў сабекошт нетрадыцыйнай энергіі. У адрозненне ад, напрыклад, нямецкай схемы, дзе розніцу бяро на сябе бюджэт. Але ж будзем спадзявацца на лепшае і верыць у тое, што тарыфы, якія стымулююць вытворцу, не акажуць адваротнага ўздзеяння на спажыўца. Вельмі б не хацелася, каб павелічэнне рахунку за святло «стымулявала» людзей да адмаўлення ўзнаўляльнай энергіі...

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

# ДЛЯ ЛІКВІДАЦЫІ ПАЖАРУ Ў ТЭАТРЫ МУЗКАМЕДЫІ Ў МІНСКУ БЫЛО НАКІРАВАНА 20 АДЗІНАК ТЭХНІКІ

**Для ліквідацыі пажару ў Беларускім дзяржаўным тэатры музычнай камедыі ў Мінску ўчора было накіравана 20 адзінак аварыйна-выратавальнай тэхнікі. Узгаранне аператыўна ліквідаванае, пацярпелых няма. Пра гэта БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе МНС.**



Фота БЕЛТА.

Паведамленне аб здарэнні ў тэатры паступіла ў сталічную службу МНС у 10 гадзін раніцы. Неадкладна да месца ўзгарання было накіравана 20 адзінак пажарнай аварыйна-выратавальнай тэхнікі. Як патлумачылі ў МНС, пры паступленні паведамленняў аб пажарах на такіх буйных аб'ектах заўсёды накіроўваецца вялікая колькасць пажарнай тэхнікі.

Пасля прыбыцця на месца выратавальнікі выявілі, што гарыць смецце ў памяшканні тэатральнага радыёцэха на 4-м паверсе будынка. У 10.14 пажар быў ліквідаваны.

Паколькі ў гэты час у тэатры праходзіла рэпетыцыя спектакля, а па будынку распаўсюджваўся едкі дым, выратавальнікам давялося эвакуяваць 48 чалавек.

Прычыны здарэння ў цяперашні час высвятляюцца.

## З-за пакінутай на падлозе свечкі...

**Удзень у Докшыцкае раённае падраздзяленне МНС паведамілі пра пажар у двухпакаёвай кватэры жылога чатырохпавярховага дома па вуліцы Палявога ў вёсцы Крулеўшчына.**

Моцнае задымленне на лесвічнай пляцоўцы, гарэнне пасцельных прыналежнасцяў у пакоі кватэры на чацвёртым паверсе цаглянага дома і гаспадар жытла 1939 года нараджэння ў ложку — вось што ўбачылі выратавальнікі, калі прыбылі на месца здарэння. Пенсіянер у стане алкагольнага ап'янення з дыяганазам «атручэнне чадным газам» быў дастаўлены ў раённую бальніцу. З кватэр на трэцім і чацвёртым паверхах эвакуіраваны чатыры чалавекі. Як мяркуецца, гаспадар кватэры неасцярожна абыходзіўся з агнём — пакінуў на падлозе запаленую свечку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# СТАРАЖЫТНЫ ТУРАЎ ЗНАХОДЗІЎСЯ Ў ЮРАВІЧАХ?

**НАВАТ тыя, хто дрэнна вучыўся ў школе, без праблем назавуць першую стаянку старажытнага чалавека на тэрыторыі Беларусі. Тым не менш, ход пазнейшых падзей у мястэчку Юравічы падручнікі ад школьнікаў утойвалі, хоць вёска ў беларускім Палессі заслугоўвае большай увагі. Ні многа ні мала, але тут мог першапачаткова знаходзіцца Тураў — адзін з самых старажытных гарадоў нашай краіны...**

### АРХЕАЛАГІЧНАЯ ЗАГАДКА

Самы вядомы археалагічны помнік у Беларусі адначасова з'яўляецца і адным з самых загадкавых. І краманьёнцы са сваімі мамантамі тут ні пры чым. Пытанні выклікае гарадзішча Х-ХІ стагоддзя, якое знаходзіцца зусім побач з першабытнай стаянкай і па памерах можна параўнацца толькі са старажытным Полацкам! Але ўсё незадача: ніякіх пісьмовых звестак пра вялікі горад на месцы сучасных Юравічаў няма. Толькі археалагічныя знаходкі даюць падставу лічыць, што тут быў буйны населены пункт са сваім дзядзінцам, пасадам і царквой. Але што гэта за горад і куды ён бясследна знік?

Старшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Інстытута гісторыі НАН Алег Іоў з 2004 года праводзіць раскопкі на юравіцкім гарадзішчы. Ён упэўнены, што менавіта тут першапачаткова знаходзіўся горад Тураў! Справа ў тым, што ў сучасным найменным пасёлку ў Жыткавіцкім раёне самыя раннія археалагічныя знаходкі адносяцца да ХІІ-ХІІІ стагоддзя, у той час як горад узгадваецца пад 980 годам. У Х стагоддзі, акрамя Турава, іншых населеных пунктаў на поўдні Беларусі ў крыніцах не знойдзеш. Гэтая акалічнасць прымусіла задумацца навукоўца. Здавалася б, і горад княжацкі, і падзеі па летапісных крыніцах разгорталіся нейкія, а фактуры няма! Побач з пасёлкам буйных гарадзішчаў таксама не было выяўлена. А вось Юравічы са сваімі памерамі і знаходкамі выдатна падыходзяць на ролю княжацкага цэнтра.

Аб умацаваным гарадзішчы турыстам сёння нагадваюць валы, якія аддзялялі горад ад сядзібы князя. У цэнтры дзядзінца знаходзіцца калодзеж 30 метраў глыбінёй і 6 метраў у дыяметры. Такія калодзежы капалі, каб браць ваду падчас аблогі. Іншых падобных калодзежаў таго часу ў Беларусі больш не выяўлена.

Дарэчы, знаходкі часткова пацвярджаюць легенду аб заснаванні горада. Згодна з ёй Тураў быў закладзены скандынаўскім князем Турам. Калі да асобы князя, як гістарычнага персанажа, навукоўцы ставяцца з асцярогай, то аб прысутнасці вікінгаў вядома дакладна. На юравіцкім гарадзішчы знойдзены манеты і касцяны псалій (частка коннай збруі) скандынаўскага паходжання. Апошні не мае аналагаў на тэрыторыі Беларусі. Не так даўно недалёк ад вёскі таксама былі знойдзены рэдкія экзэмпляры — наканечнік нажнаў скандынаўскага мяча, а таксама гаршчок з арнаментам, які ўласцівы паўночнаму «заморскаму» народу. Усё гэта гаворыць пра тое, што ў Юравічах аб вікінгах ведалі. А калі улічваць, што рускія князі паходзілі са Скандынавіі, то можна меркаваць, што Тураў, яны ж Юравічы, быў заснаваны пры іх непасрэдным удзеле.

Алег Іоў звяртае ўвагу на тое, што побач з вёскай калісьці працякала рака Тур'я (зараз гэта канал). У той час многія гарады атрымоўвалі назву ад невялікіх рэк, на якіх сяліліся людзі. Полацк — гэта рака Палата, Віцебск — Віцьба, Друцк — Друць, Менск — Менка. Навуковец лічыць, што па такой жа аналогіі быў названы і Тураў. Вось толькі такі падыход выклікае пытанне: чаму тады Тураў, а не Турск ці Турыйск? Усе мы з уроку гісторыі ведаем, што калі назвы даваліся гарадам ад рэк, то выкарыстоўваўся суфікс —ск-, а калі ад уласнага імя — зусім іншыя. Алег Іоў лічыць, што назва магла змяніцца ў пазнейшы час, у тым ліку і для таго, каб пацвердзіць легенду аб заснаванні Турава.

Перанос назваў горада з аднаго месца на іншае быў распаўсюджаны ў сярэднія вякі. Напрыклад, Смаленск знаходзіўся раней на іншым месцы і меў назву Гнездава. Ноўгарад таксама быў не там, дзе зараз. Ды што казаць, калі Менск першапачаткова размяшчаўся на рацэ Менка, а пасля зруйнавання горада людзі перанеслі назву на новае месца. Але як назва «Тураў» з Юравічаў магла перанесціся на 130 кіламетраў супраць плыні?!

Археолаг Алег Іоў мяркуе, што ўмацаваны цэнтр у Юравічах называўся Туравам, у той час, калі там знаходзіўся на пасадзе Святаполк — той самы, які забіў Барыса і Глеба і аб якім так негатыўна ўзгадваюць летапісцы. Дык вось гэты Святаполк, будучы ў Тураве, паспеў нарабіць столькі, што трапіў у няміласць кіеўскага князя Уладзіміра Хрысціцеля. Ён прывёз у Тураў хрысціянскіх святароў заходняга абраду, ажаніўся з польскай прынцэсай. Толькі б гэтага хапіла для таго, каб пазнейшыя летапісцы (пераважна праваслаўныя манахі) ахрысцілі Святаполка Акаянным. Да таго ж, пасля смерці князя Уладзіміра ў 1015 годзе ён распачаў барацьбу за кіеўскі пасад з яго родным сынам Яраславам Мудрым. Вайну Святаполк у выніку прайграў і вымушаны быў уцякаць. Менавіта з гэтай барацьбой Алег Іоў звязвае знікненне горада ў Юравічах. Людзі вымушаны былі бегчы і заснавалі новае пасяленне на Прыпяці, што цяпер у Жыткавіцкім раёне. Тураў быў пазбаўлены самастойнасці. Незалежнасць горад атрымаў толькі ў сярэдзіне ХІІ стагоддзя ў часы княжання Юрыя Яраславіча, які паклаў пачатак дынастыі турава-пінскіх князёў.

### ІНШЫЯ ВЕРСІІ

Назва «Юравічы» ўпершыню ўзгадваецца пад 1510 годам у літоўскай метрыцы. Дакумент пацвярджаў правы на валоданне сялом нашчадкаў Багдана Сербіна, які служыў у вялікага князя Свідрыгайлы (1430-1432). Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што назва мястэчка паходзіць ад нейкага Юрыя, які пакінуў тут пасля сябе сваіх родзічаў.

Па мясцовых легендах, з Масквы да Юравічаў дацягнуліся рукі самога заснавальніка «златаглавай» Юрыя Даўгарукага, які вёў барацьбу за княжацкі пасад у Кіеве. Баявыя дзеянні якраз маглі закранаць землі вакол сучаснай вёсцы Мазырскага раёна. Кажуць, што нашчадкі князя і па сёння жывуць у Юравічах.

Акрамя таго, юравічамі маглі называць і родзічаў тураўскага князя Юрыя Яраславіча. Але прамых звестак на гэтую версію ў крыніцах няма. Затое Міжмосце, якое ўзгадваецца ў Іпацьеўскім летапісе, дае некаторым




даследчыкам падставу меркаваць, што «загадкавы» горад называўся менавіта так. Падзеі адбываліся ў 1169 годзе. Кіеўскі князь адправіў пасланца ў Ноўгарад з просьбай аб ваеннай дапамозе. Але пасланца затрымалі каля Міжмосця. Ці было гэта паблізу Юравічаў, можна толькі здагадвацца, таму што гэта і аспрэчыць цяжка, і даказаць немагчыма.

У народных легендах ёсць версія і пра знікненне горада на юравіцкіх узгорках. Ва ўсім вінаватыя татары, якія спустошылі яго ў 1240 годзе пасля паходу на Кіеў. Пакуль што археолагі гэтую версію не пацвердзілі, і растлумачыць, чаму людзі пакінулі ўмацаваны горад, гісторыкі яшчэ не могуць. Усё грунтуецца толькі на здагадках. Парадокс: стаянка, якой больш за 26 тысяч год, не выклікае столькі пытанняў, як гарадзішча Х стагоддзя! Будзем спадзявацца, што Юравічы рана ці позна адкрыюць нам свае таямніцы і дадуць глебу для роздуму над загадкамі беларускай гісторыі.

**Уладзіслаў КУЗЬМІН.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ЛОНДАНЕ БЯСЧЫНСТВУЮЦЬ ШКОЛЬНІКІ І СТУДЭНТЫ

**Пратэсты агрэсіўна настроеных моладзевых арганізацый у цэнтры Лондана перараслі ў масавыя беспарадкі. У выніку раз'юшаных сутычак моладзі, якая мітынгуе супраць павышэння платы за адукацыю, пацярпела 12 ахоўнікаў парадку і больш за 40 дэманстрантаў, каля 20 актывістаў былі арыштаваныя.**



Масавыя акцыі пратэсту пачаліся напярэдадні днём. Тысячы студэнтаў і школьнікаў, якія выйшлі на вуліцы, пратэставалі супраць правядзення брытанскімі ўладамі рэформы адукацыі і павышэння платы за навучанне ў англійскіх універсітэтах. Аднак, нягледзячы на масавую незадаволенасць, парламент усё ж павысіў кошт навучання ў тры разы, і зараз вышэйшая адукацыя будзе каштаваць падданым Злучанага Каралеўства ў дзевяць тысяч фунтаў у год. Незадаволеныя крокамі ўрада пратэстоўцы грамілі фасады будынкаў міністэрства фінансаў і Вярхоўнага суда, білі шкляныя вітрыны крам. Дасталося і каранаваным асобам, і гістарычным: дэманстранты атакавалі аўтамабіль



каралеўскай пары — прынца Чарльза і яго жонкі герцагіні Камілы, якія ехалі ў тэатр па парадай вуліцы Лондана. Члены каралеўскай фаміліі не пацярпелі. За некалькі гадзін да гэтага агрэсіўна настроеная маладая людзі забраліся на помнік прэм'ер-міністру Уінстану Чэрчылю насупраць парламента і залілі яго фарбай.

### НАВУКОЎЦЫ ВЫЛІЧЫЛІ ЕГІПЕЦКУЮ АКУЛУ-ЗАБОЙЦУ

**Не менш за трое з пяці пацярпелых у Егіпце турыстаў атакавала адна і тая ж акула. Да такой высновы прыйшлі адмыслоўцы па гэтых марскіх драпежніках, якія расследуюць нападзенні ў Шарм-эль-Шэйху. На іх думку, акула-людаед дагэтуль знаходзіцца паблізу ад прыбярэжнай зоны папулярнага курорта.**

У дадзены момант у акваторыю Шарм-эль-Шэйха накіроўваецца даследчае судна, якое будзе вывучаць прычыны змены мадэлі паводзін егіпецкіх акул, якія раней паводзілі сябе мірна. Тым часам мясцовыя ўлады былі вымушаныя зноў забараніць купанне каля берагоў Шарм-эль-Шэйха. На сённяшні дзень захадзіць у ваду можна толькі на трох ахоўных пляжах, якія размяшчаюцца за межамі горада. У той жа час, супрацоўнікі некаторых гатэляў паведамляюць, што расіяне не звяртаюць увагі на забарону ўладаў, і заходзяць у мора, нягледзячы на небяспеку. У апошні час у раёне Шарм-эль-Шэйха было зафіксавана адразу некалькі нападзенняў акул на адпачывальнікаў. У выніку нападаў марскіх драпежнікаў, якія пачаліся тыдзень таму, пацярпела трое расіян і ўкраінец. Адпачывальнікі атрымалі шматлікія раны і пазбавіліся канечнасцяў. Інцыдэнты прымусілі мясцовыя ўлады зачыніць пляжы і пачаць пошукі акул. Дваіх людаедаў атрымалася нейтралізаваць. Пасля гэтага на курортах Шарм-эль-Шэйха дазволілі купацца, аднак у выхадныя яшчэ адна акула да смерці пакусала турыстку з Германіі.



### ЛІТОЎЦАМ ПАГРАЖАЕ ШТРАФ ЗА ЛАПАТУ З САВЕЦКАЙ СІМВОЛІКАЙ

**У літоўскім горадзе Панявежыс супрацоўнікам мясцовага камунальнага прадпрыемства Panevezio gatves прыстрашылі штрафам за тое, што яны карысталіся лапатамі з савецкай сімволікай.**

Лапаты для ўборкі снегу, як растлумачыў прадстаўнік прадпрыемства, былі выраблены з фанеры, пакінутай яшчэ з савецкіх часоў. «Засталася добрая чырвоная фанера з малюнкам сярпа і молата. Каб яе не выкідваць, мы зрабілі з яе лапаты», — адзначыў ён. У мэрыі, аднак, палічылі факт выкарыстання падобных інструментаў парушэннем закона аб забароне савецкай сімволікі. Супрацоўнікам прадпрыемства пагражае штраф у памеры ад 500 да 1000 літаў (ад 190 да 380 долараў), лапаты могуць быць канфіскаваныя. Забарона на дэманстрацыю савецкай, а таксама нацысцкай, сімволікі дзейнічае ў Літве з 2008 года.

### БРЫТАНЦАЎ ЗБЯНТЭЖЫЛІ ПЛАСТЫКАВЫЯ СВІННІ Ў ПОЛІ

**У полі непадалёк ад адной з аўтамабільных дарог у населеным пункце Гэйдан у брытанскім графстве Уоркшыр з'явіліся загадкавыя пластыкавыя свінні. Адкуль яны ўзяліся і што сімвалізуюць, невядома.**

Упершыню штучных жывёл заўважылі ў пачатку тыдня, і да гэтага моманту гісторыя іх з'яўлення невядомая. Як распавялі мясцовыя аўтамабілісты, спачатку яны прынялі пластыкавых свіней за сапраўдных. Усяго побач з дарогай знаходзіцца каля 70 свіней, шэсць з якіх сядзяць у цэнтры кола.

## ЗІМОВЫЯ АКЦЭНТЫ

**У зімы свая прыгажосць, і асацыіруецца яна са снегам. Белы колер таксама багаты на адценні, але на ім не часта можна ўбачыць акцэнт — яркую плямку.**



Рабіна прыгожа выглядае на снезе, але часта яшчэ на самым пачатку зімы дрэвы застаюцца без ягад. Налятаюць чародкі амялушак, якія мігруюць з поўначы — і чырвань знікае.

Даўжэй трымаецца шыпшына. Яе плады птушак не цікавяць, і ягады вісяць, пакуль не зморшчацца і не пацямнеюць. Праўда, шыпшына не часта сустракаецца, хоць на маёй дачы яе хапае.

Хораша выглядаюць на снезе сухастоі. Напрыклад, гартэнзія ці варсянка — праўда, яны не яркія і прыгажосць іх не кідкая.

А найлепшым акцэнтам зімой у садзе ці пры хаце можа быць дэкаратыўная капуста «Токія». Ляжыць глыбокі снег, а гэтая расліна квітнее. «Токія» вытрымлівае маразы да -7 °С. Нават калі мароз вялікі, дэкаратыўная капуста працягвае радаваць вока і толькі з наступленнем адлігі жухне. Вырошчваецца «Токія», як звычайная капуста. Калі расада паднялася, яе высаджваюць на пастаяннае месца. І застаецца толькі паліваць у сухое лета.

А яшчэ дэкаратыўную капусту вельмі любяць вусені. Да гэтага года ў нас на дачы «Токія» не было. Таму мы вельмі здзівіліся, калі позняй восенню на капусце ўбачылі вусеняў — на лісцях шэрань, а яны жывуць. Гэтую расліну трэба рэгулярна апрацоўваць адпаведнымі прэпаратамі.



У дэкаратыўнай капусты каляровая разбежка даволі шырокая — ад бела-жоўтага да фіялетава-чырвонага колераў. Але купіўшы пакецік з насеннем, мы не маем гарантыі, што «Токія» не заквітнее адным колерам.

З гэтай раслінай вялікага клопату няма, а вось шыпшыну лепш за ўсё на ўчастку не мець. Хораша цвіце вясной, чырванее зімой, але пускае пасынкі, разрастаецца, і з ёю даводзіцца пастаянна змагацца. Але ж як прыгожа гучыць верш Уладзіміра Дубоўкі:

*О Беларусь, мая шыпшына,*
*Зялёны ліст, чырвоны цвет!*
*У ветры дзікім не загінеш,*
*Чарнобылем не зарасцеш...*

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**
**Фота аўтара.**

Ну і ну!

## Запаслівы паляшук

У доме жыхара в. Лунін (Лунінецкі раён), рабочага мясцовага сельгаспрадпрыемства, супрацоўнікі міліцыі знайшлі цэлы арсенал: рэвальвер сістэмы «Наган» 1895 г.в., 29 патронаў да яго, 439 малакаліберных патронаў, 296 патронаў калібру 7,62 мм, дзве бутэлькі па 1,5 літра і дзве бляшанкі пораху па 200 г, 16 дэтанатараў, 1,5 метра бікфордава шнура, 2954 капсулі, гранату Ф-1, 247 куль, затвор ад вінтоўкі.

Дарэчы, такі ж рэвальвер некалькі дзён таму міліцыя забрала і ў жыхара Баранавічаў. Заведзена крымінальная справа.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# БЕЛАРУСЬ ПРАПАНУЕ СТВАРЫЦЬ ІНСТЫТУТ ПАРТНЁРСТВА АДКБ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Беларусь прапануе прапрацаваць перспектывы міратворчай дзейнасці ў фармаце ААН-АДКБ.

У 2007 годзе было падпісана Пагадненне аб міратворчай дзейнасці АДКБ, якое ўжо ўступіла ў сілу. «Пара перайсці ад тэорыі да практыкі. У нашай арганізацыі павінен быць дзейсны міратворчы кампанент», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

На думку кіраўніка беларускай дзяржавы, сённяшняя рэальнасць патрабуе ўдзяліць асаблівую ўвагу супрацоўніцтву ў сферы процідзеяння сучасным выклікам і пагрозам. Пляцоўка для абмеркавання пытанняў у гэтай сферы была створана з утварэннем у фармаце АДКБ каардынацыйных саветаў па надзвычайных сітуацыях і па барацьбе з нелегальнай міграцыяй. Беларусь у перыяд свайго старшынства мае намер прадоўжыць развіваць гэты напрамак. «Прымаючы да ўвагі, што ствараемыя КСАР будуць мець у сваім складзе падраздзяленні і па надзвычайных сітуацыях, лічым патрэбным распрацаваць адзіны рэгламент іх выкарыстання ў выпадку ўзнікнення надзвычайных сітуацый на тэрыторыях дзяржаў — членаў АДКБ», — гаворыцца ў звароце.

У мэтах процідзеяння нелегальнай міграцыі, барацьбы з тэрарызмам і іншымі праяўленнямі проціпраўнай дзейнасці грамадзян трэціх краін Беларусь прапануе стварыць прававыя рамкі для фарміравання базы даных асоб, якія нясуць патэнцыяльную пагрозу. На думку кіраўніка беларускай дзяржавы, гэта мера будзе перашкаджаць пранікненню экстрэмістаў і іншых патэнцыяльных парушальнікаў правапарадку на тэрыторыі дзяржаў — членаў АДКБ.

Беларусь заўсёды выступала за цеснае развіццё адносін арганізацыі як з іншымі міжнароднымі структурамі, так і з асобнымі дзяржавамі, адзначаецца ў звароце. «Толькі разам мы зможам забяспечыць бяспеку па перыметры, як кажуць, на подступах да рубяжоў АДКБ, — лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы. — Перакананы, што нам ёсць што прапанаваць і чым зацікавіць не толькі прыгранічныя краіны, але і дзяржавы на іншых кантынентах. Перспектывы гэтых ініцыятыў — пашырэнне сферы ўплыву і павышэнне ролі арганізацыі на міжнароднай арэне і ў рэгіянальным плане».

На думку Прэзідэнта Беларусі, яшчэ шмат трэба будзе зрабіць для таго, каб быў запушчаны ў дзеянне інструментарый КСАР. У якасці чарговага захаду на шляху ўмацавання і развіцця гэтых сіл Беларусь прапануе распрацаваць і зацвердзіць мэтавую праграму аснашчэння сучасным і сумяшчальным узбраеннем, сродкамі спецыяльнага прызначэння і сувязі, іншым рыштункам. Такая праграма будзе садзейнічаць павышэнню ўзроўню боегатоўнасці і аператыўнай сумяшчальнасці нацыянальных кантынгентаў, лічыць кіраўнік дзяржавы.

У якасці ініцыятывы ў ваеннай галіне Беларусь таксама лічыць неабходным прыцягваць сілы і сродкі сістэмы калектыўнай бяспекі АДКБ для ўдзелу ў сумесных вучэннях, праводзімых у рэгіёнах калектыўнай бяспекі. На думку беларускага боку, фактар выкарыстання сіл і сродкаў сістэмы калектыўнай бяспекі прадэманструе міжнароднай супольнасці адзінства і магчымасці дзяржаў — членаў АДКБ рэагаваць на выклікі і пагрозы, а таксама гатоўнасць да сумесных дзеянняў па забеспячэнні калектыўнай бяспекі ў зоне адказнасці АДКБ. Такое ўзаемадзеянне станоўча зарэкамендавала сябе ў час беларуска-расійскага сумеснага аператыўна-стратэгічнага вучэння «Захад-2009», у якім прынялі ўдзел і падраздзяленні Арменіі, Казахстана, Таджыкістана. У 2011 годзе на тэрыторыі Расіі плануецца правядзенне сумеснага аператыўнага вучэння ўзброеных сіл Беларусі і Расіі. Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею, што будзе агульная зацікаўленасць усіх дзяржаў — членаў АДКБ прыняць удзел у гэтым мерапрыемстве сваімі нацыянальнымі кантынгентамі.

Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў, перадаючы Прэзідэнту Беларусі функцыі старшыні ў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, пажадаў поспехаў у справе ўмацавання АДКБ. Адкрываючы сустрэчу кіраўнікоў дзяржаў АДКБ у пашыраным складзе, якая праходзіла ў Крамлі, Дзмітрый Мядзведзеў павёдаміў, што Беларусь прыняла ўжо функцыі старшынства ў арганізацыі.

Ацэньваючы дзейнасць Расіі ў якасці старшыні АДКБ, Прэзідэнт РФ заявіў, што зроблены важныя крокі, накіраваныя на ўмацаванне бяспекі ў рэгіёне. Паводле яго слоў, асноўны акцэнт рабіўся на стварэнні механізма рэагавання на крызісныя сітуацыі.

Знакавай падзеяй Дзмітрый Мядзведзеў назваў стварэнне Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання (КСАР) колькасцю каля 20 тыс. чалавек. «Праведзены вучэнні паказалі, што КСАР мае нядрэнны патэнцыял», — адзначыў Прэзідэнт Расіі.

Беларусь у перыяд старшынства ў АДКБ прыкладала і будзе прыкладаць усе неабходныя намаганні для павышэння эфектыўнасці функцыянавання арганізацыі, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі падзякаваў расійскаму боку за канструктыўную работу ў час яго старшынства ў АДКБ. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь заўсёды выступала за неабходнасць павышэння ўзроўню і эфектыўнасці дзейнасці АДКБ на гэтым напрамку.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што на сустрэчы ў вузкім складзе быў абмеркаваны шэраг ініцыятыў і падыходаў беларускага старшынства, нацэленых на ўмацаванне арганізацыі. Паводле слоў Прэзідэнта, іх рэалізацыя дасць магчымасць зрабіць крок наперад па ўдасканаленні супрацоўніцтва ў палітычнай і ваеннай сферах, па праблематыцы новых выклікаў і пагроз.

Кардынальнай ломкі АДКБ не будзе, аднак арганізацыі давядзецца актывізаваць сваю работу па некаторых напрамках, заявіў журналістам Прэзідэнт Беларусі.

«Не трэба гаварыць, што гэта кардынальная ломка. Шчыра кажучы, нічога кардынальнага не адбылося, а вось паскорыць нам давялося», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што цяперашняя сесія Савета калектыўнай бяспекі АДКБ была вельмі насычанай: кіраўнікі дзяржаў разгледзелі 34 пытанні, па ўсіх падпісаны адпаведныя рашэнні. Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу на адно новаўвядзенне: старшынствоўчы бок зрабіў зварот да партнёраў, дзе акрэсліў тыя напрамкі, на якіх засяродзіць увагу ў перыяд старшынства. Гаворачы аб беларускіх ініцыятывах, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што прапановы ўнесліся і зыходзячы з рэальнай магчымасці іх рэалізацыі.

Прэзідэнт акцэнтаваў увагу таксама на тым, што некаторыя канфліктныя падзеі ў адной з краін — удзельніц АДКБ у гэтым годзе далі штуршок да ўдасканалення нарматыўна-прававой базы арганізацыі. Даючы тлумачэнне, чаму АДКБ аператыўна не адрэагавала на падзеі, якія адбываюцца ў Кыргызстане, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Не было ні сіл, ні сродкаў, ні паўнамоцтваў». Ён таксама звярнуў увагу на неабходнасць стварэння нарматыўна-прававой базы, і такія прапановы будуць унесены.

«Усе бакі АДКБ важныя, але, пагадзіцеся, што гэта ўсё ж такі ваенная арганізацыя, і ваенны складальнік павінен быць тут адпаведны для таго, каб мы сапраўды ў выпадку пагрозы, знешняй пагрозы нашым дзяржавам, змаглі забяспечыць бяспеку гэтай дзяржавы», — лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы. Ён таксама дадаў, што забеспячэнне бяспекі любой дзяржавы — гэта найважнейшае пытанне функцыянавання дзяржавы і дзейнасці ўлад гэтай дзяржавы.

Прэзідэнт Беларусі абвергнуў чуткі аб тым, што адносіны з яго расійскім калегам Дзмітрыем Мядзведзевым сапсаваліся. Аб гэтым кіраўнік беларускай дзяржавы заявіў журналістам пасля завяршэння саміту АДКБ у Маскве.

«Мы з Мядзведзевым і не сварыліся», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Я яшчэ ў Мінску гаварыў: дарэмна некаторыя паціраюць рукі за спінамі прэзідэнтаў Беларусі і Расіі, радуючыся. Як нечакана нашы адносіны сапсаваліся — так нечакана для многіх яны і нармалізуюцца. Мы стрымалі сваё слова», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. «Для вас гэта была нечаканасць, для нас — не», — дадаў ён.

Прэзідэнт таксама падкрэсліў, што вялася вельмі напружаная работа над тым, каб прыйсці да тых пагадненняў, якія былі падпісаны напярэдадні ў Маскве.

«Не перажывайце: нават калі мы пасварымся — мы знойдзем час памірыцца», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

Пры любых палітычных зменах Беларусь будзе прыхільніцай прынцыпаў супрацоўніцтва, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Якія б ні былі палітычныя змены, а яны абавязкова будуць, я ўпэўнены, што вы мелі на ўвазе палітычныя змены наогул, а не са зменай улады ў Беларусі (усялякае можа быць — гэта палітыка), нават калі будуць іншыя прэзідэнты на чале ўлады, паверце, Беларусь будзе прыхільніцай прынцыпаў супрацоўніцтва. Іншае проста не прымае беларускі народ», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы. Ён адзначыў, што ў Беларусі жыве вельмі талерантны народ, па сваёй ментальнасці вельмі стабільны, у краіне няма ніякіх канфліктаў ні на нацыянальнай, ні на рэлігійнай, ні на палітычнай глебе.

«Усё будзе нармальна: і з палітычным курсам, і з АДКБ, і з нашым удзелам у гэтай арганізацыі», — запэўніў беларускі лідар.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі ў перадвыбарны перыяд нікому не ствараецца ніякіх перашкод для работы або назірання за перадвыбарнай кампаніяй. «Мы ўжо сталі ў гэтыя прэзідэнцкія выбары такой дэмакратычнай дзяржавай, што я баюся, каб ад мяне ўжо іншыя кіраўнікі дзяржаў не шарахаліся як ад буйнога дэмакрата, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы ўжо настолькі раскрылі краіну: прыязджайце, хто хоча, нават каму і быў у свой час аб'ектыўна закрыты ўезд у краіну, што хочаце гаварыце, ідзіце глядзіце урны, бюлетэні — усё правярайце. Калі ласка. Толькі каб пасля не казалі, што мы дзесьці там сябе неяк скрытна паводзілі».

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

## ДВАЦЦАЦІГРАДУСНЫЯ МАРАЗЫ ЧАКАЮЦЦА НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ

Пасля непрацяглай адлігі зіма ўжо поўнасцю аднавіла свае пазіцыі, і ў выхадныя дні будзе марозна, паведаміла карэспандэнту **БЕЛТА** **галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга ФЯДОТАВА**.

У нядзелю цыклон прынясе снегапады і мяцеліцы ў заходнія рэгіёны краіны. Начная тэмпература паветра будзе вагацца ад 5 да 12 градусаў марозу, на ўсходзе краіны пры праясненнях — да 15-18 градусаў ніжэй за нуль. Днём чакаецца ад -1 градуса на паўднёвым захадзе да -11 градусаў на паўночным усходзе.

Захаваецца марознае надвор'е і на наступным тыдні. Час ад часу будзе ісці снег, павялічваючы вышыню гурбаў. Да сярэдзіны тыдня маразы памацнеюць. Дзённыя тэмпературы будуць вагацца ад 6 да 15 градусаў марозу, а ноччу пры праясненнях будуць апускацца да -20 градусаў.

## ЗАЯВА БЕЛАРУСКАГА САЮЗА ЖУРНАЛІСТАЎ ПА ВЫНІКАХ ТЭЛЕ- І РАДЫЁВЫСТУПЛЕННЯЎ І ДЭБАТАЎ КАНДЫДАТАЎ У ПРЭЗІДЭНТЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Перадвыбарная кампанія ў Рэспубліцы Беларусь праходзіць у атмасферы дэмакратычнасці і канкурэнтнай барацьбы. Усе кандыдаты атрымалі роўныя магчымасці прадставіць свае праграмы выбаршчыкам у вядучых друкаваных СМІ краіны, а таксама звярнуцца непасрэдна да грамадзян з тэлеэкранаў і ў радыёэфіры.**

У той жа час са шкадаваннем канстатуем, што пасля тэледэбатаў некаторыя СМІ, прыхільнікі асобных кандыдатаў разгарнулі сапраўднае цкаванне Андрэя Крывашэева і Юрыя Пракопава, супрацоўнікаў Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі, якія выступалі ў якасці вядучых тэледэбатаў.

Андрэй Крывашэеў і Юрый Пракопаў у час тэледэбатаў 4 снежня 2010 года сумленна выконвалі свае прафесійныя абавязкі. Таму Беларускі саюз журналістаў як грамадская арганізацыя, у чые задачы ўваходзіць абарона прафесійна-творчых, асабістых правоў, гонару і годнасці журналістаў, лічыць непрымальнай разгорнутую супраць нашых калег прапагандысцкую кампанію і расцэньвае яе як прамы палітычны націск на сродкі масавай інфармацыі.

Беларускі саюз журналістаў нагадвае ўсім удзельнікам выбарчага працэсу аб неабходнасці выконваць этычныя правілы і заклікае не прыўносіць у беларускае палітычнае і грамадскае жыццё бруд і сумніўныя тэхналогіі!

# Першы борт на Венесуэлу вылеціць у нядзелю

**«Звязда» ўжо паведамляла аб пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, на якім было абмеркавана даручэнне кіраўніка дзяржавы па аказанні гуманітарнай дапамогі Венесуэле, якая моцна пацярпела ад разгулу стыхіі.**

Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі адзначыў, што мэтай пасяджэння Прэзідыума з'яўляецца выпрацоўка канкрэтнага плана па аказанні максімальна магчымай дапамогі Венесуэле па хутчэйшым пераадоленні наступстваў, выкліканых шматдзённымі праліўнымі дажджамі паводак. Ён нагадаў, што ў выніку ўдару стыхіі загінулі дзясяткі людзей, прыкладна 70 тысяч чалавек страцілі дах над галавой, насельніцтва краіны мае вострую патрэбу ў экстраннай дапамозе. Прэм'ер-міністр звярнуў увагу на неабходнасць наладзіць сістэмную работу па пастаўках будаўнічай і будаўніча-дарожнай тэхнікі ў Венесуэлу.

З дакладам на пасяджэнні Прэзідыума Саўміна выступіў намеснік міністра замежных спраў Валерый Варанецкі. Ён адзначыў, што беларускія спецыялісты, якія працуюць у Венесуэле на розных будоўлях, па меры сваіх магчымасцяў ужо дапамагаюць аднаўляць разбураныя ці знішчаныя дамы, дарогі, аб'екты інфраструктуры, камунікацый і г. д. Супрацоўнікі пасольства Беларусі ў Венесуэле сабралі і перадалі пацярпелым дзіцячае адзенне, абутак, прадукты харчавання.

Завяршаецца ўкамплектаванне самым неабходным — палаткамі, коўдрамі, кансервамі, дзіцячым харчаваннем — экстраннага гуманітарнага грузу, які дастаўць у Венесуэлу самалёт беларускай авіяцыі. Таксама вылеціць туды і група прадстаўнікоў міністэрстваў і ведамстваў нашай краіны, якія на месцы вызначаць характар далейшай гуманітарнай дапамогі тэхнікай такіх вядучых айчынных вытворцаў, як МАЗ, МТЗ і іншых. Спецыфіка ў тым, што Венесуэле патрэбна тэхніка і механізмы, адаптаваныя да работы да няпростых умоў тропікаў, дзе вялікая вільгаць і высокая тэмпература паветра. Магчыма, пасля вяртання прадстаўнікоў міністэрстваў і ведамстваў будзе створана рабочая група на чале з адным з віцэ-прэм'ераў урада па каардынацыі аказання гуманітарнай дапамогі Венесуэле на яе другім этапе.

Намеснік прэм'ер-міністра Віктар Бура паведаміў журналістам, што першы борт на Венесуэлу вылеціць не пазней чым у нядзелю. Кошт гуманітарнага грузу складзе недзе звыш 200 тысяч долараў. А сам тэрмін аказання гуманітарнай дапамогі Венесуэле зойме каля 18 месяцаў, але гэта папярэдня лічба. Што датычыцца жылля, то пасля вяртання дадому з Венесуэлы групы прадстаўнікоў міністэрстваў і ведамстваў, будзе канчаткова вызначана, якія і з чаго камплектуючыя для ўзвядзення жылля пацярпелым венесуэльцам пачнуць выпускаць нашы будаўнічыя прадпрыемствы.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

# АДЧУЦЬ ТАЯМНІЦУ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Пачыналася ўсё ў 2004-м годзе, з першага праекта, які быў прысвечаны беларускім жанчынам. І аказалася, што нездарма беларускім прыгажуням прысвячаюць вершы, пра іх складаюць песні. Нездарма імі захапляюцца. Бо насамрэч гэтая вытанчаная прыгажосць належыць... Еўропе.

Некалькі праектаў Алена Адамчык і сапраўды прысвяціла жанчынам Еўропы. Тым, хто з Італіі, Іспаніі ці Манака. Манака, дарэчы, пашчасціла больш за ўсіх: жанчынам гэтай краіны Алена прысвяціла асобную кнігу, дзе ёсць партрэты асоб, якія знакамітыя ва ўсім свеце. Што казаць, калі ўступ да той кнігі напісала прынцэса Гановерская Караліна. І вось ужо на майстэрскі фотапогляд Алены Адамчык сталі прэтэндаваць мужчыны Манака, не менш знакамітыя...

Але яны пачакаюць. Бо пасля вялікіх фотасесій, пошукаў вобразу для кожнай сваёй мадэлі, пасля прыгод, калі часам мяжавалі з рызыкай, як у Афрыцы, дзе давялося сутыкнуцца з рабаўнікамі, Алена Адамчык зноў скіравала свой погляд на радзіму. І вырашыла даказаць:

— Для мяне натуральна: беларускі — гэта жанчыны Еўропы. У маёй пятай кнізе ёсць партрэты і нашых суграмадзянак, і еўрапеек. Але я не шукала адрозненняў беларусак ад еўрапеек у працэсе працы таму, што іх не трэба супрацьпастаўляць. Каб я гэтым займалася, то не здолела зрабіць гэты праект. Мы жывём у Еўропе, наша краіна прайшла еўрапейскі шлях.

Калі Алена робіць фотасесію, то самае складанае — гэта выбраць здымкі з вялікай колькасці. Каб прадставіць адну гераіню, трэба абраць усяго якіх 10 здымкаў, якія б яшчэ і спалучаліся з фота іншых гераінь. Працэс здымкаў для аўтара — гэта дыялог, падобны на джаз. Яна не шукае сваіх гераінь, яна здымае тых, хто сустракаецца ў жыцці. Адной з «мадэляў» пятай кнігі стала, напрыклад, Марына Лобач, алімпійская чэмпіёнка па мастацкай гімнастыцы ў Сеуле.

— Я зразумела, што жанчыны могуць быць не проста жанчынамі, а цікавымі жанчынамі, — адзначала Марына Лобач. — Бо жанчына як была таямніцай, так і застаецца. Алена дае жанчыне магчымасць адчуць гэту таямніцу ў сабе.

— Сама мастачка — шыкоўная жанчына, — дапаўняе княгіня Наталля Галіцына, прэзідэнт рускага клуба мастацтваў. — Яна робіць з жанчын Багінь. І на мой погляд, гэта праект дзяржаўны, бо праз вобразы жанчын яна паказвае Беларусь.

...Камера дапамагае ўбачыць у гераіні нейкія незвычайныя рысы, паглядзець на яе інакш. І ў гэтым ёсць таксама таямніца, якую аўтарка прыадкрывае: яна па адукацыі біёлаг, для яе натуральна разглядаць свет праз мікраскоп, праз лупу. Таму для яе вельмі натуральна разглядаць жыццё праз аб'ектыў. Гэта робіць яе даследчыкам жыцця. І дае магчымасць стаць такімі даследчыкамі іншых.

Як паказвае бібліятэчная практыка, фотаальбомы — гэта кнігі даволі запатрабаваныя, бо яны зразумелыя ўсім. Гэта засведчыў Раман Матульскі, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, дзе цяпер будзе калекцыя прыгожых кніг.




— У нашай сям'і заўсёды шанавалі кнігу, — тлумачыць увасабленне фотапраекта менавіта ў такім варыянце аўтар Алена Адамчык. — Магчыма таму і і сваго будучага мужа пакахала, што яго дзяцінства прайшло ў бібліятэцы, дзе працавала яговая маці, жонка пісьменніка Вячаслава Адамчыка...

Напэўна і муж задаволены, што жонка сваімі фотакнігамі скарае свет: падтрымаць Алену падчас прэзентацыі прыйшоў Адам Глобус з унукам. І дачка Ядвіга. Вось і яна — з тых, хто натхнёне маці на фотасправу: сучасная беларуска. І еўрапейка...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ПЯЦЬ КАНДЫДАТАЎ У ПРЭЗІДЭНТЫ АТРЫМАЛІ ПАПЯРЭДЖАННІ АД ГЕНПРАКУРАТУРЫ

Генеральная пракуратура вынесла пяці кандыдатам у прэзідэнты Беларусі — Уладзіміру Някляеву, Віталю Рымашэўскаму, Мікалаю Статкевічу, Яраславу Раманчуку і Андрэю Саннікаву — афіцыйныя папярэджанні аб недапушчальнасці парушэння заканадаўства. Нагода для гэтага — заклікі названых кандыдатаў да правядзення несанкцыянаванай акцыі на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску ў дзень выбараў.

**Начальнік упраўлення па наглядзе за выкананнем заканадаўства і законнасці прававых актаў Генеральнай пракуратуры Павел РАДЗІВОНАЎ** адзначыў, што чатыром кандыдатам — У. Някляеву, В. Рымашэўскаму, М. Статкевічу і Я. Раманчуку — афіцыйнае папярэджанне зачыталі па тэлефоне, бо яны знаходзіліся з паездкамі па рэгіёнах. Яны заявілі, што сутнасць папярэджання пракуратуры ім зразумелая. Пасля гэтага тэксты афіцыйнага папярэджання ім накіравалі па пошце. З кандыдатам у прэзідэнты А. Саннікавым па тэлефоне звязацца не атрымалася.

— Яго давераныя асобы спасылаліся на занятасць кандыдата ў прэзідэнты і абяцалі, што ёнператэлефануе ў Генпракуратуру, — распавядае Павел Радзівонаў. — Званка я так і не дачакаўся, таму паехаў у адну з мінскіх гімназій, дзе Андрэй Саннікаў праводзіў сустрэчу з выбаршчыкамі.

А. Саннікаў па незразумелых прычынах адмовіўся паставіць свой подпіс пад афіцыйным папярэджаннем.

— Хачу адзначыць, што называць афіцыйны дакумент Генпракуратуры паперкай — не адпавядае высокаму статусу кандыдата ў прэзідэнты Беларусі, — дадаў прадстаўнік Генпракуратуры.

Афіцыйнае папярэджанне А. Саннікаву, як і астатнім чатыром кандыдатам у прэзідэнты, адпраўлена па пошце.

Паводле слоў прадстаўніка Генпракуратуры, самога факта парушэння пакуль няма. Ёсць заклікі да яго. Для правядзення масавага мерапрыемства на Кастрычніцкай плошчы, згодна з беларускім заканадаўствам, грамадзяне павінны падаць заяўку ў гарвыканкам. Але пакуль што ніводзін з пяці кандыдатаў, якія атрымалі папярэджанні, гэтага не зрабіў.

— Дадзенае афіцыйнае папярэджанне Генпракуратуры тычыцца не выбарчага заканадаўства, а заканадаўства аб правядзенні масавых мерапрыемстваў, — удакладніў Павел Радзівонаў. — А паколькі 19 снежня ўжо няма перадвыбарчай агітацыі, то папярэджанне гэтае вынесена не кандыдатам у прэзідэнты, а фізічным асобам.

Пры гэтым П. Радзівонаў падкрэсліў, што афіцыйнае папярэджанне вынесена выключна ў мэтах бяспекі грамадзян, падтрымання парадку і выканання закона, за парушэнне якога прадугледжана адказнасць.

— Мы жывём у прававой дзяржаве, таму кандыдаты ў прэзідэнты Беларусі павінны дзейнічаць у межах закона, — адзначыў Павел Радзівонаў. — Усім пяці кандыдатам патлумачылі, што за парушэнне заканадаўства аб правядзенні масавых мерапрыемстваў існуе адміністрацыйная ці крымінальная адказнасць (у залежнасці ад наступстваў несанкцыянаванага масавага мерапрыемства. — **Н. Д.**). І мы будзем кантраляваць выкананне вынесеных афіцыйных папярэджанняў. Але не трэба думаць, што мы некага пужаем. Ніхто нікога не пужае. Гэта наш абавязак папярэдзіць, як рабіць нельга. Праўда, складваецца такое ўражанне, што кандыдаты ў прэзідэнты, якім вынесены папярэджанні і якія, на жаль, усё роўна працягваюць заклікаць людзей прыходзіць на плошчу, знарок ідуць на абвастрэнне сітуацыі. Грамадзянам жа мы настойліва рэкамендуем не паддавацца на відавочныя правакацыйныя заклікі і не падвяргаць небяспецы сябе і іншых, парушаючы заканадаўства аб масавых мерапрыемствах.

Паводле слоў Паўла Радзівонава, з пачатку выбарчай кампаніі ў органы пракуратуры паступіла каля 80 скаргаў, звязаных з выкананнем заканадаўства аб выбарах.

— На першачарговым этапе скаргі былі звязаныя з парадкам фарміравання выбарчых камісій, — удакладніў начальнік упраўлення па наглядзе за выкананнем заканадаўства і законнасці прававых актаў. — Частка скаргаў тычылася парадку збору подпісаў (у асноўным звязаныя з абмежаваннем збору подпісаў на прадпрыемствах і ў інтэрнатах). Але ніводная з гэтых скаргаў не прызнана абгрунтаванай.

Суразмоўца ўдакладніў, што «скаргі паступалі ад членаў ініцыятыўных груп альтэрнатыўных, як яны самі сябе і пазіцыянуюць, кандыдатаў у прэзідэнты, у тым ліку і ад тых, каму былі вынесены афіцыйныя папярэджанні Генпракуратуры».

**Надзея ДРЫЛА.**

## У БЕЛАРУСІ ВАДЗІЦЕЛЯМ СКУТАРАЎ ДАЗВОЛЯЦЬ ПЕРАВОЗІЦЬ ПАСАЖЫРАЎ

**Аб гэтым паведаміў журналістам старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ МУС Беларусі Аляксандр Занімон, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Згодна з новай рэдакцыяй ПДР, якая ўступае ў сілу 4 студзеня 2011 года, на мапедах (скутарах) можна будзе перавозіць пасажыраў, калі ёсць дадатковае сядзенне, устаноўленае вытворцам. Раней і на такіх скутарах забаранялася ездзіць удваіх, нават калі была тэхнічная магчымасць.

Аднак Аляксандр Занімон нагадаў, што, як і на матацыкле, на заднім сядзенні скутара нельга будзе перавозіць дзяцей ва ўзросце да 12 гадоў. Ён таксама заявіў, што ў 2011 годзе для мапедаў будзе ўведзена спецыяльная вадзіцельская катэгорыя AM. Акрамя таго, абноўленыя ПДР вырашаць праблему з рэгістрацыяй такога транспартнага сродку, як квадрыцыкл (мотакаляска). Інспектар ДАІ растлумачыў, што гэтым тэрмінам называецца не проста чатырохколавы матацыкл або матавсюдыход, а транспартны сродак з прыводам кіравання аўтамабільнага тыпу, гэта значыць з «абаранкам». Новыя правілы дадуць магчымасць рэгістраваць такі транспарт, калі ён важыць не больш як 500 кг у падрыхтаваным стане, па катэгорыі В.

Таксама новая рэдакцыя правіл прыведзена ў адпаведнасць з новымі патрабаваннямі страхавання, якія датычацца магчымасці раз'езду пры ДТЗ, урон ад якога не перавышае 200 еўра. У гэтым выпадку павінны быць выкананы і некаторыя іншыя патрабаванні, якія ўступілі ў сілу ў гэтым годзе.

Мадыфікаваныя правілы дарожнага руху даюць цяпер адназначную трактоўку тэрміна «пакіданне месца ДТЗ». Таксама дакумент пашырае патрабаванні да ўдзельнікаў дарожнага руху, якія не з'яўляюцца вадзіцелямі. Напрыклад, раней не зусім было зразумела, якія дзеянні павінен ажыццяўляць пасажыр, які стаў удзельнікам ДТЗ. Цяпер удакладняецца, што ён павінен аказаць першую медыцынскую дапамогу.

# «ТРАПІЎ ДЗЕТКА Ў КЛЕТКУ...»

**У Лондане на 14 снежня назначана першае слуханне ў судзе справы днямі затрыманага заснавальніка скандальна вядомага сайта «Вікілікс» (Wikileaks) Джуліяна Асанджа. Тым, хто яшчэ не ведае, нагадаем: героем шматлікіх публікацый і перадач у СМІ ён стаў пасля абнародавання яго сайтам «Вікілікс» сотняў тысяч дакументаў службовай перапіскі дыпламатаў і вайскоўцаў ЗША. Арышт Джуліяна Асанджа Скотланд-Ярдам і адмова выпусціць пад грашовы залог толькі падагрэла глабальную цікаўнасць да гэтай, бадай, галоўнай сусветнай дыпламатычна-медыйнай сенсацыі 2010 года.**

У гэтай дзіўнай гісторыі самае цікавае не ў тым, што на ўсеагульны агляд выстаўлена столькі шмат сакрэтных папер, што дух займае. А тое, што некаму ўдалося іх выкрасці і выкласці ў глабальную сетку. І здарылася гэта не абы-дзе, у нейкай «бананавай» краіне, а ў самай магутнай дзяржаве свету, якая пасля гісторый з савецкімі і іншымі шпіёнамі, здавалася, навучылася ахоўваць свае тайны. Невыпадкова ў ЗША, ды і ў свеце, дружна загаварылі аб правале Дзярждэпартамента, Пентагона, шматлікіх амерыканскіх спецслужбаў, якія не здолелі папярэдзіць «зліў» велізарных аб'ёмаў сакрэтнай інфармацыі. А што казаць пра іншыя краіны, спецслужбы якіх не маюць такіх велізарных бюджэтаў у дзясяткі мільярдаў долараў.

Нездарма кажуць, што той, хто валодае інфармацыяй, валодае светам. Сказана, можа, занадта моцна, але сэнс у гэтым ёсць — раскрыццё сакрэтнай інфармацыі дастаткова, калі не пасварыць саюзнікаў і партнёраў, то ва ўсякім разе пасеяць недавер і падазронасць у іх адносінах. Бо кожны з лідараў краін-сяброў ЗША, пра якіх у з'едліва-іранічна-абразлівай манеры зусім не па-сяброўску ўзгадваецца ў «сакрэтных матэрыялах», цяпер, відаць, міжволі часам думае: а што яшчэ непрыемнага можа з'явіцца ў інтэрнэце?

Версій аб прычынах такой беспрэцэдэнтнай уцечкі сакрэтнай інфармацыі выказваецца шмат. Так, прыхільнікі «тэорыі змовы» бачаць у гэтым далёка ідучыя палітычныя планы па дыскрэдытацыі прэзідэнта Барака Абамы супернікамі і ворагамі ўнутры ЗША, вострыя і нечаканыя выпад увогуле супраць дэмакратычнай партыі, якая яго вылучыла. Бо ёсць падстава спадзявацца, што такім чынам пасля паражэння дэмакратаў на выбарах у Кангрэс удасца да мінімуму звесці надзеі Абамы аб пераабранні на другі тэрмін.

Выказваецца версія «міжнароднай змовы» ворагаў Абамы. Яе прыхільнікі звяртаюць увагу на тое, што публікацыі сакрэтных дакументаў у СМІ былі загадзя спланаваныя: за два тыдні да размяшчэння на сайце матэрыялы былі надрукаваныя ў трох выданнях з сусветнай вядомасцю — амерыканскай газеце «Нью-Ёрк Таймс», брытанскай «Гардзіян» і нямецкім часопісу «Шпігель».

Ёсць яшчэ больш «смелая» і неверагодная версія: у дыскрэдытацыі прэзідэнта ЗША зацікаўлены і кіраўнікі некаторых дзяржаў, якія вельмі незадаволеныя цяперашняй знешняй палітыкай Белага дома. Напрыклад, Ізраіль, якому моцна не падабаецца пазіцыя амерыканцаў на перамовах па палестынскай праблематыцы. Ёсць аналітыкі, якія ў выбухове поспеху і фантастычных магчымасцях «Вікілікс» атрымоўваць так шмат эксклюзіўнай сакрэтнай інфармацыі бачаць праяву сацыяльнага пратэсту радавых «байцоў нябачнага фронту». Маўляў, яны не задаволеныя дзеяннямі цяперашняй дзяржаўнай амерыканскай машыны. Нашталт тых, хто некалі па гуманістычных матывах перадаў савецкай разведцы дакументы па атамнай бомбе.

Але якімі ні былі б сапраўдныя прычыны, дыскрэдытацыя ЗША і іх уладаў ужо адбылася. Пад ударам апынуліся многія планы амерыканскай адміністрацыі ў Афганістане, Іраку, Еўропе. Амерыканцы кажуць, што ў многім з-за «Вікілікс» яны прайгралі Расіі спаборніцтва за права прымаць чэмпіянат свету па футболе 2018 года. Характэрна, што амерыканскія ўлады не аспрэчваюць сапраўднасці сакрэтных дакументаў — як гаворыцца, няма чым крыць. Затое сваім мала не здасца. Адміністрацыя ЗША правадзіць расследаванне, гавораць аб значных кадравых зменах у многіх пасольствах. У дзяржэдэпартаменце публічна абураюцца безадказнасцю «Вікілікс», упарта шукаюць вінаватых. Як паведамляюць СМІ, чакаецца адзыў дыпламатаў, прозвішчы і пасады якіх узгадваліся ў публікацыях на сайце. Прамільгнулі паведамленні, што асноўнай крыніцай гэтай «уцечкі» лічыцца 22-гадовы аналітык вайсковай разведкі ЗША Брэдлі Мэнінг.

Тым часам у Расіі многія аналітыкі ўспрынялі публікацыі «Вікілікс» як пачатак шматхадовай інфармацыйнай вайны па дыскрэдытацыі цяперашняга кіраўніцтва Крамля. Невыпадкова расійскія прэзідэнт і прэм'ер-міністр назвалі абразлівыя характарыстыкі ў іх бок на гэтым скандальным сайце як спробу ўбіць клін паміж імі, пасварыць іх. А тое, што спачатку пацярпела больш за ўсіх Амерыка, — гэты хітры манеўр, каб адцягнуць увагу сусветнай грамадскасці ад сапраўдных мэт аперацыі пад назвай «Вікілікс». Так ці не — пакажа час. У гэтай гісторыі нацяроджвае тое, што гаспадары «Вікілікс» абяцалі «зліць» шмат кампрамату па Расіі і Кітаю.

Якія агульныя высновы можна зрабіць з гучнай гісторыі з «Вікілікс»? Па першае, чалавечы фактар — асноўная праблема надзейнага захавання сакрэтаў. Пытанне на тэму як не памыліцца ў людзях, дапушчаных да тайнай перапіскі, зноў у які раз паўстае на парадку дня. І яшчэ — дарэмна эпісталярны жанр пад націскам тэлевізійных тэхналогій і інтэрнэту спісалі ў адстаўку. Пісьмы, калі іх чытаюць чужыя, нярэдка тояць у сабе выбуховы змест.

Па-другое, сарваны маскі. Дыпламаты, у нашым выпадку амерыканскія, на самай справе зусім не такія, якімі мы іх уяўлялі дагэтуль. Аказалася, што сфармаваны многімі дзесяцігоддзямі станоўчы імідж дыпламатаў як людзей выхаваных, культурных і ветлівых, вельмі абачлівых у выразах, людзей, якія адказваюць за кожнае слова, істотна адрозніваецца ад таго непрывабнага рэальнага твару, які прымусова раскрыўся дзякуючы інтэрнэт-публікацыям «Вікілікс». Мы ўбачылі даволі хамаватую, самаўпэўненую і жлабаватую фізіяномію. Аўтары запісак не паважаюць ні кіраўнікоў краін, ні іх народы. Ды і самі Злучаныя Штаты паўсталі ў класічным імперскім фармаце: няма сяброў, ёсць толькі інтарэсы і памагатыя ў іх адстойванні. А таму якая знешняя палітыка — такая і дыпламатыя.

З арыштам Джуліяна Асанджа эпапея з «Вікілікс» уступіла ў новую фазу. Інтарэсы абвінавачанага ў згвалтаваннях аж дзвюх даверлівых і наіўных шведак выказалі жаданне абараняць вядомыя лонданскія адвакаты. Яны ўжо знайшлі недапрацоўкі ў дзеяннях пракуратуры Стакгольма. Трэба думаць, што ў «Вікілікс» на свабодзе засталіся прыхільнікі і аднадумцы, і неўзабаве тоны новай службовай перапіскі прыадкрыюць чарговыя тайны амерыканскай дыпламатыі. Таму пасля арышту Джуліяна Асанджа можна з упэўненасцю казаць, што ўсё толькі яшчэ пачынаецца.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

# ПОГЛЯД ЗБОКУ

**НЕ БУДЗЕМ ВЫСВЯТЛЯЦЬ, па якіх прычынах і з якімі мэтамі апазіцыйныя кандыдаты ўчынілі на прасторах інтэрнэту і на старонках асобных выданняў сапраўдную «разборку» (перакананы — разумныя людзі самі разбяруцца), аднак зрабіць выгляд, што нічога не адбываецца, было б не правільна. Тым больш, што на такія нечаканыя паводзіны кандыдатаў пачынаюць рэагаваць нават сацыёлагі, аналітыкі і палітыкі, якіх традыцыйна прылічвалі да «таго» боку барыкад... Адзінае, што дазволім сабе заўважыць, — падзел інфармацыйных рэсурсаў па прыкмеце сімпатыі да таго ці іншага кандыдата. І з апанентамі там не цырымоняцца...**

Так, аднаму з кандыдатаў у віну ставіцца нават месца нараджэння — са Шклоўшчыны... Падазрэнні, відаць узніклі з-за куды больш вядомага земляка. Параўноўваць маштабы палітыкаў, вядома, не варта. Аднак сам факт...

Далей таго ж кандыдата без усялякай паліткарэктнасці абзываюць «Грышкам» і (парадокс!) у той жа час абвінавачваюць у непавазе да іншых кандыдатаў, праяўленай падчас «знакамітых» дэбатаў...

Адзін з рэсурсаў прама задае пытанне іншаму кандыдату: чаму вы абстрагуецеся ад кандыдатаў-лідараў і не спрабуеце стварыць кааліцыю? Усе выдатна разумеюць, што ім не перамагчы...

У адказ — мы спрабавалі, прапаноўвалі... «Асобныя кандыдаты палічылі сябе лідарамі, адасобіліся ад іншых і спрабуюць гуляць у сваю гульню. Гэта іх права, але гэта шлях у нікуды»...

І такіх прыкладаў узаемных абвінавачванняў можна прывесці масу.

**Незалежны сацыёлаг прафесар Алег МАНАЕЎ** у інтэрв'ю **«Беларускаму партызану»** станоўча ацаніў сам факт тэледэбатаў, але адзначыў, што нічога новага ў іх выніку не даведаўся. Ні пра саміх кандыдатаў, ні пра іх праграмы і дзеянні. Разам з тым, дэбаты выявілі ў грамадстве глыбокі раскол. І выснова тут несуцяшальная: калі нават зменіцца ўлада, сітуацыя з расколам у грамадстве не зменіцца. Таму на пытанне пра Плошчу, на якую заклікаюць у парушэнне заканадаўства асобныя кандыдаты, сацыёлаг адказаў няпэўна. Маўляў, будзе, але зусім не такой, як у 2006-м. «Як мне здаецца, будзе менш людзей, будзе менш напалу»...

Куды больш эмацыйным (адпаведна некаторым кандыдатам) выглядае выступленне **аналітыка незалежнага Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Дзяніса МЕЛЬЯНЦОВА**, якому прадаставіла сваю газетную плошчу **«Наша ніва»**.

*«Скажу шчыра: мяне ванітавала ад выступаў кандыдатаў у прэзідэнты. Практычна ад усіх, — піша аўтар. — Ад вымучанасці, непадрыхтаванасці і наіўнасці іх прамоў, ад няўмення публічна выступаць, ад элементарнай непавагі да гледачоў праз чытанне з паперак і паўгадзінных «ізліянняў» плыняў свядомасці на галовы няшчаснага электарату».*

Не пакінуў аўтар без увагі і «страсці» вакол кампаніі, якія кіпяць на апазіцыйных сайтах: *«Адзіная катэгорыя выбаршчыкаў, якая выклікае ў мяне поўнае неразуменне, — гэта нашыя шматлікія інтэрнэт-змагары і іх клінічная форма — каментары «Хартыі'97». Яны, падобна, суткамі, не перарываючыся, з сур'ёзным выглядам сядзяць і шматслоўна разважаюць пра тое, як зацісната крызісам беларуская эканоміка нарэшце ляснецца, працоўныя выйдуць дружнымі шэрагамі на плошчу, і тады яны — інтэрнэт-змагары — узначаляць гэтую сілу... Вы гэта сур'ёзна, хлопцы і дзеўкі? Пра якую рэвалюцыю і кіраванне ёю можна казаць, калі лідары апазіцыі не маюць ні разгалінаваных арганізацыйных структур, ні фінансавых рэсурсаў, ні ідэй, з якімі можна ісці да людзей?*

*Пра якое кіраванне краінай можа ісці гаворка, калі кандыдаты ў прэзідэнты не здольны не тое што прапанаваць ясную, зразумелую простаму чалавеку і запамінальную праграму дзеянняў, але і распавесці ў жывым эфіры пра сваю праграму без шпаргалак, кашы ў роце і трымцення ў голасе?..*

*У мяне даўно ўзнікла пачуццё, што мы жывём у розных краінах. Мы жывём у Беларусі — з усімі наступствамі. Яны жывуць у нейкай іншай краіне, дзе па вуліцах ходзяць акупанты, штодзень забіваюць і гвалцяць іншадумцаў і апазіцыянераў, людзей мораць голадам і прымушаюць класціся пад натаўскія танкі, а 100 % насельніцтва на кухнях будуюць планы па пабудове палатачнага гарадка на Кастрычніцкай плошчы... О, у якой жа жудаснай краіне яны жывуць!..*

*Змагары не турбуюцца, бо ўсю працу за іх зробіць сусветны крызіс, хцівыя маскалі з іх дарагім газам і нафтай ці ўрэшце тыя ж натаўскія танкі. У іх няма патрэбы выходзіць на вуліцу і сутыкацца з рэальным жыццём — усю інфармацыю пра жыццё і патрэбы людзей яны даведваюцца з сайта «Хартыі» і з ЖЖ. Але калі б змагар хоць часам выходзіў за межы ўтульнага офіса ў нармальнае жыццё, то ведаў бы, што людзі не цікавяцца тым, ...што скажа кандыдат Ікс на плошчы Каліноўскага, пасля таго як атрымае свае 5 % галасоў 19 снежня...*

*Уяўляю сабе, як усе яны будуць з разумным выглядам абмяркоўваць, якую маральную перамогу яны атрымалі 19 снежня, колькі ачкоў яны зарабілі, патусаваўшыся на Плошчы і пагразіўшы кулаком Адміністрацыі Прэзідэнта, і колькі ж цяпер бабла адваляць на падтрымку офіса да наступных выбараў. І зноў усё гэта будзе так далёка ад жыцця і так далёка ад ісціны...»*

# НАРАДЖАЙ, НЕ БОЙСЯ!



**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

***— Якім чынам як мага раней даведацца аб цяжарнасці?***

— Гэта мае асаблівае значэнне, калі жанчына не збіраецца пакідаць цяжарнасць. У адваротным выпадку ў першую чаргу трэба ведаць, што затрымка месячных на 1-2 дні можа быць звязана і са стрэсавай сітуацыяй, ужываннем лекавых прэпаратаў, абвастрэннем нейкага захворвання і г.д. Калі мы гаворым пра здаровую жанчыну, якая вядзе рэгулярнае палавое жыццё, варта дапусціць магчымасць надыходу цяжарнасці. І першым крокам для пацвярджэння гэтай думкі можа стаць правядзенне тэста на цяжарнасць з выкарыстаннем ранішняй порцыі мачы. Існуе некалькі варыянтаў тэст-сістэм, аднак усе яны з'яўляюцца якаснай рэакцыяй на наяўнасць гармону — харыянічнага ганадатрапіну, які прысутнічае ў арганізме толькі падчас цяжарнасці. Бываюць, праўда, сітуацыі, калі тэст аказваецца станоўчым з-за захворвання.

***— Колькі ж разоў трэба тэставацца?***

— Заўсёды можна меркаваць, што жанчына «штосьці не тое з'ела» ці яна мае пэўныя эндакрынныя, імунныя хваробы, з-за чаго тэст даў падманную станоўчую рэакцыю. Калі два з трох тэстаў — станоўчыя, ёсць нагода думаць пра цяжарнасць і планаваць візіт да акушэр-гінеколага. Станоўчы тэст на цяжарнасць сведчыць аб наяўнасці цяжарнасці, але не гаворыць аб тым, дзе змяшчаецца плоднае яйка — у матцы ці матачнай трубе.

Варта мець на ўвазе: на самых ранніх тэрмінах — да трох тыдняў — вызначэнне з наяўнасцю цяжарнасці бывае складаным і для ўрача. Існуюць тры класічныя групы прыкметаў цяжарнасці: верагодныя, няпэўныя і дакладныя. Да апошніх адносіцца адчуванне жанчынай варушэння плода, пальпацыя буйных частак плода праз пярэднюю брушную сценку і назіранне шкілета плода на рэнтгенаўскім здымку. Затрымка месячных — гэта, напрыклад, няпэўная прыкмета, а змена смаку, млоснасць, станоўчы тэст, цыяноз слізістай, павелічэнне маткі — верагодныя прыкметы.

***— Ці варта даведвацца пра цяжарнасць з дапамогай ультрагукавога даследавання?***

— Па-першае, з дапамогай ультрагуку нельга ўбачыць плоднае яйка раней за 3-тыднёвы тэрмін цяжарнасці. Як правіла, знайсці ў плодным яйку эмбрыён можна, калі тэрмін цяжарнасці перавышае 5-6 тыдняў. Па-другое, для падобнага кшталту даследавання патрэбны апарат высокага класа, а такія ёсць толькі ў перынатальных цэнтрах сталічных раддамоў бальніц №1 і 2, РНПЦ «Маці і дзіця», перынатальных цэнтрах абласных раддамоў і некаторых міжраённых перынатальных цэнтрах. Па-трэцяе, ультрагук — дадатковы метад абследавання, а галоўным было і ёсць назіранне зменаў у поласці маткі ўрачом.

У апошні час друкуецца шэраг даследаванняў аб небяспечнасці для плода ўльтрагукавых даследаванняў на пачатковых стадыях цяжарнасці. Нездарма для правядзення падобных даследаванняў існуюць пэўныя паказанні. Першае даследаванне выконваецца каля 12 тыдняў. Яно патрэбнае для пераканання ў тым, што з плодам усё нармальна, няма пагрозы выкідышу, удакладняецца тэрмін цяжарнасці. Калі выяўляюцца нейкія небяспечныя станы, ёсць магчымасць гэтую цяжарнасць перарваць. Падчас другога даследавання, якое выконваецца ў сярэдзіне цяжарнасці, мы вызначаем стан плацэнты, памеры плода, яго размяшчэнне і кровазабеспячэнне. Трэці ўльтрагук робіцца пасля 30 тыдняў, бліжэй да тэрміну родаў. Устанаўліваецца, як у цэлым развіваецца плод, намячаецца план вядзення родаў — ці будзе прымяняцца кесарава сячэнне.

Няма неабходнасці праводзіць ультрагукавое даследаванне часцей за тры разы за цяжарнасць, калі апошняя працякае нармальна. Працэс вывучэння ўплыву такога даследавання, безумоўна, працягваецца, і нельга выключаць, што праз 20-30 гадоў мы даведаемся пра штосьці новае ў гэтым кірунку. Некалі ж і флюараграфія лічылася цалкам бяспечным метадам, а сёння на гэта даследаванне цяжарных, як вядома, не накіроўваюць.

***— Што можна сказаць пра колькасць адхіленняў, якія выяўляюцца ў пладоў?***

— Пяцьдзясят гадоў таму шмат што яшчэ не было вядома, а значыць, не выяўлялася. З другога боку, стан здароўя жанчын аб'ектыўна пагоршыўся. Калі ў сярэдзіне мінулага стагоддзя 30 працэнтаў жанчын мелі экстрагенітальную паталогію, то на сёння толькі 30 працэнтаў такой паталогіі не маюць. З узростам колькасць экстрагенітальных паталогій у любой жанчыны толькі расце. Людзей, якія сапраўды сочаць за сваім здароўем, можна пералічыць па пальцах. Да таго ж, жанчыны цяпер нараджаюць не тады, калі гэта аптымальна з пункту гледжання прыроды — у 20-25 гадоў, а пасля 30-і, калі парушэнняў у здароўі аб'ектыўна больш. А здаровае дзіця можа нарадзіць толькі здаровая жанчына. На сёння 15-20 працэнтаў родаў у сэнсе стану і плода, і жанчыны адносяцца да ліку здаровых.

***— Што павінна і не павінна рабіць жанчына з таго моманту, як устаноўлена цяжарнасць?***

— Задоўга да таго, як гэтая цяжарнасць наступіла, трэба весці здаровы лад жыцця. Паколькі ў сучасных умовах мы гаворым пра неабходнасць планавання папаўнення ў сям'і, значыць, яшчэ да зачацця трэба ў першую чаргу абследавацца самой і абследаваць мужа на інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам. Калі ж апошнія будуць выяўлены падчас цяжарнасці, гэта будзе не на карысць плоду, бо ў першым трыместры цяжарнасці закладваюцца ўсе органы і сістэмы, і любое шкоднае знешняе ўздзеянне, у тым ліку і медыкаментознае, можа прывесці да пэўных адхіленняў. Сярод іншых мер трэба адмовіцца ад моцных кавы і чаю, спіртнога і курэння. Неабходна спаць не менш за 8 гадзін у суткі, пазбягаць стрэсавых сітуацый або вучыцца рэагаваць на іх, не працаваць на шкоднай вытворчасці. Варта замяніць бясконцую колькасць хімічных рэагентаў, якія мы выкарыстоўваем для хатняй прыборкі, на гаспадарчае мыла. Бялізна павінна быць толькі натуральнай. Ежа — разнастайнай. Ні ў якім разе нельга сядзець у гэты час на дыеце, бо плод усё роўна возьме з арганізма маці і фосфар, і кальцый, і ўсё іншае, што яму неабходна для будаўніцтва арганізма. Калі ж у маці будзе недастаткова вітамінаў і мікраэлементаў, яна заплаціць за гэта, напрыклад, выпадзеннем зубоў. Вітамінна-мінеральныя комплексы варта ўжываць згодна з рэкамендацыямі ўрача. Цяжарнай жанчыне наогул трэба раіцца з урачом наконт кожнай таблеткі і нават вітамінкі, якую яна збіраецца прыняць. Шэраг лекаў, як вядома, нельга прымаць на ранніх тэрмінах цяжарнасці. Не варта захапляцца экзатычнай садавінай. Прадукты, якія выклікаюць алергію, і найперш цытрусавыя, здольныя прывесці да таго, што ў дзіцяці з'явіцца алергія. Заўсёды трэба мець на ўвазе рызыку негатыўнага ўплыву тых ці іншых момантаў на развіццё плода.

***— Якія лекавыя прэпараты можна прымаць падчас цяжарнасці ў выпадку неабходнасці?***

— Магутная гарманальная перабудова, якая адбываецца ў арганізме жанчыны, мяняе яе паводзіны, і таму ў невялікіх дозах можна прымаць настой валяр'яну ці сардэчніку. І на гэтым, бадай, можна паставіць кропку. Што да лячэння грыпу, вострых рэспіраторных вірусных інфекцый, то пажадана, каб на раннім тэрміне цяжарнасці іх не было, паколькі лячэнне апошніх можа прывесці да паломак у развіцці плода. Калі ж прастуда напаткала, пажадана выкарыстоўваць народныя сродкі — мёд, чай, маліну — і не выкарыстоўваць прэпараты кшталту тэрафлю. Цяжарным неабходна рэкамендаваць адпаведныя прэпараты расліннага паходжання.

***— Што на працягу дзевяці месяцаў павінен рабіць мужчына?***

— Напэўна, выконваць як мага больш работы па доме і... трываць абумоўленыя гарманальнай перабудовай змены ў паводзінах жанчыны. Некаторыя жанчыны пакутуюць, напрыклад, ад перадменструальнага сіндрому. Колькасць жа гармонаў у час цяжарнасці нашмат вышэйшая, чым напярэдадні менструацыі. Таму жанчына павінна часцей гуляць на прыродзе, атрымліваць падарункі і максімум пяшчоты і ўвагі ад блізкіх.

***— А сэксуальнаму жыццю ёсць месца ў гэты перыяд?***

— Вядома, калі цяжарнасць працякае без ускладненняў, то ніякіх супрацьпаказанняў для сэксуальнага жыцця няма. Нерэалізаванае жаданне — гэта заўсёды дрэнна. Адзінае невялікае абмежаванне — на самых ранніх тэрмінах і напярэдадні родаў, паколькі можна справакаваць перарыванне цяжарнасці або заўчасныя роды.

***— Як хутка пасля родаў арганізм вяртаецца ў ранейшы стан?***

— Праз 6-8 тыдняў. Праўда, калі жанчына працягвае грудное кармленне, для якога патрабуецца пэўны гарманальны фон, то ўсё прыходзіць у норму па завяршэнні кармлення.

***— Ці існуюць спецыфічныя захворванні, якія ўзнікаюць менавіта падчас цяжарнасці?***

— Як правіла, цяжарнасць стварае спрыяльныя ўмовы для праяўлення некаторых хвароб. Гэта датычыцца, напрыклад, такой паталогіі мочавыводных шляхоў як піеланефрыт, які часта з'яўляецца менавіта ў час цяжарнасці і родаў. Змена гарманальнага фону, лішак гармону прагестэрону можа спрыяць запорам, а затым і з'яўленню гемарою. Пры любых зменах на вочным дне жанчыне выконваецца кесарава сячэнне.

***— Сучасная медыцына дазваляе нараджаць жанчынам нават з самымі цяжкімі паталогіямі, выхаджаць неданошаных дзяцей... А ці існуюць супрацьпаказанні да цяжарнасці?***

— Існуе каля дваццаці захворванняў, пры якіх паказанае перарыванне цяжарнасці на любым тэрміне... Дарэчы, у нас быў выпадак, калі па прычыне дрэннага стану здароўя кансіліум урачоў прапанаваў жанчыне перарваць цяжарнасць. Але яна не жадала нікога чуць. У выніку аднойчы яна проста пачала задыхацца... Датэрміновыя роды адбыліся не ў нашай, 5-й клініцы, а ў РНПЦ «Маці і дзіця», дзе ёсць магчымасці выхадзіць малавагавых дзяцей. Аднак нарадзіць і выхадзіць — адна справа. Ёсць жа і іншае пытанне — хто і як будзе расціць гэтае дзіця? Сучасная медыцына здольная на многае, але трэба думаць і пра наступствы.

Праблема невыношвання цяжарнасці застаецца актуальнай для ўсяго свету, але ж падыходы да яе вырашэння адрозніваюцца. Мы, напрыклад, робім усё, каб цяжарнасць абавязкова захавалася, прычым робім да таго моманту, пакуль плод дакладна не загіне. Хоць вядома, што прырода імкнецца пазбавіцца ад таго, што ёй «не падабаецца». Аднак мы вымушаныя ісці супраць прыроды хоць бы таму, што нашы суайчынніцы ў большасці сваёй нараджаюць толькі адно дзіця. У заходніх краінах пры пагрозе выкідышу на раннім тэрміне цяжарнасць не намагаюцца захаваць любымі шляхамі.

***— Наколькі бяспечным можа быць татальнае выкарыстанне сродкаў для абязбольвання падчас родаў?***

— Для падобнай практыкі існуюць адпаведныя паказанні. Укол таго ж прамідолу, ад якога жанчыне адразу робіцца лягчэй, можна зрабіць, калі да завяршэння родаў застаецца дзве і болей гадзін, паколькі прэпарат уздзейнічае не толькі на маці, але і на плод. За дзве гадзіны прамідол пакіне арганізм маці, і плод будзе пазбаўлены яго ўздзеяння. У іншым выпадку дзіця не зможа пасля з'яўлення на свет зрабіць нармальны першы ўдых, паколькі прэпарат прыгнятае дыхальны цэнтр.

Вельмі перспектыўным напрамкам лічыцца спінамазгавая анестэзія, аднак на сёння нашы анестэзіёлагі настолькі загружаныя, што прымяняць гэты метад не ўяўляецца магчымым. Ні ўрач, ні анестэзіёлаг, ні акушэрка не маюць магчымасці знаходзіцца побач з парадзіхай на працягу некалькіх гадзін і назіраць, якім чынам ідзе працэс.

***— І нават у лік платных паслуг нельга залічыць такую анестэзію?***

— Свабодны анестэзіёлаг усё роўна не з'явіцца... Застаецца больш даступны спосаб — спазмалітыкі, напрыклад, папаверын. Такое абязбольванне можа прымяняцца досыць шырока. А наогул не будзем забывацца на фізіяпсіхапрафілактычную падрыхтоўку да родаў. Кожная цяжарная жанчына павінна наведваць спецыяльныя заняткі, рыхтавацца да родаў, у якіх ёй давядзецца актыўна ўдзельнічаць, чуць і выконваць тое, што ёй будуць гаварыць урач і акушэрка. Жанчына павінна добра ўсведамляць, што такое родавы боль, быць гатовай да яго, абавязкова выконваць тое, што кажуць урач і акушэрка, і тады абязбольванне ў тым варыянце, пра які вы кажаце, спатрэбіцца ў невялікай колькасці выпадкаў.

***— Але ж у такі момант жанчыне хочацца разумення, увагі і... каб за ёю быў прыстаўлены хоць бы адзін доктар...***

— Такога не будзе, напэўна, ніколі. За суткі ў раддоме можа адбыцца 20-30 родаў, калі жанчын размяшчаюць нават у калідоры. Пры існуючым штатным раскладзе немагчыма ўявіць, каб медперсанал назіраў за родамі кожнай асобна ўзятай жанчыны. Але ж зараз у Мінску створаныя вельмі камфортныя ўмовы для парадзіх.

***— Як мужчына і доктар вы бачыце асаблівы сэнс у знаходжанні будучага бацькі ў радзільнай зале?***

— У перадродавай палаце няхай сабе прысутнічае хоць уся сям'я, а ў радзільнай зале мужчыну дакладна няма чаго рабіць. Гэта маё глыбокае перакананне.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Муз-news

### ВОЛЬГУ ПЛОТНІКАВУ ПАЦЯГНУЛА НА САЛОДКАЕ

**Перыяд, калі хацелася салёненькага, завяршыўся цалкам пазітыўна: у сям'і спявачкі і кампазітара Генадзя Маркевіча адбылося доўгачаканае прыбаўленне — напрыканцы кастрычніка з'явіўся на свет іх сын.**

У сямейнага і творчага тандэма гэта ўжо другое дзіця — тры гады таму нарадзілася першае і, як мяркуе Вольга Плотнікава, не апошняе: «Мне вельмі хочацца мець траіх сваіх дзетак і чацвёртага ўсынавіць. Здаецца, мы вельмі добра ідзём да пастаўленай мэты». З задавальненнем выконваючы ролю мамы, артыстка, аднак, не забываецца і на творчасць, прадстаўляючы прыхільнікам інтэрнэт-рэліз свайго новага дыска «Жыццё-цукерка!». У лістападзе Вольга зноў з'явілася на сцэне, а ўжо вясной плануе адправіцца ў тур па гарадах Беларусі і выпусціць мультымедыйны альбом з 12 новымі песнямі, 3 караоке-версіямі найбольш папулярных кампазіцый і 2 відэакліпамі.




### «ЛЯПІС ТРУБЯЦКОЙ» ЗАМАХНУЎСЯ НА АЛІМП

**Не, выступіць на Алімпійскіх гульнях удзельнікі гурта пакуль што не плануюць, затое яны звярнуліся да тэматыкі грэчаскага Алімпа — калі меркаваць па новых песнях «Зеўс» і «Свяшчэнны агонь».**

На сваім афіцыйным сайце гурт змясціў сінгл «Свяшчэнны агонь», куды, акрамя ўжо названых песень, увайшла таксама кампазіцыя «Афрыка» — кавер-версія хіта расійскага рэгі-калектыву «Камітэт аховы цяпла». Апошняя прысвечана памяці нядаўна памерлага лідара «Камітэта» Олдзі. Увесь жа сінгл з'яўляецца своеасаблівым анонсам новага альбома «Ляпісаў», выхад якога запланаваны на вясну наступнага года. «Не сакрэт, што многія рок-героі, якія ў маладосці называлі сябе панкамі і свята верылі ў ідэі альтэрнатывы, пазней, калі да іх прыходзіў поспех, ператвараліся ў камерсантаў і буржуяў. Мне здаецца гэта зусім няправільным, — разважае Сяргей Міхалок над канцэпцыяй будучага альбома. — Таму я раўняюся на такіх музыкантаў, якія змаглі захаваць у сваіх сэрцах свяшчэнны агонь, увесь час плылі супраць цячэння і заставаліся вечна маладымі — гэта, на маю думку, абавязак любога творчага чалавека».

### НІНА БАГДАНАВА НЫРНУЛА Ў ХАЛОДНУЮ ВАДУ

**І ўсіх сваіх прыхільнікаў запрашае зрабіць тое ж самае, бо «Халодная вада» — гэта новы відэакліп на лірычную аўтарскую песню, дзе спявачка паказалася ў новым вобразе.**

«Гэтая кампазіцыя пра каханне адрасаваная, як мне здаецца, больш дарослай публіцы, — разважае спявачка. — Распад сур'ёзных глыбокіх адносін знаёмы кожнаму, хто кахаў па-сапраўднаму. Спадзяюся, што мне ўдасца дастукацца да сэрцаў слухачоў, і яны перажывуць гэта адчуванне зноў разам са мной». Кліп здымала творчая каманда «4 group» — часткова ў павільёне загараднага катэджа пад Мінскам, а часткова на прыродзе — чамусьці пад Масквой. Прэзентацыя ж відэа адбылася ў адным са сталічных клубаў, і ўдзел у ёй, акрамя спявачкі, узялі некалькі вядомых дызайнераў, каб пераўтварыць гераіню вечара ў розныя вобразы непасрэдна на сцэне.

**Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# ...І «БРЭСЦКАЯ КРЭПАСЦЬ» У ПАДАРУНАК

## Сумесны расійска-беларускі кінапраект «Брэсцкая крэпасць» трымаецца ў расійскім кінапракаце пяты тыдзень

— Гэта беспрэцэдэнтны выпадак у сучасным расійскім кінапракаце, што айчынная (напалову расійская, напалову беларуская) карціна так доўга здольная канкурыраваць з замежнымі блокбастарамі, — лічыць **Ігар УГОЛЬНІКАЎ, старшыня ТРА Саюзнай дзяржавы, генеральны прадзюсар фільма «Брэсцкая крэпасць»**.
— І дынаміка ў рэгіёнах лепшая, чым у Маскве: прыходзяць бацькі з дзецьмі, настаўнікі з вучнямі. 23 лютага мы будзем паказваць фільм у Дзяржаўнай думе РФ. Кіраўнікі дзяржаў Расіі і Беларусі карціну бачылі і добра яе ацанілі.

Першы канал, працягвае спадар Угольнікаў, разам з тэлерадыёвяшчальнай арганізацыяй Саюзнай дзяржавы пачынае акцыю, якая будзе цягнуцца з 23 лютага да 9 мая (магчыма, да 22 чэрвеня) 2011 года: усе копіі, якія ў нас застануцца ад пракату ў Расіі — а іх 500 штук, — мы будзем збіраць і перадаваць грамадскім аб'яднанням, навучальным установам, ваенным акадэміям і г.д. Гэта савецкая традыцыя, якую мы хочам вярнуць, — не знішчаць копіі фільма пасля пракату. Адначасова будзем займацца міжнародным пазіцыянаваннем фільма. У тым ліку, фільм «Брэсцкая крэпасць» можна і трэба прадстаўляць на «Оскар» за 2011 год. Гэта можа быць вельмі добрым стратэгічным і партнёрскім крокам.

Бюджэт фільма, між іншым, склаў больш за 250 млн рас. руб. Днямі фільм афіцыйна выйшаў у DVD-пракат у Расіі. У хуткім часе павінен з'явіцца на ліцэнзійных дысках і ў нас.

— Нашы супрацоўнікі праехалі па Маскве, Піцеры і некаторых рэгіёнах, праверылі: «Брэсцкая крэпасць» — абсалютны пакупны бестселер, — распавядае Ігар Угольнікаў. — Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы за кошт бюджэту, напэўна, надрукуе дыскі для продажу і распаўсюджвання ў Беларусі. Гэтыя дыскі пойдуць і ў Парламенцкі сход, і ў Пастаянны камітэт, і ў Міністэрствы культуры РБ і РФ, ТРА Саюза. Іх атрымаюць людзі, якія дапамагалі нам у стварэнні фільма. Гэта будзе такі для іх падарунак.

Над сцэнарыем фільма, варыянтаў якога, дарэчы, было больш за два дзясяткі, працавала вельмі шмат людзей. У тым ліку і вядомы беларускі драматург Аляксей Дудараў. Аўтарам канчатковага сцэнарыя з'яўляецца **прадзюсар ТРА Саюза Канстанцін ВАРАБ'ЁЎ**:

— Сцэнарый «Брэсцкая крэпасці» абмяркоўваўся ў грамадскіх ветэранскіх арганізацыях, прыцягваліся шматлікія гісторыкі, ваенна-гістарычныя таварыствы для ацэнкі розных варыянтаў сцэнарыя. Але не было лепшых крытыкаў, чым супрацоўнікі мемарыяла «Брэсцкая крэпасць — герой» на чале з дырэктарам Валерыем Губарэнкам. Для нас было прынцыповым менавіта іх меркаванне. І мы прытрымліваліся іх заўваг для таго, каб у нашым фільме праўда мастацкая знаходзілася ў рамках праўды гістарычнай. Каб наш фільм пра вайну не ператварыўся ў навуковую фантастыку ці фэнтэзі... Мы хацелі вярнуць на экран ідэю патрыятызму і гераізму савецкіх салдат Другой сусветнай вайны, якая, на жаль, у апошнія гады па розных прычынах была страчана....

**Людміла ПЕРАГУДАВА, кінакрытык, галоўны рэдактар часопіса «На экранах»:**

— Фільмы пра Брэсцкую крэпасць можна пералічыць па пальцах. І не таму, што гэта тэма не кінематаграфічная, проста яна вельмі складаная... Рэжысёр Аляксандр Кот, узяўшыся за гэты фільм, адразу сказаў, што ён будзе рабіць фільм пра вайну так, як рабілі яго настаўнікі. Так, ён збіраўся рабіць кіно ў савецкай эстэтыцы. І не саромеўся гэтага. Фільм «Брэсцкая крэпасць» — пошук душэўнага водгуку. І гэта самае важнае. У мастацкім сэнсе карціна месцамі слабавата, у ёй ёсць другасныя моманты. Але ёсць у ёй абсалютная ўнікальнасць — успрыманне гледача. У мяне было ўражанне, што тыя, хто здымаў гэты фільм, увесь час адчувалі за спінай дыханне людзей, што загінулі ў Брэсцкай крэпасці. І гэта ўскладала на стваральнікаў дадатковую адказнасць...

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

# СЛОВА НА РАЗВІТАННЕ



**МАРОЗНЫМ снежаньскім ранкам пайшоў ад нас Пётр Пятровіч Суцько, вядомы журналіст, які больш за 30 гадоў рэдагаваў Брэсцкую абласную газету «Заря».**

Страту панесла не адна газета, усе асноўныя друкаваныя выданні Брэста стварылі спецыялісты зароўскай школы. Нас, студэнтаў журфака 80-х гадоў, вучылі на прыкладзе брэсцкай абласной газеты, якая была ў шэрагах лепшых выданняў тагачаснай вялікай краіны.

Пётр Суцько нарадзіўся 20 мая 1936 года ў вёсцы Асошнікі Пружанскага раёна. І да канца сваіх дзён захоўваў у сэрцы шчырую прыязнасць да роднай мясціны. Ён быў прыкладам увагі і ўдзячнасці да сваёй матулі, якая адна ўздымала дзяцей. І ўсё жыццё падпісваўся — Пётр Асошнік — у тых выпадках, калі трэба было выкарыстаць псеўданім.

Журналісцкую загартоўку Пётр Пятровіч Суцько прайшоў у раённых газетах Брэстчыны. А з 1972 да 2003 года працаваў рэдактарам «Зари». У 1982 годзе газета была ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў, у тую пару калектыў вызначаўся яркімі асобамі айчыннай журналістыкі. Сам рэдактар таксама быў удастоены ордэна «Знак Пашаны», ганаровых званняў і адзнак. Але тыя, хто з ім працаваў, ведалі Пятра Пятровіча найперш як чалавека лёгкага ў зносінах, чалавека, што валодаў добрым пачуццём гумару, нязменным аптымізмам, мудрасцю і тактам. Ён умеў нават складаную праблему спрытна і дасціпна раскласці на дробныя часткі, якія ўжо не ўяўляліся невырашальнымі. Умеў падтрымаць словам і справай таварыша.

Ён вельмі любіў сваю «Зарю». Амаль да апошніх дзён на старонках газеты выходзілі яго матэрыялы. Такім і застанецца ў нашай памяці: працаздольным, энергічным, пазітыўным.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, уласны карэспандэнт «Звязды» па Брэсцкай вобласці, і ўсе звяздоўцы.**

Гучная справа

# 18 гадоў на асэнсоўванне свайго ўчынку

**Менавіта да такога тэрміну пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму асуджаны былы ўчастковы інспектар Рагачоўскага РАУС, які забіў з табельнай зброі 22-гадовую дзяўчыну. Такое рашэнне прыняў Гомельскі абласны суд. Былога ахоўніка правапарадку прызналі вінаватым у забойстве жыхаркі вёскі Журавічы, учыненым з хуліганскіх намераў. Нагадаем, што трагедыя адбылася ў ноч з 6 на 7 ліпеня, калі ў вёсцы адзначалася Купалле. Участковы міліцыянер у службовай машыне смяротна параніў мясцовую жыхарку. Дзяўчына атрымала сляпое агнястрэльнае раненне галавы і памерла праз 10 дзён у рэанімацыі.**

Па заключэнні экспертызы, былы міліцыянер псіхічна здаровы і мог усведамляць свае дзеянні. Выступаючы ў спрэчках, дзяржаўны абвінаваўца прапаноўваў прызначыць меру пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 20 гадоў. Пракурор назваў змякчальнымі абставінамі станоўчыя характарыстыкі, наяўнасць у абвінавачанага дваіх няпоўнагадовых дзяцей. Абставіны, якія абцяжарылі прысуд — тое, што ў момант здзяйснення злачынства ўчастковы быў п'яны, і тое, што ён прымаў прысягу.

Асуджанага пазбавілі звання капітана міліцыі. Па рашэнні суда былы ўчастковы інспектар абавязаны пакрыць пацярпелым — бацькам забітай — матэрыяльныя і маральныя страты. Яны ацэненыя судом у памеры каля 73 мільёнаў рублёў. На карысць бальніцы, дзе 10 дзён знаходзілася пацярпелая дзяўчына, спагнана больш за 4 мільёны рублёў. Бацькі забітай дзяўчыны задаволеныя прыгаворам суда і лічаць яго справядлівым. Суд вынес прыватную пастанову ў адрас начальніка ўпраўлення ўнутраных спраў Гомельскага аблвыканкама аб ліквідацыі выяўленых недахопаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# АКУРАТ — ДА КАЛЯД

**У МІНСКІМ выдавецтве «Кавалер» толькі што выйшла кніга польскага пісьменніка Рышарда Курыльчыка «Нязломны з Назарэта» ў перакладзе на беларускую мову Анатоля Бутэвіча. У гэтыя дні адбываюцца сустрэчы аўтара з мінскімі чытачамі.**




Рышард Курыльчык — вядомы ў Польшчы пісьменнік, дзяржаўны дзеяч, гаспадарнік. Яго называюць апошнім з магікан гістарычнай прозы. Ён нястомна распрацоўвае ўсё новыя гарызонты адзін раз і на ўсё творчае жыццё абранага абсягу, зноў і зноў заглыбляецца ў далёкія ад нас дні (не толькі польскай гісторыі), каб глыбей і выразней зразумець падзеі сённяшнія, у тым ліку, а мо найперш, сусветныя. І мае ў гэтым поспех.

Каб пераканацца, зазірніце хоць бы ў яго гістарычную аповесць «Славянскі світанак», якая ў перакладзе Анатоля Бутэвіча на беларускую мову ў 2007 годзе выйшла ў мінскім выдавецтве «Чатыры чвэрці». Кніга прысвечана самай старажытнай эпосе ў гісторыі славянства, калі яшчэ назва «славяне» была схавана за гістарычным небасхілам. Вось як выказваецца пра гэты твор дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Андрэй Прохараў: «Мы ведаем славян з моманту, калі яны з'явіліся на межах візантыйскага свету і пачалі пагражаць нават яго існаванню. Гэта і звярнула на іх увагу гісторыкаў таго часу. Пра гэта піша Рышард Курыльчык. Але дагэтуль адной з самых загадкавых праблем застаецца пытанне, адкуль і як з'явіліся славяне на гістарычнай арэне. Гэтую, амаль невырашальную, задачу — знайсці карані славян у бязмежным моры еўраазіяцкіх варвараў — і паставіў перад сабой пісьменнік. Не трэба ставіцца да кнігі як да чыста гістарычнага твора. Перад намі твор менавіта мастацкі, як па сваёй форме, так і па сваім складзе. Твор, які спрабуе аднавіць старажытнасць, знайсці ў ёй заканамернасці, а галоўнае, знайсці славян там, дзе іх яшчэ не ведаюць гістарычныя крыніцы, якія дайшлі да нас. Аўтар спрабуе якраз запоўніць тыя лакуны, «белыя плямы», якія нясуць у сябе гістарычныя крыніцы».

Аповесць «Нязломны з Назарэта» — спроба адказаць на няпростае для кожнага верніка пытанне: кім лічыш ты Сына Чалавечага? Аднак гэта не рэлігійны тэкст. Гэта бачанне тых падзей вачыма сённяшняга аўтара. Ды ўсё ж не пазбаўлена аповесць і палітыкі. Бо тады без яе не чыніліся падзеі. Палітычная драма дзяржаўных кіраўнікоў скрыжоўвалася з чалавечымі лёсамі. І таму, магчыма, аўтар паказвае віноўнікаў Хрыстовай драмы, якія глыбока ўцягнуты ў палітыку, самі ствараюць палітыку, думаюць і жывуць палітыкай. Палітыка вызначае іхнія паводзіны і дзеянні. Не заўсёды апраўданыя і не ўсюды справядлівыя.

Але хто ж тады для іх Ісус Хрыстос? Кім лічаць яго? Як ставяцца да яго? Вядомая рэч — найперш і ў галоўным як да палітыка, аднаго з іх, але адначасна і як да суперніка (хоць і беспадстаўна) кожнага з іх. А што ж з гэтага вынікае? Як стасуецца гэта з іхнім уласным лёсам, з лёсам народаў, на чале якіх яны стаяць, як уплывае на лёс самога Ісуса Хрыста? Аўтар сілай свайго ўяўлення і таленту намагаецца як мага праўдзіва і найбольш справядліва паказаць, як імя Хрыста неаспрэчна ўваходзіць у тагачасны свет палітыкі. Але якім чынам? Як крыніца страху для адных. І як крыніца веры і надзеі для іншых. Што ж пераможа? Як жыццё і слова Ісуса Хрыста ў тым разбэрсаным часе (зрэшты, і ў сённяшнім таксама) дапамогуць змяніць свет, змяніць сэнс чалавечага існавання? І пра гэта таксама аповесць «Нязломны з Назарэта».

Аўтар прадмовы, доктар гістарычных навук, прафесар Віктар Фядосік зазначае: «Я параўнаў бы твор Р. Курыльчыка з шэдэўрам кінарэжысёра А.Таркоўскага «Андрэй Рублёў»... Аўтар літаральна па крупінках сабраў вялікую колькасць гістарычных звестак аб грамадстве, людзях, якія жылі ў Палесціне на пачатку І ст. н.э... Вялікая заслуга аўтара — рэканструкцыя менавіта сапраўднай рэчаіснасці. Ён стварыў дакладныя характарыстыкі персанажаў свайго твора па гістарычных звестках... Шмат што можа ўспрымацца як нечаканае, неверагоднае, але аўтарская версія мае права на існаванне, бо яе падстава — рэаліі тагачаснага жыцця».

Варта дадаць, што Рышард Курыльчык — наш зямляк. Ён нарадзіўся 18 мая 1945 года на Браслаўшчыне. Па прафесіі інжынер-канструктар — будаўнік вялікіх электрастанцый, у тым ліку атамных. Жыве ў польскім горадзе Слупску, што на ўзбярэжжы Балтыйскага мора. Працаваў ваяводам Слупскім і Паморскім, быў намеснікам міністра інфраструктуры Польшчы. Член Саюза польскіх пісьменнікаў. Аўтар кніг «Ерусалім, Ерусалім», «Ад Маратона да Ардэрыкі», «Нязломны з Назарэта», «Сакрэтныя архівы Камбоджы», «Апошні апостал», «Папа Рымскі», «Славянскі світанак», мае некалькі польскіх літаратурных прэмій.

**Максім БАЯРСКІ.**

**Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» – продавец (организатор аукциона) 21 декабря 2010 года проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества с понижением начальной цены продажи на 50 %.**

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Место нахождения имущества | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Трансформаторная подстанция, площадь 44,5 м²<br>Асфальтовое покрытие, площадь 2441 м²<br>Станция пожаротушения, площадь 27 м²<br>Сети газоснабжения, длина 360 м<br>Забор из ж/б плит, площадь 708 м²<br>Административное здание, площадь 122,7 м²<br>Весовая, площадь 6,5 м²<br>Котельная, площадь 114 м² | 562 021 655 | Могилевская область, Чаусский район, г. Чаусы, ул. Красноармейская | 56 202 166 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его местонахождение и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23 64 24, 28 41 00.
2. Дата, время и место проведения аукциона: **21.12.2010 г. в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.
3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества от 28.05.2009 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
4. Информация о земельном участке: площадь земельного участка – 2,3868 га, кадастровый номер – 725450100001000287.
5. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с 3012008900015 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Могилевской области код 355, УНП 700049607, ОКПО 03454762.
6. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **20.12.2010 г.; время: 17.00.**
7. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
8. Сроки подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона.
9. Извещение о проведении первого открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» опубликовано в газете «Звязда» № 172 от 03.09.2010 г. и № 221 от 11.11.2010 г.

**Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» – продавец (организатор аукциона) 22 декабря 2010 года проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества с понижением начальной цены продажи на 50 %.**

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Место нахождения имущества | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Забор, длина – 138,15 м<br>Склад, площадь 402,4 кв. м<br>Ремонтные мастерские-гараж, площадь 737,74 кв. м<br>Тепловые сети, длина 146,72 м<br>Канализационная сеть, длина 87,9 м<br>Электрические кабельные сети, длина 29,5 м<br>Водопроводная сеть, длина 276,8 м<br>Административное здание, площадь 445,12 кв. м<br>Благоустройство территории, площадь 4086,4 кв. м<br>Котельная, площадь 305,4 кв. м<br>Здание для хранения изношенных шин, площадь 83,7 кв. м<br>Туалет, площадь 4,9 кв. м<br>Колодец, площадь 0,6 кв. м | 237 916 787 | Могилевская область, Кричевский район, г. Кричев, ул. Комсомольская, 126А | 23 791 679 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его местонахождение и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23 64 24, 28 41 00.
2. Дата, время и место проведения аукциона: **22.12.2010 г. в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.
3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества от 28.05.2009 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
4. Информация о земельном участке: площадь земельного участка – 1,0792 га, кадастровый номер – 724050100001005035.
5. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с 3012008900015 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Могилевской области код 355, УНП 700049607, ОКПО 03454762.
6. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **21.12.2010 г.; время: 17.00.**
7. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
8. Сроки подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона.
9. Извещение о проведении первого открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» опубликовано в газете «Звязда» № 172 от 03.09.2010 г. и № 221 от 11.11.2010 г.

**...Страляць, па ўласным прызнанні Аляксандра ШЫПУНОВА, ён навучыўся ледзьве не раней, чым хадзіць. Безумоўна, у гэтых словах ёсць перабольшванне, аднак менавіта яны, як падаецца, даюць найбольш поўнае ўяўленне пра дзяцінства нашага героя. Ён нарадзіўся ў 1948 годзе ў Сібіры, у Кемераўскай вобласці — на прыіску Джэлсай у Горнай Шорыі. Гэтыя мясціны Аляксандр Міхайлавіч зараз называе найпрыгажэйшымі. Потым жыў у Горным Алтаі, у Кызыле скончыў школу. А перад тым — ва ўзросце 10-12 гадоў — рыбачыў, паляваў. І не проста дзеля забавы і азарту, а каб забяспечыць некалькі сем'яў: дзед вярнуўся з вайны без нагі, з пратэзам хадзіў і бацька. «Дзіця прыроды», прыгадвае суразмоўца тыя часы. Таму калі пасля службы ў войску на вочы патрапіла аб'ява аб прыёме на падрыхтоўчае аддзяленне для паступлення на біяфак БДУ, не вагаўся. Так, народжаны ў Сібіры, ён патрапіў у Беларусь, дзе назаўсёды і застаўся...**



# ЗВІТАЯ РУКОЙ, УПАДАБАНАЯ ВОКАМ

## Народны майстар адраджае старажытнаславянскае рамяства — скань

### «ДВОЙЧЫ ПРАСІЎ БЛАСЛАЎЛЕННЯ УЛАДЫКІ»

Бацькі нашага героя былі простымі рабочымі, ніякага дачынення да навук не мелі. А вось цяга да рамяства, народнай творчасці была ў ім, відаць, закладзеная на генетычным узроўні. Аляксандр Міхайлавіч прыгадвае, што ўсе мужчыны ў сям'і былі ўмелымі работнікамі. Адзін дзед, напрыклад, быў выдатным шаўцом. Да другога заказваць балалайкі ехалі нават здалёк, прычым, здалёк — па мерках Сібіры. У самога ж Аляксандра Шыпунова цяга да творчасці прачнулася ўжо ў сталыя гады. У якасці хобі займаўся і вітражамі, і хахламскім роспісам, і разьбой па дрэве. Пакуль неяк пакрысе не вырашыў заняцца велікоднымі яйкамі. Іх ён вырабляў з дрэва, а потым пакрываў сканню — аплятаў выраб металічным узорам з дроту. Праца была цікавай, але вельмі карпатлівай. Працаваць даводзілася з моцнай крыміналістычнай лупай з падсветкай. У далейшым гэтая акалічнасць будзе мець значэнне...

— Недзе гадоў дванаццаць таму я працаваў мастаком-афармiцелем у Свята-Пакроўскай царкве ў сталіцы. Хоць фактычна даводзілася выконваць любую працу, у якой была патрэба. І вось менавіта там святары, убачыўшы мае спробы, блаславілі на выраб велікоднага яйка для Філарэта. Яму спадабалася, і, калі вырашылі зрабіць падарунак нябожчыку Алексію ІІ, заказалі мне ўжо два яйкі. Блаславіў на гэтую справу сам Уладыка, — прыгадвае Аляксандр Міхайлавіч. — І вось калі адпісваў на адным імянную ікону, сутыкнуўся з наступным. Лік на іконе — памерам з запалкавую галоўку, адпаведна, зрэнкі — яшчэ меншыя. Але яны атрымаліся. А вось кісць рукі — ну ніяк. Давялося ў другі раз прасіць блаславення Філарэта, трымаць пост 40 дзён. І ўсё роўна — не атрымлівалася. Літаральна ўзмаліўся і — усё выйшла.

### НАГРУЗКА ПАЙШЛА З ВАЧЭЙ НА РУКІ

Зрок з-за спецыфікі працы з цягам часу «сеў». Таму да заняткаў філігранню, як прызнаецца майстар, яго падштурхнула само жыццё.



На дэкаратыўным унітазе філігранны ўзор напайваецца на ліставое жалеза. Што тычыцца самога «вырабу» — майстар убачыў яго ў французскім стылі: як у Луўры.

2

Філігрань — адзін са старажытнейшых відаў мастацкай апрацоўкі металу. Назва паходзіць ад двух лацінскіх слоў — «філюм» (нітка) і «гранум» (зерне). Слова «скань» старажытнаславянскае і азначае «звіць», «скруціць». Абедзве назвы ўказваюць на асаблівасць гэтага віду апрацоўкі металу, толькі філігрань больш падыходзіць да ювелірных вырабаў — з каштоўных металаў (золата, серабро) і камянёў. А Аляксандр Шыпуноў пачаў працаваць са звычайным стальным дротам рознага дыяметру.

Каб было больш зразумелым: элементы ўзору бываюць самымі рознымі — у выглядзе вяровачкі, шнурка, елачкі, дарожкі і інш. У адзінае цэлае яны злучаюцца з дапамогай пайкі. Для стварэння больш эфектнай структуры выкарыстоўваецца «зерне» — дробныя або буйныя металічныя шарыкі, якія напайваюцца ў загадзя падрыхтаваныя паглыбленні. Таксама ў якасці «зерня» для аздаблення вырабаў майстар выкарыстоўвае гранёны горны хрусталь.

Практычна ўся праца — ручная. Калі і выкарыстоўваюцца якія прыстасаванні, дык самыя простыя. Напрыклад, для змякчэння дроту можна абпаліць на газавай гарэлцы. Звіць скань можна пры дапамозе электрадрыля ці проста падвесіўшы на канцы дроту груз, які круціцца. Але гэта толькі падрыхтоўка элементаў будучага вырабу, потым выгінаць іх даводзіцца ўсё роўна ўручную.

— Вось гэтымі рукамі, — выцягвае скручаныя пальцы Аляксандр Міхайлавіч. І ўсміхаецца: маўляў, нездарма ж здаўна далікатна выкананую працу і называлі філіграннай!

Што можна вырабіць потым з падрыхтаваных элементаў? Ды што заўгодна. Падсвечнік, дэкаратыўнае трыманне для бутэлькі віна, міні-бар у выглядзе віяланчэлі або гітары, рамы для люстэркаў, дзверы, аздобіць імі мангал. Гэта ўсё рэальныя рэчы, ужо зробленыя Аляксандрам Міхайлавічам *(гл. фотаздымак 1)*.

### АД АЎКЦЫЁНА ДА ПРЫВАТНІКА

Вырабы суразмоўцы бачылі наведнікі «Горада майстроў» на «Славянскім базары», шматлікіх спецыялізаваных выстаў у сталіцы. Больш за тое, адзін яго твор быў прададзены на аўкцыёне «Парадыз» у Францыі. Гаворка ідзе пра... шапку Манамаха.

— Колькі гадоў таму вырашыў праверыць уласнае майстэрства. Абклаўся літаратурай, вывучаў гісторыю стварэння. Карпеў 3,5 месяца. Магу зараз дакладна сказаць, што зрабіць нешта сваё значна прасцей, чым штосьці скапіраваць, — падзяліўся ўспамінамі Аляксандр Шыпуноў.

За якую суму прадалі шапку Манамаха — майстар не гаворыць. Кажа, сам не ведае, хоць і яму было б цікава. «Колькі папрасіў, столькі мне за працу і далі. А да якой цаны ўздымаўся лот на аўкцыёне насамрэч — не ведаю. Праўда, тут жа спыталіся: калі яшчэ адну зраблю? Але я паўтораў не люблю, гэта ўжо руціна».

На адной з апошніх выстаў у сталіцы да Шыпунова падышоў чалавек, як потым высветлілася, калекцыянер... унітазаў. Як бачыце, бываюць і такія. Быццам бы іх усяго тры чалавекі — па адным у нас, Расіі і Украіне. Дык вось наш суайчыннік заказаў майстру для папаўнення свайго збору дэкаратыўны ўнітаз у «стылі стальскань». Прычым ніякіх прапаноў не выказаў — маўляў, зрабі так, як сабе гэта ўяўляеш.

— Мне гэты выраб падаўся ў такім французскім стылі, як быццам бы з тагачаснага палаца каралёў — Луўра, — паказвае асаблівасці «канструкцыі» Аляксандр Міхайлавіч і тлумачыць нюансы ўладкавання каналізацыі Парыжа тых часоў. «Мадэль» ужо гатовая працэнтаў на 80 *(гл. фотаздымак 2)*. Сам майстар да такога заказу ставіцца з гумарам: «Без каналізацыі няма цывілізацыі!»

Пасля яшчэ дырэктар крамы, дзе прадаваліся работы майстра, перадала Шыпунову пажаданне міністра замежных спраў, які ўбачыў выстаўленую віяланчэль: вельмі цікава, але б што-небудзь меншае па памерах. Паводле яго слоў, тое, чым займаецца майстар — вельмі перспектыўны накірунак, які трэба развіваць.

— А я якраз напярэдадні задумаў скрыпку вырабіць, вось зараз над гэтым і працую, — гаворыць майстар і паказвае раскладзеныя па працоўным стале ўжо гатовыя фрагменты. Дэманструе на нашых вачах, як пачынае «грэць» філігранны бок будучага «музычнага інструмента» *(гл. фотаздымак 3)*, калі яго аздобіць гранёным горным хрусталём розных колераў і металічнымі шарыкамі.

Яго мара — зрабіць карону Расійскай Імперыі. Памятаеце, як у вядомым савецкім фільме? У суразмоўцы і каляровы фотаздымак арыгінала ўвесь час пад рукой. «Вось толькі, — уздыхае, — па маіх падліках толькі каштоўных камяні для аздаблення абыдуцца ў 3,5 тысячы долараў».

### АДРАДЗІЦЬ — ЗНАЧЫЦЬ ЗАЦІКАВІЦЬ

Трэба сказаць, што і заказы, і пэўная цікаўнасць да такога віду мастацкай апрацоўкі металу ўзніклі не адразу. Іх і цяпер не назавеш масавымі. Магчыма, таму, што стальскань дагэтуль многія блытаюць з коўкай, хоць сапраўдных майстроў, што займаюцца менавіта ручной коўкай, — адзінкі. Не знайшлі пакуль у Беларусі сваіх супольнікаў і Аляксандр Шыпуноў з паплечнікамі. Ды і ў самога майстра не ўсё было гладка з пачатку.

— Калі крыху набраўся вопыту, панёс у мастацкую галерэю свае вырабы. Добра, сказалі мне, будзем з вамі супрацоўнічаць. Дзе ваш дакумент? А пад ім мелася на ўвазе пасведчанне народнага майстра. Я нават пакрыўдзіўся: я ж самавучка! А мне кажуць, маўляў, для самавучкі ў вас занадта ўсё добра. Карацей кажучы, я толькі тры гады таму вырашыў усё ж прыслухацца да той парады — стаў членам Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, — распавёў далей суразмоўца.

Пэўны час Аляксандр Міхайлавіч выкладаў ювелірнае майстэрства ў Цэнтры дзіцячай творчасці ў Фрунзенскім раёне сталіцы. «Цякучка была вельмі моцная — са ста школьнікаў толькі два хлопчыкі затрымаліся і праяўлялі ўседлівасць, мелі здольнасці. Адзін ужо праз паўгода да 8 Сакавіка зрабіў матулі падарунак — кальё з меднага дроту. Але ж кіраўніцтву цякучка не патрэбна...»

...Мы размаўлялі з майстрам Шыпуновым на базе фірмы «Стальмір». Яна займаецца вырабам утылітарных рэчаў з металу. І менавіта ў гэтых людзях (ці яны ў ім) Аляксандр Міхайлавіч знайшоў сваіх паплечнікаў. Гэтая своеасаблівая творчая лабараторыя існуе менш за паўгода. Тут майстар выступае як выкладчык, старэйшы дарадца. І сам мае магчымасць непасрэдна займацца любімай справай. Маладзейшыя супольнікі пераймаюць вопыт і (пакуль, праўда, асцярожна) выказваюць спадзяванне, што з цягам часу ён зможа спатрэбіцца на рынку. Прынамсі, Павел Целікавец і Аляксандр Папсуеў зараз аддалі свае працы на выставу «Калядны ўзор», што праходзіць у гарадской бібліятэцы імя А. С. Пушкіна. А па яе завяршэнні плануюць падаць дакументы на ўступленне ў Беларускі саюз майстроў народнай творчасці...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**



Крыж, выкананы ў тэхніцы аб'ёмнай стальскані

1



Элемент будучага музычнага інструмента — скрыпкі.

3

Бяседныя песні

# СПЯВАЙ, БЯСЕДА!

Ансамбль народнай музыкі «Бяседа» — духоўны партрэт нашага люду, спеўнага, энергічна-вясёлага, нястомна-працавітага. Дзе б ні гучалі песні ў выкананні «Бяседы» — у радыёэфіры ці на сцэнічных пляцоўках, — заўсёды наступае душэўная ўтульнасць, аптымістычная прасветленасць.

Ужо першыя выступленні творчага калектыву нагадвалі зорнае ззянне. Цягам часу ён мужнеў, загартоўваўся. І вось два дзесяцігоддзі песні «бяседнікаў» радуюць, натхняюць насельнікаў не толькі беларускай прасторы, акрыляюць іх светлай верай у справядлівасць, шчырасць, паразуменне.

Адметнай сімволікай пазначана гісторыя «Бяседы». Звычайна творчыя калектывы вядуць адлік свайго існавання ад даты пастановы аб іх арганізацыі, некаторыя — ад дня генеральнай рэпетыцыі, гэта значыць ад дня прыёму мастацкай праграмы ці ад яе прэм'еры. «Бяседа» добра помніць 28 снежня 1990 года. У гэты дзень упершыню адбыўся запіс яе песень «А ў нядзелечку спараненечку» і «Ой, лятала сіва пава» ў студыі Белдзяржтэлерадыёкампаніі, у складзе якой яна працуе. Аднак ансамбль абраў 1 студзеня 1991 года за пачатак творчай дзейнасці і адзначае сваё нараджэнне сумесна з навагоднім святам. Такое прымеркаванне міжволі нагадвае пра дату стварэння Савецкай Беларусі — 1 студзеня 1919 года — і аптымістычныя ідэалы яе люду. І назва калектыву — «Бяседа» — выразна адлюстроўвае сяброўска-сваяцкі рух беларусаў і самі х артыстаў. Якраз пра гэта сцвярджаецца ў песні «Спявай, бяседа!» Леаніда Захлеўнага і Леаніда Пранчака. І яна ўспрымаецца спеўна разгорнутым запаветам для ўсіх насельнікаў беларускага краю.



**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.**

*Верш Леаніда Пранчака*
*Музыка Леаніда Захлеўнага*



Добры звычай
старадаўні —
Запрашаць гасцей
у дом,
Сабірацца
на бяседу
За святочным за
сталом.
На бяседу,
на бяседу,
Каб душою адпачыць!
Мы жывём і жыць мы будзем,
Пакуль песня будзе жыць!

**Прыпеў**:
Спявай, бяседа звонкая, спявай,
сяброў збірай!
Хай радасць неўгамонная
ільецца цераз край!
Як сэрцу свята хочацца —
на стол сцялі абрус!
Падымем кубкі поўныя
за нашу Беларусь!

Каб бяседа не змаўкала,
Каб звінела і гула,
І на чарку, і на скварку
Запрашаем да стала.
На бяседу, на бяседу
Мы прыходзім да сяброў
Прывітаць іх добрым словам,
Праспяваць ім «Сто гадоў!»

**Прыпеў:**
Сэрцы шчырыя гамоняць,
Сэрцы блізкія пяюць.
Над азёрнаю старонкай
Песні родныя плывуць.
Запрашаем на бяседу,
Каб душою адпачыць!
Мы жывём і жыць мы будзем,
Пакуль песня будзе жыць!

# У ГАЛАЛЁДЗІЦУ ДОЎГІЯ ФУТРЫ ЛЕПШ ПАКІНУЦЬ ДОМА...

## ...а на падэшвы абутку наклеіць лейкапластыр

Зіма яшчэ толькі-толькі набіраецца сіл, а колькасць пацярпелых ад нерасчышчаных вуліц, раскатаных лядовых дарожак і слізкіх ганкаў вымяраецца ўжо тысячамі. Як паведаміў журналістам **старшы навуковы супрацоўнік навукова-метадычнага аддзела РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Аляксандр МУХЛЯ**, штодня ахвярамі галалёду становяцца па краіне да 800 чалавек і прыблізна 70-80 чалавек церпяць ад абмаражэнняў і пераахаладжвання арганізма. На жаль, ёсць ужо і смяротныя ахвяры маразоў...

Найбольшая колькасць пацярпелых ад галалёду рэгіструюцца пры тэмпературы паветра, блізкай да нулявой адзнакі. Абмарожанні таксама часцей за ўсё наступаюць не пры нізкай тэмпературы, а пры блізкіх да нуля паказчыках. А пры вільготным надвор'і абмаражэнне можна атрымаць нават пры плюсавой тэмпературы — дастаткова пастаяць на вуліцы пэўны час без пальчатак ці ў цесным абутку, папярэджвае Аляксандр Мухля.

У адну толькі 6-ю сталічную бальніцу за перыяд з 29 лістапада па 7 снежня паступілі з галалёднымі траўмамі 68 чалавек, з іх 19 чалавек (з асабліва цяжкімі траўмамі) давялося шпіталізаваць.

— На жаль, нашы назіранні сведчаць, што асноўнай прычынай траўматызму зімой становіцца банальная спешка, — расказвае Аляксандр Мухля. — Многія проста не заўважаюць, што пад снежным покрывам хаваецца лёд. Акрамя таго, даволі часта людзі траўмуюцца пры ўваходзе ці на выхадзе з транспартнага сродку. Дзеці і моладзь любяць пракаціцца з разбегу па слізкай дарожцы...



**Капюшоны звужаюць агляд і перашкаджаюць пры пераходзе вуліцы своечасова ацаніць сітуацыю на дарозе. На пешаходных пераходах таксама можа быць вельмі слізка...**

Самыя распаўсюджаныя траўмы — пераломы канечнасцяў — узнікаюць з-за таго, што пры падзенні чалавек інстынктыўна выстаўляе руку наперад і абрушваецца на яе ўсёй сваёй вагой. Таксама няразручна выстаўленая нага ламаецца ў вобласці галёнкі. Асабліва спрыяе атрыманню такой траўмы жаночы абутак на высокіх абцасах. Пажылыя людзі з-за ўзроставых асаблівасцяў шкілету (павышанай крохкасці касцей, меншай эластычнасці звязак і мышачнага каркасу) нярэдка атрымліваюць вельмі сур'ёзныя траўмы, якія могуць стаць прычынай інваліднасці: яны часцей за маладых ламаюць пазваночнік і шыйку сцягна. У састарэлым узросце нават невялікі ўдар можа стаць прычынай пералому, асабліва гэта датычыцца жанчын. Таму немаладым людзям медыкі ўвогуле не раяць выходзіць у галалёдзіцу з дому без суправаджэння. А калі ўсё ж такі немагчыма адкласці выхад з дому, то абавязкова трэба браць з сабой кіёчак з металічным наканечнікам, які дазволіць зменшыць слізганне.

Галоўнае, па словах Аляксандра Мухлі, навучыцца правільна падаць. Калі вы адчуваеце, што падзення ўжо не пазбегнуць, пастарайцеся прысесці — так зменшыцца вышыня, з якой вы ўпадзеце. Акрамя таго, у момант падзення трэба паспрабаваць згрупавацца — уцягнуць галаву і прыціснуць локці да бакоў. Калі, паслізнуўшыся, вы страчваеце раўнавагу, ні ў якім разе не падайце на выпрамленыя рукі. Падаць абавязкова трэба на бок, бо калі чалавек падае на спіну, то пагрозе траўмавання падвяргаюцца яго пазваночнік і галава. А калі вы ўсё ж такі падаеце на спіну, прыцягніце падбародак да грудзей, а рукі раскіньце як мага шырэй. Гэта застрахуе вас ад чэрапна-мазгавой траўмы.

Пры падзенні са слізкай лесвіцы вельмі важна абараніць твар і галаву: пастарайцеся прыкрыць іх рукамі. Не спрабуйце затармазіць падзенне, растапырыўшы рукі і ногі, — гэта толькі павялічыць колькасць пераломаў.

Праўда, самі медыкі прызнаюць, што ўсе гэтыя парады не з'яўляюцца гарантыяй выратавання, таму лепш увогуле не дапускаць траўманебяспечных сітуацый. Мяняць «гуму» на колах зімой трэба не толькі аўтааматарам, але і пешаходам. Палепшыць «счапленне» з зямлёй могуць наклеены на падэшву ў вобласці мыска і пяткі кавалкі лейкапластыру. Лепш за ўсё для зімы падыходзіць абутак на пляскатай падэшве. Галоўнае правіла — абутак павінен быць устойлівым.

**Немаладым людзям медыкі ўвогуле не раяць выходзіць у галалёдзіцу з дому без суправаджэння. А калі ўсё ж такі немагчыма адкласці выхад, то абавязкова трэба браць з сабой кіёчак з металічным наканечнікам, які дазволіць зменшыць слізганне.**

Нячышчаных вуліц і раскатаных лядовых дарожак лепш увогуле пазбягаць. Асабліва пільнымі трэба быць на ганках крамаў, ЖЭСаў, аптэк і многіх іншых арганізацый, пры будаўніцтве якіх выкарыстоўвалася плітка, якая ператвараецца зімой у сапраўдную лядовую пляцоўку. І зусім невыпадкова ў такіх месцах вісяць папярэджанні кшталту «Асцярожна, слізкія прыступкі». Між іншым, ад адказнасці такія аб'явы гаспадароў гэтых аб'ектаў не вызваляюць. І пры жаданні пацярпелы можа выставіць ім «кошт» за сваё траўмаванне... Застаецца адкрытым пытанне, чаму па сённяшні дзень у будаўнічых нормах не прапішуць забарону на выкарыстанне слізкай пліткі ў грамадскіх месцах: у гандлёвых цэнтрах, магазінах, вестыбюлях метро, каб увогуле ліквідаваць глебу для траўматызму?

Жанчынам зімой моцна перашкаджаюць сумкі на доўгіх ручках, якія звісаюць з пляча сваёй гаспадыні, перамяшчаюць цэнтр цяжару і цягнуць яе каменем уніз, а таксама доўгія футры ці паліто, асабліва калі даводзіцца пераадольваць той адрэзак праезнай часткі, на які даводзіцца спускацца, каб перабрацца ў транспартны сродак ці наадварот. Небяспечныя ў плане атрымання траўм і капюшоны, якія звужаюць агляд і перашкаджаюць пры пераходзе вуліцы своечасова ацаніць сітуацыю на дарозе. Трэба мець на ўвазе, што на пешаходных пераходах таксама можа быць вельмі слізка, а тармазны шлях у аўтатранспартных сродкаў падчас галалёдзіцы істотна павялічваецца.

— Увага і асцярожнасць з'яўляюцца асноўнымі сродкамі прафілактыкі траўматызму, прычым не толькі зімовага, — дадаў Аляксандр Мухля. — А таму, выходзячы на вуліцу, асабліва ў тыя дні, калі «плюс» на вуліцы змяняецца на «мінус» ці наадварот, трэба кантраляваць літаральна кожны свой крок. Лепш за ўсё рухацца па слізкай дарозе так, як быццам бы ідзеш на лыжах...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### Доктар адкажа

**ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...**

**На наступным тыдні дзяжурыць на «гарачай лініі» Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:**

**13 снежня** — галоўны ўрач Мінскага гарадскога клінічнага дзіцячага псіханеўралагічнага дыспансэра Вадзім Сяргеевіч КІРЫЛЮК.

**14 снежня** — галоўны ўрач Мінскага гарадскога клінічнага наркалагічнага дыспансэра Сяргей Іванавіч МАЛОЧКА.

**15 снежня** — галоўны ўрач 3-й мінскай дзіцячай паліклінікі Наталля Анатольеўна КЛІМОВІЧ.

**16 снежня** — загадчык аддзела Рэспубліканскага цэнтра экстраннай медыцынскай дапамогі Васіль Фёдаравіч МАЦЮКЕВІЧ.

**17 снежня** — дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра атарыналарынгалогіі Людміла Эдуардаўна МАКАРЫНА-КІБАК.

**«ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ» УПРАЎЛЕННЯ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ МІНАБЛВЫКАНКАМА (017) 220 20 25**

**13 снежня** — намеснік галоўнага ўрача Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы Наталля Пятроўна КУХАРСКАЯ

**14 снежня** — загадчык стаматалагічнага аддзялення для дарослых Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Мікалай Георгіевіч БАЙДА.

**15 снежня** — загадчык хірургічнага гнойнага аддзялення Мінскай абласной клінічнай бальніцы Уладзімір Васільевіч ІЛЬЮШОНАК.

**16 снежня** — загадчык лячэбнага стаматалагічнага аддзялення Мінскай абласной стаматалагічнай паліклінікі Людміла Ананьеўна КОБРЫНА.

**17 снежня** — галоўны ўрач МРЭК Мінскай вобласці Юлія Анатольеўна АЎСЯННІК.

*У графіку магчымы змяненні.*

### Жаночыя сакрэты

# «Выратавальны круг» для стомленай скуры

**ХРАНІЧНАЕ недасыпанне, курэнне, доўгае знаходжанне за камп'ютарам, непагадзь на вуліцы — усё гэта падрывае здароўе. А ў выніку — цьмяны колер твару, скура лушчыцца, мяшкі і маршчынкі пад вачамі. Але з любой сітуацыі ёсць выйсце. У гэтым выпадку іх ТРЫ: зазірніце ў свой халадзільнік, правільна падбярыце касметычныя сродкі ці наведайце касметолага.**

**ЦЬМЯНЫ, ЗЯМЛІСТЫ КОЛЕР ТВАРУ** можна падкарэктаваць танальным крэмам, але гэта не вырашэнне праблемы, бо арганізм падае вам сігнал, што ўсе працэсы ў клетках скуры замарудзіліся, а сама скура пакутуе ад кіслароднага галадання.

**1.** Шклянка вады з лімонам або кубак зялёнай гарбаты з раніцы дабратворна паўплываюць на стрававальныя працэсы і абмен рэчываў, а значыць, і на колер твару. А маска з кававай гушчы надасць скуры прыгожае адценне: густую кашкападобную масу неабходна патрымаць на твары каля 10 хвілін, пасля чаго ён будзе выглядаць злёгку загарэлым. Не забывайце і пра шыю, каб не было рэзкіх пераходаў колеру!

**2.** Стымуляваць усе працэсы ў клетках скуры заклікаyы касметычныя сродкі з малекулярным кіслародам, а абарону ад свабодных радыкалаў забяспечаць антыаксіданты. Падбярыце крэм з селенам, карацінам, вітамінамі А, С і Е, а таксама экстрактамі зялёнай гарбаты ці вінаграду, і колер твару праз нейкі час адновіцца.

**3.** Вядома ж, самага хуткага эфекту дазволіць дабіцца паход да касметолага, бо ў яго руках цэлы арсенал сродкаў барацьбы з цьмяным колерам твару: кіслародныя маскі, маскі з нікацінавай кіслатой, мезатэрапеўтычныя кактэйлі для скуры і інш. Галоўная вартасць наведвання касметолага — усе сродкі падбіраюцца з улікам індывідуальных асаблівасцяў вашай скуры, а значыць, дзейнічаюць хутка і безадмоўна.

**ЦЁМНЫЯ КРУГІ** пад вачамі — распаўсюджаная праблема. Скура вакол вачэй настолькі тонкая, што мы бачым практычна ўсё, што адбываецца пад ёй. Мяшкі, ацёкі — усё гэта надае твару стомлены выгляд. Змагацца з сінякамі вакол вачэй вельмі складана, але паспрабаваць трэба.

**1.** Калі сітуацыя не надта запушчаная, то пазбавіцца ад «сінякоў» можна пры дапамозе кантрасных кампрэсаў. Падрыхтуйце кавалачкі лёду з адвару траў або гарбаты, а таксама ватныя дыскі, змочаныя ў цёплым адвары або гарбаце, і па чарзе прыкладвайце іх да вачэй.

**2.** Змагацца з ацёчнасцю, павышаць эластычнасць скуры і паляпшаць кровазабеспячэнне здольныя дрожджавыя комплексы, трыпутнік і гіялуронавая кіслата — шукайце іх у касметычных сродках.

Для дасягнення аптымальнага эфекту нанясенне крэмаў лепш за ўсё суправаджаць лёгкім самамасажам. Апошні палепшыць кровазварот і абменныя працэсы ў скуры павекаў. Напрыклад, можаце выканаць гэтую працэдуру раніцай, асцярожна масажуючы зону вакол вачэй лёгкім пастукваннем падушачкамі пальцаў (пальцавы душ).

Масаж робіцца пасля ўмывання. Рухацца варта па лініі ніжняга павека ў кірунку ад скроні да пераносся (верхняе павека масажаваць не трэба). Пальцавы душ працягвайце 2—3 хвіліны. Пастукванні і націсканні павінны быць дакладнымі і акуратнымі, каб скура не зрушвалася і не расцягвалася.

**3.** У выпадках, калі хатнія і касметычныя сродкі бяссільныя, смела звяртайцеся да касметолага. Апаратная касметалогія, маскі, ін'екцыі гіялуронавай кіслаты — усё гэта дазволіць у самыя кароткія тэрміны справіцца і з мяшкамі, і з ацёкамі вакол вачэй.

**СУХАСЦЬ СКУРЫ** можа быць абумоўленая адпаведным тыпам скуры, але калі раней вы былі ўладальніцай камбінаванай або тлустай скуры, значыць, вашаму скурнаму покрыву неабходна экстранная дапамога.

**1.** У хатніх умовах можна зрабіць маску з мёду і аўсянкі, а для ўзмацнення яе пажыўнага і танізавальнага ўздзеяння дадайце туды маркоўны сок, настой рамонку і крываўніку, яечны жаўток.

**2.** Лепшы касметычны сродак для сухой скуры — крэм з экстрактамі марскіх водарасцяў, якія ўтрымліваюць мноства мікраэлементаў і тлустых кіслот.

Чым бы вы ні мыліся: мылам або тонікам, наносьце крэм на скуру адразу пасля ачышчэння, пакуль яна яшчэ вільготная. Гэта дазваляе ўтрымліваць вільгаць у верхніх слаях скуры і запавольвае яе выпарэнне. Крэмавая тэкстура ўвільгатняльнага сродку ўзмацняе эфект тоніку, і разам яны прынясуць вашай скуры нашмат больш карысці. А вось нанясенне крэму на сухую скуру асабліва карысці не прынясе, бо крэм не зможа ўтрымаць вільгаць у скуры. Таксама перад нанясеннем крэму можна выкарыстаць тэрмальную ваду.

**3.** Разнастайныя пілінгі і пажыўныя маскі — гэта тое, чым зможа дапамагчы вам касметолаг. Хуткі і ўстойлівы эфект забяспечаны.

**СУХІЯ АБВЕТРАНЫЯ ВУСНЫ** — гэта не толькі непрыгожа, але і непрыемна.

**1.** Масаж пры дапамозе зубной шчоткі і маркоўнага соку або сметанковага масла з соллю вельмі эфектыўны, але рабіць яго трэба рэгулярна.

**2.** Пасля масажу нанясіце на вусны гігіенічную памаду або бальзам.

**3.** Існуюць і спецыяльныя пілінгі з абразіўнымі часцінкамі і фруктовымі кіслотамі для абнаўлення клетак і ачышчэння вуснаў ад змярцвелых лускавінак скуры, а прафесійныя маскі з пантэнолам, алеямі шыпшыны і зародкаў пшаніцы засцерагуць вусны ад раздражнення і высыхання.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

## Дагані мяне, тата!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




@

Усе, хто бывае ў Беларусі і, у прыватнасці, у Мінску, адзначаюць, што ў нас усюды вельмі чыста. Гэтым сапраўды можна ганарыцца. Але вось калі надыходзіць зіма і вуліцы засыпае снегам, узнікаюць пэўныя праблемы. З цэнтральных дарог снег расчышчаюць і прыбіраюць вельмі добра. І дворнікі старанна наводзяць парадак на замацаваных тэрыторыях. І ў гэты час пачынаеш заўважаць, што існуюць невялікія кавалкі тэрыторый, за стан якіх, відаць ніхто не адказвае. Пры ўсёй нязначнасці памераў, яны здольныя прынесці вельмі шмат нязручнасцяў і аўтамабілістам, і пешаходам. Адна арганізацыя пачысціла праезную частку, другая — тратуары. Але каб перайсці на другі бок дарогі на пераходзе, трэба перабірацца праз гурбы снегу, перамешанага з граззю. І нікому ў галаву не прыйдзе пракапаць хоць вузенькую дарожку. Тое ж самае часам адбываецца і з выездам са двара ці скрыжаваннем дарог. Адзін пачысціў дарогу, другі двор — а выезд апынуўся нічыім. І гэты метр снежнай кашы прыносіць столькі праблем… Напэўна, праблема вырашальная, толькі трэба паставіцца да яе па-гаспадарску. І тады хадзіць і ездзіць па нашых вуліцай і зімой будзе гэтак жа прыемна, як і летам.

**Наталля.**

@

Жыллёвае пытанне — самае актуальнае на сённяшні дзень. Кіраўніцтва выканкамаў сцвярджае, што ніякіх праблем пабудаваць жыллё няма. Хочаце будаваць і не чакаць 20 гадоў — глядзіце на стэндзе пералік арганізацый-забудоўшчыкаў, бярыце крэдыт і будуйце сабе. А на практыцы аказваецца зусім не так проста... Патэлефанаваўшы ў некалькі арганізацый з пераліку на стэндзе выканкама, чуеш адказ, што долевага будаўніцтва ўжо няма ці засталіся толькі 3-пакаёвыя кватэры. А вось, напрыклад, на сайце Мінгарвыканкама змешчана інфармацыя, якая даўно ўстарэла. Рэальныя цэны і наяўнасць кватэр рэзка адрозніваюцца ад той інфармацыі, што размешчана на сайце. Многія забудоўшчыкі нават не будуюць з прыцягваннем ільготнага 5-працэнтнага крэдыту. Дык навошта ж тады ўносіць іх у пералік забудоўшчыкаў і адбіраць у людзей час на непатрэбныя тэлефанаванні? Чаму ніхто за гэтым не сочыць, не абнаўляе? Трэба і важна звярнуць увагу на тое, каб уся інфармацыя для людзей была аператыўнай, даступнай і дакладнай.

**Раіса.**

@

Вырашылі з сябрамі выбрацца на навагоднія святы куды-небудзь за горад. Снегу падкінула — можна на лыжах і санках пакатацца, у снежкі пагуляць. Вельмі шмат зараз гавораць пра сельскі турызм, пра аграсядзібы. Мы сутыкнуліся з дзіўнай сітуацыяй. Аказваецца, пераначаваць у вясковай хаце без асаблівых выгодаў значна даражэй, чым у гарадской гасцініцы (я не кажу пра Мінск). А кошт харчавання не саступае рэстараннаму. Думаю, што так быць не павінна. Нават і не ведаю, чым такое патлумачыць — малой прапановай і вялікім попытам, ці наадварот...

**Валянцін.**

# «Падыход да ўсіх дзетак аднолькавы. Падвоз для ўсіх — бясплатны»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**З вёскі Новыя Дарогі Старадарожскага раёна ў рэдакцыю звярнулася Таццяна Іванаўна Пінчук — маці трох дзетак-школьнікаў. Яны вучацца ў Старых Дарогах у СШ №1. Ад вёскі гэта зусім побач, нейкіх дзесяць кіламетраў. Таццяна Іванаўна пыталася: чаму яна мусіць па-ранейшаму аплачваць праезд сваіх дзетак, калі зусім нядаўна на ўсю краіну прагучала, што для школьнікаў будзе бясплатны праезд?**

— У горадзе, у Старых Дарогах, ведаю, школьнікі ўжо ездзяць бясплатна. Чаму ж мы плацім? Раней дзеці з нашай вёскі ўжо вучыліся ў горадзе, потым было нейкае рашэнне, што частка з іх павінна займацца ў навучальнай установе ў бліжэйшым да нашай вёскі населеным пункце. Дык і тады для падвозу выдзяляўся бясплатны аўтобус. А аўтапарку нічога па справе патлумачыць не могуць, — распавяла заяўніца.

**Начальнік аддзела адукацыі Старадарожскага райвыканкама Ніна ПАТОЦКАЯ** вельмі здзівілася гэтаму пытанню.

— З учарашняга дня (размова адбылася ў пятніцу — **С.Р.**) у раёне арганізаваны бясплатны падвоз школьнікаў, дзе ў тым ёсць патрэба, да бліжэйшых навучальных устаноў. Прычым падыход да ўсіх аднолькавы — як да гарадскіх дзетак, так і да вясковых, — патлумачыла ў адказ на наш запыт Ніна Уладзіміраўна. — Калі гаварыць пра згаданую вёску Новыя Дарогі, з яе бясплатна возяць частку дзяцей у бліжэйшую навучальную ўстанову ў суседняй вёсцы, а таксама — у горад да СШ №1. Задзейнічаны ў гэтым усе магчымыя віды аўтатранспарту: і гарадскія аўтобусы, і прыгарадныя, і аўтобусы вучэбна-вытворчага камбіната. Таму не разумею, чаму да вас звярнуліся. Магу толькі меркаваць, што выкананне рашэння аб бясплатным падвозе школьнікаў павінны былі давесці да ведама бацькоў і кантраляваць гэты працэс і ў тым жа аўтапарку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ВІЦЕБСК ПАЗНАЁМІЎСЯ З ІЗРАІЛЕМ

**У Віцебску з размахам прайшоў Дзень Ізраіля.**

Цікавыя мерапрыемствы выклікалі ў многіх гараджан шчыры інтарэс. У прыватнасці, фонд бібліятэкі іншаземнай літаратуры папоўніўся кнігамі, якія прывезлі ў падарунак паслріннікі Ізраіля. Студэнты — будучыя медыкі — паслухалі лекцыю пра медыцыну гэтай краіны, якая па сваіх дасягненнях і ўзроўні абслугоўвання пацыентаў лічыцца адной з самых лепшых у свеце. А студэнты Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. Машэрава на тэматычнай лекцыі пазнаёміліся з тым, чаго дабілася краіна, дзе шмат выхадцаў з Беларусі.

У музеі Марка Шагала адкрылася выстава рытуальных падсвечнікаў. Таксама ў горадзе былі прадстаўлены выстаўкі фотаздымкаў, якія знаёмяць з тымі, кім ганарыцца краіна.

Нават на вуліцы можна было на час «перанесціся» ў Ізраіль: адразу на дзвюх плошчах з вялікіх экранаў увечары дэманстравалі фільм.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Роздум выбаршчыка

# «КАЛІ НАРОД ЛЕПШЫ Ў СВЕЦЕ...»

**Кандыдаты ў прэзідэнты двойчы выступілі на тэлебачанні, іх праграмы былі надрукаваныя ў дзяржаўных газетах і нават была спроба правесці тэледэбаты. Выбаршчыкі мелі магчымасць убачыць і пачуць усіх прэтэндэнтаў на пасаду прэзідэнта.**

Праграмы кандыдатаў не маюць прынцыповых адрозненняў і ў многім пераклікаюцца. Але каб яны здзейсніліся...

Дзевяць кандыдатаў выступалі адзіным фронтам. Некаторыя з іх былі настроены ваяўніча, іншыя ж вялі сябе больш памяркоўна, але іх атака была накіравана на сённяшняга Прэзідэнта Беларусі, што і зразумела.

Хачу звярнуць увагу на адну акалічнасць. Апаненты змагаюцца не толькі з А. Лукашэнкам, а і з сістэмай улады, якую ён стварыў. Між тым сістэма прыйшлася грамадству па душы, а галоўнае, яна, на сёння, аказалася дзеяздольнай.

За кандыдатамі ў прэзідэнты няма ўплывовай сілы, якая магла б супрацьстаяць уладзе. Некалькі даволі аморфных партый, ад імя якіх выступаюць некаторыя кандыдаты, не могуць уплываць на сітуацыю. Апаненты Аляксандра Лукашэнкі нагадваюць «робін гудаў, якія кінулі выклік каралю».

Чую заўвагу: «А на тых, першых, выбарах А. Лукашэнка перамог сістэму?» У 1994 годзе старая (савецкая) сістэма ўлады распаўзлася, а новая знаходзілася ў падвешаным стане — не ведалі, адкуль вецер падзьме.

Падчас выступаў некаторыя кандыдаты называлі беларусаў лепшым народам у свеце, вялікім народам... А калі так, то застаецца толькі выбраць лепшага ў свеце прэзідэнта і тады зажывём лепш за ўсіх на свеце. Так?

А пакуль што прэтэндэнты найчасцей успаміналі Польшчу, дзе сярэдні заробак 1500 долараў. А вось чаму лепшы ў свеце народ не атрымлівае такой зарплаты, то вінаваты ў гэтым... Але, на мой погляд, за лепшае было б параўнанні праводзіць не з краінамі Еўрасаюза, а з тымі, якія ўтварыліся на прасторах былога Саюза — гэта будзе больш аб'ектыўна. З Расіяй праводзіць паралелі не выпадае, бо краіна мае неабмежаваныя прыродныя рэсурсы, і нафта з газам дазваляюць затыкаць дзіркі ў эканоміцы. Паглядзім на Украіну, якая прайшла праз «аранжавую рэвалюцыю», атрымала дэмакратыю, краіну вітаюць Еўрасаюз і Амерыка, а народу жывецца не вельмі. І хіснуўся ўкраінскі выбаршчык ад «аранжавых» да «блакітных»... Адзін з беларускіх кандыдатаў у прэзідэнты заявіў, што ўсе ўкраінскія праблемы ад таго, што кіраўніцтва ў Кіеве не мела праграмы. Вось была б у іх мая...

Адна з праблем, з якой сутыкнулася ўкраінская грамадскасць, — гэта слабасць улады. Успомнім, што прэзідэнта В. Юшчанку парламент абмежаваў у паўнамоцтвах, а прыйшоў да ўлады В. Януковіч і вярнуў страчанае. Чаму?

Яшчэ нядаўна нашы тэлегледачы бачылі, як у Кіеве мітынгавалі прадпрымальнікі. Справа ў тым, што ўрад спрабуе навесці парадак у гэтай галіне эканомікі. В. Януковіч кажа: «Падаткаў не плацяць, а іх дзяцей вучыць трэба, лячыць трэба, пенсіі плаціць трэба...» (здаецца, мы ўжо гэта прайшлі). А хіба ў Амерыцы ўсё ідзе самацёкам? Паспрабуй там не заплаціць падаткі!

Мне даводзілася бываць у Херсоне (там жылі бацькі жонкі) і бачыць поўную свабоду ў гандлі. На абочыне дарогі, на кардоне прадавалі хлеб, і на гэта ніхто не звяртаў увагі. У Еўропе, як і ў нас, такое немагчыма.

Я не веру, што наш чалавек можа пераасэнсоўваць усе перавагі дэмакратыі — для гэтага патрэбны час, эвалюцыйны перыяд. І калі асобны кандыдат у прэзідэнты сцвярджае, што беларусы пасля 20 снежня (пасля выбараў) будуць свабоднымі, то пакінем гэта на яго сумленні. Свабода — гэта форма жыцця і ўнутраны стан чалавека. Ці многія з нас адчуваюць сябе грамадзянамі — духоўна свабоднымі людзьмі? Няхай мы і вялікі народ, але яшчэ круцім галовамі, азіраемся, бо не ведаем, дзе жывём.

Працягнем размову пра сістэму ўлады. На адной расійскай тэлестудыі быў наладжаны тэлемост з Грузіяй. Цікава было паслухаць, што кажа адзін бок, а што другі. Я зразумеў, што прэзідэнт Грузіі М. Саакашвілі застаўся пры ўладзе і выйграў паўторна выбары, бо здолеў навесці ў краіне парадак, народ давярае паліцыі, зніклі ці затаіліся бандыцкія групоўкі... А без моцнай улады такое немагчыма было б. Успомнім, што нават 100-тысячныя мітынгі апазіцыі, выступленні вайскоўцаў не здолелі пахіснуць пазіцыі грузінскага прэзідэнта.

Калі прэтэндэнт на пасаду прэзідэнта заяўляе, што ўсю вертыкаль неабходна выбіраць, то ўспамінаюцца часы, калі перад распадам Саюза на прадпрыемствах выбіралі дырэктараў. А закончылася тая кампанія поўным правалам, бо калектыў, найперш, галасаваў не за прафесіяналаў, а за «сваіх хлопцаў».

Выбіралі мясцовую ўладу і ў Расіі. І як ні дзіўна, часам людзі аддавалі перавагу бандытам. Размовы пра самакіраванне, сабornасць... наводзяць на сумныя разважанні. Некалі, пры царах, калі трэба было выбраць старасту ці дэпутата, то перамагаў той, хто не шкадаваў грошай на гарэлку — выкаціў бочку і перамог.

Пакуль чалавек не ўсвядоміць сябе грамадзянінам, ён падобны да аблуднай авечкі, якая можа ўцячы ў любыя прыадчыненыя вароты.

Аляксандр Лукашэнка не мой кумір, але я часам задаю сабе пытанне: «А што было б з Беларуссю, каб на тых першых выбарах перамог не Лукашэнка, а яго канкурэнт?» І каму б я ні задаў гэтае пытанне, адказ адзін — Беларусі быў бы поўны «кірдык».

Без сістэмы ўлады не можа існаваць ніводная краіна. Іншая справа — якім прыярытэтам у той краіне аддаецца перавага. У Паўночнай Карэі таксама сістэма. Беларуская ж мадэль уключана ў еўрапейскія інтэграцыйныя працэсы, і тут нічога немагчыма змяніць. Іншая справа, што гэтыя працэсы могуць быць запаволеныя, палавінчатыя, але яны непазбежныя. Беларусі лёсам наканавана быць у Еўропе.

Праўда, некаторыя кандыдаты ў прэзідэнты адарваліся ад рэалій нашага жыцця. Няхай наш народ і самы лепшы ў свеце, а ці не атрымаецца, што пасля люстрацыі, якую хацеў бы правесці Р. Кастусёў, шэрагі яго партыі парадзеюць... Ды і каб распусціць КДБ, неабходна стварыць новую структуру, а прафесіяналаў давядзецца набіраць зноў жа сярод учарашніх чэкістаў.

Крыху дзіўна, што партыя БНФ знаходзіцца ў закансерваваным стане, бо больш чым дваццаць гадоў таму падобныя заклікі выбаршчыкаў не зацікавілі.

А другі кандыдат на пасаду прэзідэнта, В. Рымашэўскі, з юначым запалам ухваляе краіну-утопію, у якой грамадства будзе жыць па хрысціянскіх прынцыпах. За дзве тысячы гадоў так і не з'явілася краіна, у якой «не кралі б і не жадалі чужую жонку». А што датычыць Божых запаветаў (чаму хрысціянскіх?), то ў мяне яны свае: калі ты не цэніш чужое жыццё, то і твайму грош цана; калі бацькі кінулі цябе — забудзь іх; на дабро адказвай дабром; хочаш пакаяцца — ідзі да пракурора...

А некаторыя кандыдаты яўна «перагнулі палку». Калі адзін з іх абяцае, што праз пару гадоў пры ім рубель будзе раўняцца долару, то разумееш — гэта чысты папулізм. Справа не ў суадносінах валют, а ў стане эканомікі краіны. У Латвіі адзін лат быў нават даражэй за долар, а закончылася тым, што гэтую краіну ратавалі ўсім Еўрасаюзам.

У кожнага кандыдата ёсць вялікае жаданне стаць Прэзідэнтам Беларусі, але каб сесці ў крэсла кіраўніка, жадання мала. Нават самы лепшы ў свеце народ глядзіць на жыццё прагматычна — яго цікавяць не словы, а рэчаіснасць. Менавіта яна і будзе вызначаць шлях нашай краіны.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## ГОМЕЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**13 января 2011 г. проводит открытый аукцион по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле**

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение – строительство | Качество земли | Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий. Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ | Срок аренды, лет | Затраты на подготовку документации, бел. рублей | Начальная стоимость, бел. рублей | Сумма задатка, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | микрорайон № 18 | 340100000001004833 | 0,8091 | детского сада | к землям сельскохозяйственного назначения не относятся | Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Участок ограничений в использовании не имеет. | 50 | 1 779 404 | 892 177 857 | 89 217 780 |
| 2 | ул. Советская, в микрорайоне № 22 | 340100000001004834 | 0,0460 | здания магазина «Детский мир» | | Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничение в использовании: охранная зона газопровода, канализации – 0,0075 га. | 50 | 1 606 430 | 40 781 582 | 4 078 150 |

1. Организатор аукционных торгов – управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008г. № 462. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по каждому объекту в натуре.

3. **Аукцион состоится 13 января 2011 г. в 15.00** в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, при наличии не менее двух участников на каждый лот.

4. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию следующие документы: заявление по установленной форме; заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка в размере, указанном в извещении, на р/с 3642402000239 в филиале 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, МФО 151501661; УНП 400251518, управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома. Кроме того представляют:

4.1 Представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

4.2 Идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования.

4.3 Представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность.

4.4 Представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители иностранного юридического лица или гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

4.5 При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители юридических лиц и граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

5. Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона. Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия Гомельским горисполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка.

6. Горисполкомом может предоставляться рассрочка на срок не более 3 лет, в случаях когда размер платы за право заключения договора аренды земельного участка превышает 2 000 базовых величин для граждан и индивидуальных предпринимателей и 10 000 базовых величин для юридических лиц. Плательщик, претендующий на получение рассрочки, до принятия горисполкомом решения о предоставлении земельного участка в аренду должен обратиться в горисполком о предоставлении ему рассрочки.

7. Документы для участия в торгах принимаются по рабочим дням **с 9.00 до 16.00 по 06 января 2011 г.** включительно в управлении коммунальной собственности и приватизации горисполкома по адресу: ул. Советская, 21а (каб. № 4).

Заключительная регистрация участников аукциона с 14.00 до 14.45 в день аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, каб. № 4.

**ВНИМАНИЕ! С аукциона, который состоится 24 декабря 2010 года, СНИМАЕТСЯ ЛОТ № 8.**

**Контактные телефоны: 77 69 35; 77 67 27, факс: 77 48 85. Наш сайт – www. gorod.gomel.by**

# Zамор'е

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

## ТАТУІРОЎКІ ЗА ЗДАРОВАЕ ЖЫЦЦЁ



**Навукоўцы з Паўночна-Усходняга універсітэта ЗША стварылі ўнікальныя датчыкі ў выглядзе татуіровак, якія будуць сачыць за здароўем людзей.**

Пакуль што, праўда, даследчыкі працуюць з жывёламі — уводзячы тым пад скуру драбнюткія полімерныя часціцы—нанасэнсары. Пры недахопе ў арганізме натрыю — жыццёва важнага рэчыва, якое падтрымлівае нармальны кровазварот, — датчыкі-татуіроўкі пачынаюць свяціцца: чым менш канцэнтрацыя натрыю, тым ярчэйшай робіцца тату. Справа ў тым, што пры стварэнні «разумных» татуіровак выкарыстоўваюцца рэчывы, здольныя распазнаваць наяўнасць натрыю і свяціцца, калі яго ўзровень нізкі.

Як адзначаюць аўтары працы, аналагічны метад можна выкарыстаць і для вымярэння ўзроўня глюкозы ў крыві. Цяпер хворыя на цукровы дыябет вымушаныя пастаянна здаваць кроў для кантролю за канцэнтрацыяй глюкозы. А з падскурнымі нанасэнсарамі гэтай непрыемнай працэдуры можна будзе пазбегнуць — трэба толькі абнаўляць «чарніла» тату раз на тыдзень.

## ЁЛАЧНЫЯ ГІРЛЯНДЫ З... РЫБЫ

**У акіянарыуме японскага горада Камакура знайшлі практычнае ўжыванне энергіі, якую выпрацоўвае электрычны вугор.**

Супрацоўнікі акіянарыума ператварылі гэтую рыбу ў крыніцу электрычнасці для гірлянды на калядная ёлцы, змешчанай у холе ўстановы. Вугор выпрацоўвае энергію падчас руху, электрычнасць назапашваецца і перадаецца гірляндам на двухметровай калядная ёлцы з дапамогай алюмініевых панэляў, якія выконваюць ролю размеркавальнай прылады. Супрацоўнікі акіянарыума лічаць такое рашэнне вельмі арыгінальным і экалагічным. Дарэчы, адзін з наведвальнікаў адзначыў, што выкарыстаць электрычную энергію, якую выпрацоўваюць вугры, магчыма і ў хатніх умовах. І гэта было б практычна і зручна.

## ПІНЖАК НА ДРАЖДЖАХ



Дызайнер Сьюзан Лі стварыла незвычайны пінжак: ён зроблены з сумесі дрожджэй, бактэрый і падсаладжанай зялёнай гарбаты. Калі гэтая сумесь яшчэ вільготная, гнуткім лістам можна надаць абсалютна любую форму. Дэталі адзення злучаюцца без швоў — дастаткова толькі моцна прыціснуць іх адна да адной. Пасля таго, як лісты высахнуць, атрымліваецца тканіна, якая крыху нагадвае папірус.

## ДЫДЖЭЙ ДЛЯ ТЫХ, КАМУ ЗА 70

**70-гадовая Рут Флаўверс з Брыстоля, вядомая пад псеўданімам DJ Mamy Rock, пайшла ў дыджэі ўсяго год таму і амаль вокамгненна набыла папулярнасць. Напачатку новая дыджэй спачатку заваявала клубы роднай Брытаніі, потым рушыла на Францыю, а далей вырашыла скарыць Нью-Ёрк.**



Новае захапленне Рут Флаўверс узяло пачатак год таму, пасля таго,



як бабуля ўпершыню патрапіла ў клуб на дзень нараджэння свайго ўнука. У той вечар выкідалы нават не хацелі пускаць жанчыну з-за яе сталага ўзросту. Хто ж ведаў, што праз год гэтая пажылая лэдзі заваюе лепшыя танцпляцоўкі свету? «Як толькі я ўвайшла, я зразумела як мне тут падабаецца. І падумала: а чаму б мне гэтым не заняцца? — узгадвае Рут сваё ўражанні. — Мой муж памёр, я на пенсіі — часу хапае». Раскручваць сівавалосую DJ Mamy Rock узяўся адзін з лепшых прадзюсараў Францыі, 28-гадовы Арэльен Сімон. Пасля заваявання лепшых клубаў Еўропы і засваення сацыяльных сетак зорная бабуля-дыджэй накіравалася ў Штаты. Падчас свайго летняга тура па клубах Каліфорніі ў адной з мясцовых студый яна запісала сінгл пад сімвалічнай назвай «69». На пытанне, як доўга яна збіраецца займацца дыджэінгам, Mamy Rock заявіла, што пакуль у чалавека ёсць досыць энергіі і жадання займацца ўлюбёнай справай, то спісваць яго з рахункаў яшчэ вельмі рана.

## ПРАПЛЫЦЬ 1500 КМ... У ПОШУКАХ ГАРЭЛКІ

**Гэта аказалася «не слаба» траім падлеткам, якія адплылі са свайго роднага атола Атафу (частка тэрыторыі астравоў Такелаў, якімі кіруе Новая Зеландыя). У той дзень на беразе разгарнулася вялізная вечарынка, а запасы алкаголю хутка скончыліся. Тады хлопцы — 14-гадовы Эдвард Насау і яго прыяцелі Самуэль Перэс і Філо Філо — і адважыліся паплыць на «вялікую зямлю», каб папоўніць бар. Але ў прыцемках падлеткі дэзарыентаваліся і ўзялі няправільны курс, у выніку чаго заблукалі.**

Падчас плавання, якое доўжылася без малога 50 дзён, хлопцы забаўлялі адзін аднаго размовамі пра ежу і купанне, але як мага больш часу яны стараліся спаць, каб не марнаваць энергіі. Калі падлеткаў знайшлі рыбакі, якія плылі ў новазеландскі Окленд, тыя знаходзіліся ўжо ў 1,5 тысячы кіламетраў ад Атафу. Хлопцаў забралі на рыбалавецкае судна і даставілі ў сталіцу Фіджы — горад Суву, адтуль перапраўілі ў Самоа, а далей на лодцы даставілі да Такелаў. Родныя былі так узрадаваныя, што падлеткі жывыя і здаровыя, што нават не адчыталі іх. Затое мясцовыя ўлады выказалі спадзяванне, што гэтыя падзеі паслужаць добрым урокам як для саміх «герояў», так і для ўсіх іх аднагодкаў.

## ВЫЙШАЎ БЕГЕМОЦІК ПАГУЛЯЦЬ

**Жыхары пасёлка Плаўніца на поўдні Чарнагорыі адрозніваюцца ад іншых еўрапейцаў тым, што могуць знайсці паблізу свайго дома або ў садзе двухтоннага бегемота, які спакойна сабе гуляе. Сяляне ўжо добра знаёмыя з насельніцай мясцовага заапарка — 12-гадовай самкай па мянушцы Нікіца, якая праславілася неаднаразовымі ўцёкамі з вальера, і ставяцца да яе без асцярогі.**

Нікіца збягае не ад дрэннага жыцця — у заапарку ёй адведзеная даволі прасторная тэрыторыя, а таксама забяспечаныя добры догляд і кармленне. Аднак калі ў гэтай частцы краіны здараюцца паводкі, як было, дарэчы, у студзені гэтага года, бегемоціха — выдатная плыўчыха — без цяжкасцяў перасякае затопленую загародку вальера і па вадзе возера (Скадарскае возера — гэта мясцовая славутасць) дабіраецца да пасёлка. Жывёла патрапіла ў фотааб'ектыў на адлеглацсі чатырох кіламетраў ад уласнага «дома». Ні ўладальнік заапарка, ні жыхары Плаўніцы нават не хвалююцца: бегемоціха, якая жыве ў Чарнагорыі ўжо дзесяць гадоў, адрозніваецца рахманым міралюбным норавам.



## ДЗЯГЦЯРНЫЯ РЭКІ З АЛМАЗНЫМІ БЕРАГАМІ

**Планету з надзвычай высокай канцэнтрацыяй вугляроду адкрыла група амерыканскіх і брытанскіх астраномаў.**



Сёння навуцы вядома больш за 500 так званых экзапланет, г. зн. планет, змешчаных за межамі нашай Сонечнай сістэмы. І толькі зусім нядаўна навукоўцам сталі даступныя прылады і метады аналізу, якія дазваляюць зрабіць першыя крокі на шляху да разумення іх складу. Планета, аб якой ідзе гаворка, — Wasp 12b — першая з вядомых, на якой вугляроду больш, чым кіслароду. Гэта газавы гігант, падобны да Юпітэра; па большай частцы ён складаецца з вадароду ў газападобным стане. Аднак ядро планеты, верагодна, уяўляе сабой сумесь дыяментаў, графіту і іншых вугляродных структур, магчыма, вадкіх.

Адкрыццё дазваляе выказаць здагадку, што ў нашай Галактыцы могуць існаваць і іншыя планеты памерам з Зямлю. На гэтай планеце дыяментаў можа быць столькі, колькі на Зямлі пяску. Пры гэтым вады на такіх планетах будзе зусім няшмат. Замест яе — калі тэмпература досыць высокая — іх паверхня павінна складацца з багатых вугляродам кампазітаў — такіх, як дзёгаць.

# У якім узросце паляцеў у космас ГАГАРЫН?

## АЛЯКСАНДР МАЦЮШЭНКА АДКАЗАЎ ПРАВІЛЬНА І ВЫЙГРАЎ 50 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ

**У праграме «Адзін супраць усіх» (АНТ) у трэці раз разыгралі 50 мільёнаў рублёў. Мінчанін Аляксандр Мацюшэнка стаў трэцім удзельнікам у гісторыі тв-шоу, якому ўдалося выйграць максімальную суму праекта.**

**— Пасля эфіру мой тэлефон проста разрываўся ад званкоў, — прызнаецца «Звяздзе» шчаслівы пераможца. — Сябры, калегі, родныя, знаёмыя — некаторых я не чуў па 20 гадоў...**

**Карэспандэнту «Звязды» Аляксандр Мацюшэнка расказаў, як паступаў у ВНУ без іспытаў, як выпадкова выйграў у латарэю матаролер «Вятка» і пра тое, чаму лічыць снежань сваім шчаслівым месяцам.**






**АНКЕТА ЎДЗЕЛЬНІКА:**
**Хобі:** кнігі, газеты, унучка
**Якія самыя адважныя ўчынкі здзяйснялі:** ажаніўся
**Якую суму хацелі б выйграць у нашай гульні:** ад 10 млн
**На што плануеце патраціць выйгрыш:** на сям'ю
**Напішыце Ваш любімы анекдот:**
*Бландзінка пры анкетаванні пытае: «А як правільна пісаць — Ірак ці Іран?»*

### 3 жыцця:
### любімы прадмет — матэматыка

Яшчэ школьнікам Аляксандр Сяргеевіч праяўляў выдатныя матэматычныя схільнасці:

— Да восьмага класа я вучыўся на адны пяцёркі. Вучоба давалася лёгка, па ўсіх прадметах паспяваў. Хіба што хімію не надта любіў, затое матэматыку ведаў шыкоўна — хатняе заданне на пераменках рабіў. Таленавітым быў хлопцам...

Ва ўніверсітэт юнака бралі без іспытаў: газета «Знамя юности» сумесна са сталічным універсітэтам праводзіла матэматычны конкурс, у якім прапаноўвалася рашыць 13 задач. Пераможцы маглі быць залічаныя ва ўніверсітэт.

— Каб перамагчы, трэба было адолець 10 задач. Я рашыў 12 з 13 прапанаваных заданняў. Неўзабаве мне прыйшоў ліст з БДУ — вы залічаны без іспытаў на першы курс матфака... Але я не паехаў: куды мне, звычайнаму вучню з Лепельскага раёна — ды ў сталіцу?

Пакуль жа «звычайны вучань з Лепельскага раёна» заканчваў школу. І скончыў яе, маючы 5 (!) спартыўных разрадаў. Першы разряды па шахматах і па футболе, разрад па настольным тэнісе, баскетболе і ручным мячы.

### 3 гульні:
### «Проста пачаў успамінаць, разважаючы лагічна»

— Адказу на пытанне пра Гагарына я дакладна не памятаў. Я проста пачаў успамінаць, разважаючы лагічна. Варыянт «30 гадоў» — адкінуў адразу. Я памятаў, што юбілей Гагарына нядаўна адзначаўся, але які? 70 гадоў? Калі так, то Гагарын павінен быў нарадзіцца ў 1940-м. Выходзіць, у космас ён паляцеў 21-гадовым юнаком? Не, быць такога не магло. Значыць, юбілей 75 гадоў. Хуценька ў галаве пракруціў (матэматыка, нагадаю, мой лепшы сябра) — год нараджэння 1935. Значыць, у космас паляцеў у 26 гадоў. Але такога варыянта не было, быў толькі варыянт 27. Значыць, ён і ёсць правільны. Значыць, у канцы снежня 2009-га пра юбілей і ўгадвалі — Гагарыну споўнілася б 75 гадоў. А гэта азначае, што першы касманаўт нарадзіўся ў 1934 годзе. 1961-34=27 гадоў. Гэты варыянт я і націснуў.

### 3 жыцця:
### «У латарэю я выйграў матаролер, але за гэтыя грошы мне купілі магнітафон, а старэйшай сястры — паліто...»

— Мой бацька — ваенны. Таму хоць я і нарадзіўся ў Мар'інай Горцы, паспеў павучыцца ў школах Асіповічаў, Бабруйска, Лепельшчыны, Барысава... У класе пятым, кіруючыся бацькавым прыкладам, я нават збіраўся паступаць у сувораўскае вучылішча, каб таксама стаць ваенным.

У выніку Аляксандр паступіў... на факультэт фінансаў. Прычым зусім выпадкова.

— Сустрэў неяк таварыша. Ты дакументы здаў? Здаў. Куды? У наргас. Які факультэт? Фінансаў. Пойдзем, і я здам. Пайшоў, здаў іспыты і паступіў. Вучыцца было вельмі цікава. Школа для вучобы і для жыцця. Шыкоўныя былі выкладчыкі.

У латарэю наш герой гуляў толькі аднойчы — гэта была латарэя ДТСААФ.

— Мой знаёмы адказваў за распаўсюджванне гэтых білетаў. І яму патрэбны былі тры рублі. У мяне не было, ён і кажа: купі білет. Я ў бабулі пазычыў і купіў білет. Які жа было маё здзіўленне, калі я... выйграў матаролер «Вятка». Матаролер ацэньваўся ў 350 рублёў, што па тых часах — вялікія грошы. Таму, вядома, наша сям'я ўзяла грошы. З іх мне купілі магнітафон, а старэйшай сястры паліто. І ўсе былі шчаслівыя.

Пра ўдзел у расійскай перадачы «Хто хоча стаць мільянерам» Аляксандр ніколі не задумваўся. А вось «Свая гульня», якую некаторы час транслявалі па ТБ, яму падабаецца.

— Сёння я вельмі люблю разгадваць крыжаванкі, найбольш судоку, — распавядае навяўлены мільянер. — І хоць мне ўжо 60 гадоў, я не ўяўляю сябе без працы. Таксама шмат чытаю. Відаць, у мяне добрая памяць. Увогуле, магу размаўляць з любым чалавекам на любыя тэмы.

### 3 гульні:
### «Як можна, адказаўшы на тры пытанні, забраць грошы і сысці — дзе тут эрудыцыя?»

— Неяк па АНТ я ўбачыў адзін з выпускаў перадачы «Адзін супраць усіх». Тады там былі яшчэ старыя правілы, калі можна было ўзяць джокер і не адказваць. Адзін з удзельнікаў адказаў на першае пытанне, на другое (яны звычайна лёгкія) — узяў джокер, на трэцяе — яшчэ адзін джокер, на чацвёртае — зноў джокер...І набраўшы 5 мільёнаў, ён вырашыў забраць грошы і сысці. Мяне ажно злосць узяла: як можна, адказаўшы на тры пытанні, забраць грошы і проста сысці — дзе тут эрудыцыя?!

Жонка мне кажа: ты ж у нас шмат ведаеш, дык ідзі — праяві эрудыцыю, калі такі разумны. Жончын пляменнік дапамог мне падаць заяўку. Прайшоў некалькі тураў і быў запрошаны на гульню ў студыю.

Ужо пасля эфіру, калі званіў жонцы, яна з трэцяга разу толькі зразумела — ніяк не магла паверыць. Пасля пазваніла дачцэ, а тая расказала ўнучцы: «Дарынка, дзядуля выйграў 50 мільёнаў». Маё дзіцятка адразу і заплакала.

Я вельмі люблю сваю ўнучку. Яна вучыцца ў школе з музычным ухілам, іграе на скрыпцы, прыгожа спявае, выдатна малюе. Памятаю, аддалі яе першы раз у лагер. Баяліся, як яна там будзе. А пасля наша Дарына прыязджае — яна і «міс атрада», і «віцэ-міс лагера», і там конкурс выйграла, і сям першая была... Мне здаецца, яна ў мяне пайшла.

* * *

— Пераглядзеўшы сёння запіс, заўважыў, што вельмі хваляваўся на першых пытаннях — мяне трэсла. Вядома, калі прыходзіш і на цябе скіраваныя дзясяткі вачэй, свецяць сафіты, а насупраць — Калдун, цяжка не хвалявацца. Але пасля ўзяў сябе ў рукі, супакоіўся. Нават калі ведаў адказ, я стараўся паразважаць, каб лішні раз сябе пераканаць. Што яшчэ мне дапамагло — папярэдне я шмат назіраў і ўнікаў у гэту атмасферу. І безумоўна, быў сабой. Бо добры ты ці не, вясёлы ці не — будзь сабой, толькі тады ў цябе ўсё атрымаецца.

Увогуле снежань — шчаслівы для мяне месяц: 19 снежня першы раз я спаткаў сваю будучую жонку, 16 снежня — унучка нарадзілася, 4 снежня — прайшоў эфір...

**Ілья ЛАПАТО.**
**Фота прэс-службы тэлеканала АНТ.**

**АЛЕСЬ Макоўскі больш вядомы як журналіст. Прайшоў усе ступені айчыннай журналістыкі ад міжраёнкі да супрацоўніка Нацыянальнага прэс-цэнтра. Працаваў у «Чырвонай змене», «Вожыку», рэдагаваў часопіс «Служба быту Беларусі». Мастацкія творы пачаў пісаць ужо ў сталым узросце. Але яму адразу ж «адбілі рукі». Не паверылі ў яго самабытнасць, адметнасць адчування глыбіннага роднага слова, у яго зрок і слых. Замоўк амаль на чвэрць стагоддзя. Але тое, што маеш, не страціш. Узяўся зноў за пяро. А якое яно ў пісьменніка, аўтара двух зборнікаў — гумарэсак і нарысаў — мяркуйце самі.**

**Віктар КАЗЬКО.**

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Алесь МАКОЎСКІ

# ДЗЯДЫ І ЎНУКІ

НЕ любіць Васілёк днём спаць, хоць ты яму вочы на вузельчык завяжы. А бабуля кожны раз пасля абеду ўпрошвае: «Паспі, унучак, паспі крышку, большы вырасцеш». І дзед за ёй паўтарае: «Гадзінку падрамі, унук, дужы будзеш, у салдаты пойдзеш».

А Васілёк і так вымахаў за лета на сем сантыметраў. Як прыехаў вясною з горада ў вёску, дзед Мікіта паставіў унука да вушака дзвярэй і зрабіў засечку над галавою — адзначыў ягоны рост. Пазаўчора прыхіліўся Васілёк да таго ж вушака — дзед ажно ахнуў. Як на дражджах, кажа, расцеш. «Прыедуць тата з мамаю, абрадую іх, — думае хлопчык. — Скажу, што вырас на дзесяць сантыметраў. Да выхадных жа яшчэ тры дні, паспею на тры сантыметры падрасці».

Лёг хлопчык у ложак, але спаць і не думае. Во, певень закукарэкаў. Гэта ён, мабыць, чубатку заве. Васілёк яе сёння таксама шукаў, а яна нібы скрозь зямлю праваліліся. Бабуля так сказала. Пасля яны ўжо шукалі чубатку ўсе: Васілёк, дзядуля і бабуля.

Гэтая чубатка нейкая дзіўная. Тупнеш нагою, махнеш рукамі на курэй — усе ўцякаюць, разбягаюцца, а яна крылы растапырыць, галаву ўтуліць, сядзе і сядзіць. Падыходзь да яе і бяры. Васілёк так і робіць. Толькі глядзіць, каб дзед з бабуляй не бачылі. Патрымае трошкі ў руках ды і пусціць. Чубатка пабяжыць адразу да сваіх сябровак. Праўда, певень на чубатку скасавурыцца. Вось і певень днём не спіць. І яму, Васільку, не надта хочацца. Лепш паслухаць, пра што дзед з бабуляю за перагародкай ціха гамоняць.

— Такая харошая курачка была, — кажа бабуля. — Дзе ж яе нячыстая носіць?

— Угу, — кажа дзед. — Цяжкая. Унук наш наўрад ці падняў бы яе.

Васілёк ляжыць і ўсміхаецца сам сабе: «Яшчэ як падымаў! І не раз...»

— А можа, каршун, не дай Бог, задраў чубатку? — кажа бабуля.

— Ды не чуваць было гвалту. Куры крычалі б. Хаця... Пачакай... Пачакай... Унук жа мне паказваў... Схаджу ўсё-такі пагляджу...

Дзед загрукаў чаравікамі па падлозе, лязнуў дзвярыма і пайшоў. Васілёк хуценька падняўся з ложка, падбег да акна, прытуліўся носам да шыбы: дзед шыбаваў да старой вярбы. Той самай, ля якой ён, Васілёк, сёння ўпершыню ўбачыў каршуна. А было ўсё так.

Васілёк без боязі намачыць сандалі і ногі шмыгнуў да плота, уздоўж якога расла густая садовая маліна. Незаўважна, ад кусціка да кусціка, цярэбячы галінкі маліны, дайшоў да канца плота і тут, пад вярбою, якая расла ў раўку метраў пяцьдзясят ад дзедавых сотак, убачыў вялікую птушку. Яна растапырыла чорныя крылы і штосьці шкамутала доўгай дзюбай.

Васілёк вырашыў паклікаць дзеда. Няхай і той падзівіцца на незвычайную птушку. Дзядуля спачатку не надта паверыў, але, пабачыўшы ўзрушанасць унука, пагадзіўся пайсці з ім.

Цяпер яны ўжо абодва сядзелі на кукішках і праз штыкетнік сачылі за познім сняданкам дзіўнай птушкі.

— Гэта, унучак, каршун, — тлумачыў дзед. — Ён вельмі хітры і асцярожны. Да вуглоў прылятае, каб пажывіцца чымнебудзь смачным...

— А што ён дзяўбе? — пацікавіўся Васілёк.

— Ну, можа, костку ці падлу якую. Там жа, унучак, хоць я і сваруся, людзі скідваюць рознае смецце... Зараз мы яго прагонім.

Дзед падняўся ва ўвесь свой невялікі рост і моцна крыкнуў: «Ах-х-х ты, злодзей!..» Васілёк таксама закрычаў, але каршун, мусіць, яго ўжо не чуў. Адпіхнуўшыся ўчэпістымі моцнымі нагамі ад зямлі, замахаў доўгімі, вузкімі, выгнутымі крыламі, растапырыў хвост і нізка, над яшчэ не зжатым жытам, павеславаў да лесу. Васілёк прыкмеціў: каршун толькі зверху чорны, а знізу ён шэры-шэры.

— Наеўся, халера на яго. Ледзьве ад зямлі адарваўся, — падзівіўся дзед. — Нешта ж упаляваў...

Васілёк ціхенька стаяў каля акна, чакаў, пакуль дзед сходзіць да вярбы і вернецца назад. І-такі дачакаўся. Дзядуля ішоў спакваля, сумны, бо ў правай руцэ перад сабою трымаў за нагу... чубатку. Дакладней тое, што засталося ад яе. Васілёк хуценька падбег да ложка і слізгануў пад коўдру — далей ад бяды. Дзед увайшоў у хату, на кухні завойкала бабуля.

— Вой, вой... Усё-ткі каршун увабраў, — забедавала старая. — Такая нясушка была. Ты, бацька (так бабуля называе дзеда), увесь час на вуліцы быў. Няўжо нічога не чуў і не бачыў?

— Не чуў. Касу кляпаў, — апраўдваецца дзед.

— Гэта ж каб зарэзалі курачку, лічы, на цалюткі тыдзень яды хапіла, — гаруе бабуля. — Унучку булёнчык зварыла...

— Ды ўнук мяне паклікаў. Паказаў... Гэта... Ну... Але ж я і падумаць не мог. А ён, халера, зноў прыляцеў. Даядаць...

«Вой дзед! Лепш бы ты прамаўчаў, — пакутуе Васілёк. — Зараз бабуля дасць дыхту, дык дасць. А булёну мне не трэба. Мне чубаткі шкада...»

— Пачакай, пачакай, бацька. Унук табе паказаў, што каршун нашу курачку дзярэ, а ты... Ты куды глядзеў?! — узлавалася не на жарт бабуля.

— Трасцу ў бок каршуну! Адкуль я ведаў, каго ён там трыбушыць?! — злуецца дзед.

— Выходзіць, бацька, у нашага ўнука розуму больш, чым у цябе?

«Ну, гэта бабуля дарма так кажа! Дзядуля ого які разумны! Ведае ўсіх птушак і звяроў». Абяцаў яму, Васільку, паказаць бабровую хатку. Толькі туды, на балота, цяпер не ўлезці. Дажджы прайшлі, і крапіва густая, у рост чалавека, парасла. Не, трэба дзеда ратаваць...

Васілёк вылазіць з-пад коўдры, тэпае на кухню. Знарок пазяхае, кулачкамі трэ быццам заспаныя вочы.

— Нешта ж ты, унучак, сёння мала прыкархнуў? — пытае бабуля.

— Выспаўся, — адказвае Васілёк і глядзіць у качарэжнік: там ляжыць недаедзеная каршуном чубатка.

— Во, бачыш, унучак? Не ўпільнаваў дзед — каршун задраў нашу курачку, — не супакойваецца бабуля.

— Дзед касу кляпаў. Гэта я варон лавіў і не ўгледзеў каршуна. Я вінаваты, — абараняе дзеда Васілёк.

— Цяпер позна рукамі махаць, — кажа дзед. — Панясу закапаю. Каб каршун не надта ўнаджваўся. Цяперака трэба глядзець ды глядзець курэй.

— Я іх буду пасвіць, — кажа Васілёк. — Толькі ты, дзядуля, выражы мне доўгі дубец, каб каршуна мог пужаць, калі да курак будзе чапляцца.

— Хіба што ты, унучак, дасі рады. На дзеда надзея малая, — лагодна гаворыць бабуля.

Васілёк апранаецца і выходзіць на вуліцу. Глядзіць у бок цёмнага лесу — там хаваецца каршун, пасля ідзе да хлява — там гуляюць куры, і... сварыцца на пеўня:

— А ты куды глядзеў? Ты ж касы не кляпаў?! Тожа мне, гаспадар...

Закапаў дзед Мікіта курыцу, плюнуў са злосці сабе пад ногі, ускінуў рыдлёўку на правае плячо і кіруе да хлява, дзе муляецца Васілёк.

— Дзядуля, а дзядуля! — раптам узрушана кажа хлопчык. — Давай зробім пудзіла. Ва ўсіх ёсць, а ў нас няма. Каршун будзе баяцца, і вераб'і маліну перастануць красці...

— Каршун, трасца яму ў бок, не надта пужлівы. А вось ратаваць вішню і маліну ад драздоў і вераб'ёў неяк, унучак, трэба. Можа і праўда...

— Праўда, праўда, дзядуля! Давай зробім пудзіла. Такое страшнае, каб усе птушкі пужаліся... і каб ва ўсёй вёсцы такога не было. Самае лепшае. Каб на конкурсе наша пудзіла першае месца заняло.

— Эне! Куды замахнуўся! — кажа павесялелы дзед Мікіта. — А хіба ёсць конкурс пудзілаў?

— Ёсць! Ёсць! — захліпнуўся да хвалявання Васілёк. — Мы з Сяргейкам вёску на веліках праехалі. Выбіралі, выбіралі на конкурс і ніводнага не выбралі. Абы што, а не пудзілы.

— Ты, унучак, з гэным Сяргейкам не надта хаўрусуй. Ён хлопчык харошы, але надта ўжо дападны, віхор, а не дзіця. На ім скура гарыць... Дык якія пудзілы вы бачылі?

— Абы што! — цвёрда адказвае Васілёк, трошкі думае і ўжо няўпэўнена дадае: — У гэнага дачніка пудзіла нічога, так сабе...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Ну, ну, — падахвочвае ўнука дзед Мікіта. — Раскажы, якое яно.

— Так сабе, — паўтарае Васілёк і апавядае: — Ну-у-у, у капелюшы саламяным. Праўда, капялюш з вялікай дзіркаю на самай макаўцы. Кашуля джынсовая, таксама падраная пад пахай...

— Гэта, унучак, пудзіла-інцылігент. Яго птушкі не баяцца. Мы з табою адчыбучым лепшае, — разважліва кажа дзед Мікіта, і ў Васілька ад гэтых слоў ажно ёкае сэрца.

Спачатку зазірнулі ў дрывотню. Тут у дбайнага гаспадара на тры, а можа, на чатыры гады дроў назапашана. Ды не абы — якіх — бярозавых. Пра тое неяк сам дзед хваліўся суседу. Сякі-такі і матэрыял ёсць: негабляваныя дошкі, стос яловых аполкаў, стаяць падпоркі пад яблыні — дрывотня прасторная. Выбраў стары дзве ямчэйшыя падпоркі і падаўся ў ток, дзе ў яго варштат і сталярны інструмент. Карову збылі гады са два таму, пра сена не трэба дбаць. Каб ток не пуставаў, зрабіў сабе майстэрню. Тут не надакучаюць мухі і авадні, павявае прахаладай, чуцён гаркаваты пах ад злежалага крыху падпрэлага знізу пазалеташняга сена.

Пакуль дзед маракуе над пудзілам, Васілёк асядлаў матацыкл, які стаіць у дальнім кутку, побач з сячкарняй. Некалі дзед Мікіта працаваў на чыгунцы, кожны дзень гойсаў на ім на працу. Цяпер у старога баляць ногі, вочы не так добра бачаць, апасаецца садзіцца на свой старэнькі «ІЖ».

Васілёк ганарыцца дзядулем — той мае за добрую працу медаль. Бліскучую дзедаву цацку Васілёк выпараў выпадкова. Корпаўся ў шуфлядзе стала, і там, сярод шпулек з ніткамі, гузікаў, электралямпачак, старых батарэек, анучак і квіткоў, іншай драбязы заўважыў з выгляду даволі простую, маленькую шэрую каробачку. Раскрыў, дастаў прыгожы медаль, прачытаў па складах: «Ве-тэ-ран працы». Адшукаў і пасведчанне аб узнагароджанні. З цяжкасцю, але — дзякуй, літары вялікія — расшыфраваў напісанае ў ім: «Пасведчанне. Лупскі Мікіта Сцяпанавіч за шматгадовую добрасумленную працу ад імя Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР ад 27 сакавіка 1985 г. узнагароджаны медалём «Ветэран працы».

«Трэба будзе Сяргейку медаль паказаць. Хай ведае, які ў яго, Васілька, дзед вялікі чалавек». Хлопчык трохі «пагазаваў» на двухногім кані — надакучыла. Што там робіць дзядуля? Можа дапамога патрэбна?

— Дзядуля! У пудзіла рукі і ногі будуць? — цікавіцца Васілёк.

— Ты хочаш, унучак, нават з нагамі? У што ж мы яго абуем? Тады порткі нейкія трэба яму шукаць. Без штаноў не выставіш людзям на пасмешышча, — разважае з сур'ёзнай мінай стары.

— Трэба, дзядуля, трэба! Каб было па-сапраўднаму. Каб быў падобны на дзядзьку, якога бачыў каля кароўніка. Тады каршун за сто кіламетраў будзе курэй абляцаць.

Мікіта перастаў грукаць малатком, нават выпрастаўся за варштатам: «Глядзі ты, ужо і да кароўніка дапяў!»

— Раскажы, унучак, што там за дзядзька быў? Што ён рабіў?

— Ляжаў каля кароўніка ў крапіве, — ахвотна пачаў апавядаць Васілёк. — Такі кудлаты, нягалены, чорны, у гумавых ботах, штаны на каленях падраныя, — спаў.

«Хто ж гэта зваліўся, да хаты сілаў не хапіла дацягнуцца? Гм-м... Нагледзіцца мой унучак тутака ўсякага...» А ўслых сказаў:

— Не перажывай, унучак, зробім пудзіла на заглядзенне людзям і на страх усім птушкам.

— Ура-а-а! Наша пудзіла зойме першае месца ў конкурсе, — шчыра ўзрадаваўся Васілёк.

Пудзіла сапраўды атрымалася маляўнічае, кідкае. Дзед напяў аблезлую трусіную зімовую шапку на чорны, укарэлы чыгунок-галаву, адшкадаваў старую, прашараваную на локцях ватоўку. Сяк-так нацягнуў на раскірэчаныя палкі-ногі зашмальцаваныя картовыя штаны. Урэшце, уставілі пудзіла ў лубяныя, з задранымі белымі насамі кірзачы і медным дротам прывязалі да раскірэкаў-падпорак. Васілёк кавалачкам белай крэйды намаляваў на твары-чыгунку вочы, нос, рот. Двума цвікамі Мікіта прыбіў пудзіла да жэрдак плота, для надзейнасці яшчэ прывязаў. Крыху памілаваўся на сваю хвацкую работу, паклыпаў у хату.

— Што старое, што малое — розум адзін. Здзяцінеў бацька, — пазіраючы ў акно, толькі і вымавіла гаспадыня.

Васілёк тым часам імчаў на веліку да Сяргейкі. Папярэдне, услед за дзедам, скочыў у хату, сюды-туды крутануўся, урэшце шмаргануў шуфлядкай стала, цішком намацаў ужо вядомую шэрую каробачку, крадком сунуў у кішэню шорцікаў і цяпер абганяў вецер.

Праз колькі часу яны ўжо абодва круціліся каля пудзіла і нешта шушукаліся, хіхікалі. Панабегла іншая вясковая дзятва, дзівілася, зайздросціла Васільку. Пасля, нібы спуджаныя вераб'і, разляцеліся па сваіх дзіцячых справах. Засталіся толькі Васілёк і Сяргейка.

Неўзабаве каля Мікітавага плота пачалі спыняцца дарослыя. Яны тыцкалі пальцамі на пудзіла, рагаталі. Мікіта ўпраўляўся па гаспадарцы, не-не, ды кідаў позірк на дасціпных вяскоўцаў, у душы цешыўся: «Хай паскаляць зубы. Пудзіла выштукаваў адмысловае. А то начапляюць нейкіх ануч, бліскучых стужак, думаюць гэтым спалохаюць птушак. Не-е-е... Цяпер і вераб'і хітрыя — на мякіне не правядзеш».

Пачынала спадаць спякота, але яшчэ смажыла будзь здароў, калі ля Мікітавай хаты спынілася зялёны «Масквіч-412». З яго выкаціўся тоўсты, круглы, на кароткіх нагах, лысы чалавек. Мікіта прыгледзеўся з-за дзвярэй тока, пазнаў старшыню сельскага савета, колішняга сакратара партыйнай арганізацыі саўгаса Івана Кандратавіча Рошака. Здзівіўся сам сабе: «Ніколі ж не заглядваў. Нешта, відаць, здарылася...»

Старшыня сельсавета выцер хусцінай твар і галаву, агледзеўся і паклыпаў да пудзіла. Падышоў да самага плота, прытаптаў чаравікамі крапіву, паўзіраўся на тварэнне Мікітавых рук, нядобра пакачаў галавою, моцна гукнуў: «Сцяпанавіч, а Сцяпанавіч! Выйдзі на хвілінку! Дзе ты?»

— Тутака, тутака, — падаў голас стары. — Хто там?

— Хадзі, Сцяпанавіч, сюды. Гаворка ёсць.

Дзед шчоўкнуў засаўкай, выйшаў на вуліцу.

— Ты, Сцяпанавіч, чалавек у добрых ужо гадах, а вычвараеш ліха ведае што! — пачаў старшыня.

Стары няўцямна паглядзеў на «уладу» і заззлаваў: «Не спытаў ні пра здароўе, ні пра жыццё... На-ча-а-а-льства! Пры той уладзе меў партфель і цяпер без фігі не да носа».

— Калі ўжо «ў добрых гадах», то можна і на «вы». Я з вамі свіней не пасвіў. За чым прыехалі? — секануў Мікіта.

Рошак на міг сумеўся, дробненька залыпаў вачамі.

— Хадзем, пакажу. — Кінуў коратка, са злосцю.

Стары нехаця патупаў услед старшыні сельсавета. Узіраўся ў чырвоны карак нечаканага госця, сіліўся дапетрыць, чаго нялёгкая прынесла.

Вось паглядзі... це, Сцяпанавіч, — поркнуў пальцам на пудзіла. — Гэта ж ліха ведае што! Непавага да дзяржаўнай узнагароды! Здзек!

Мікіта ступіў яшчэ два крокі, стаў упоравень з Рошакам, задраў галаву, і яму стала мластавата: на азадку пудзіла, прышпілены да ватоўкі, вісеў медаль. Стары прысунуўся яшчэ бліжэй да плота, прыжмурыў вочы, блізарука ўслых прачытаў: "Ветэран працы".

— Хто — ветэран працы? — абурана азваўся Рошак.

— Пудзіла! — з выклікам адказаў стары і дробненька засмяяўся.

Ён яшчэ ніяк не мог уцяміць, дабраць розуму, што яму рабіць, як сябе паводзіць. Усё было нечакана і па-дурному. «Не інакш унука работа. Чыя ж яшчэ? Усё выцікуе, выпара, з-пад зямлі дастане. Як жа ўскараскаўся на плот? Высакавата... Не адзін быў. Ды наўрад ці сам дадумаўся да такога...»

— Чаму не шануеце вялікую ўзнагароду партыі і ўрада? Гэта ваш медаль, — напіраў Рошак.

— А я адкуль ведаю, чыя гэта цацка? — Стары вырашыў свайго ўнука не здаваць, а лепш прыкінуцца дурнем. — Цяперака за грошы можна любы медаль і ордэн купіць. Нават Залатую Зорку Героя Савецкага Саюза прыдбаць. А што да гэтага медаля, то яго амаль кожны мае. Хто не біў лынды, а цягнуў сваю лямку. Ён жа ніякіх правоў не дае?!

Рошак бачыў, што стары блазнуе, а хвост яму прыціснуць вельмі хацелася. Як на тую бяду сарока матлянулася перад самымі вачыма, села на суседскую бярозу і кпліва застракатала. Маўляў, не сварыцеся, аддайце бліскучую цацку мне, у гняздо сваім дзеткам занясу. Вераб'і і чорныя дразды таксама не драмалі. Усчапіліся на электраправады, дзівіліся на пудзіла, ацэньваючы сітуацыю.

— Як гэта нічога не дае?! — урэшце ачомаўся старшыня сельсавета. — А праезд у электрычцы за палову кошту?!

— Я — былы чыгуначнік. Мне і так бясплатны праезд. Толькі куды ездзіць? Зімою з печы на ложак і назад? А летам голым задам па пяску — у Маскву?

— Гэта твая справа! — абурыўся старшыня сельсавета. — Ганьбіць дзяржаўную ўзнагароду не дазволім! Распусціліся людзі! Гатовыя на галаву сесці. Не здымеш — знойдзем управу! Пашкадуеш...

Ён рэзка, наколькі дазваляла паўната, крутануўся і падаўся да машыны. Грузна сеў, моцна ляпнуў дзверцамі, уключыў запальванне на поўным газе, ажно шыны завішчэлі па пяску — ірвануў.

Мікіта ў роздуме крыху пастаяў, прыкінуў, што без драбін тут ніяк не абысціся. Ідучы ў ток, цяжка ўздыхнуў: «Ну і дзянёк выдаўся! Каршун чубатку змарнаваў, унучак, каб ён здароў быў, дзеду свінню падклаў. Дзе ж гэта ён сам, гарэза?»

Васілёк, лёгкі на ўспамін, — тут як тут. Кінуў на вуліцы веліка, вясёлы, імчыць па дарожцы, ажно пяты бліскаюць.

— Дзед! Дзядуля! — радасна крычыць ён. — Наша пудзіла лепшае! Заняло першае месца ў конкурсе! Усе хваляць, не надзівяцца!

— Яшчэ б, унучак, ды не лепшае! Як-ніяк — ветэран працы! Скажы ты мне, дарагенькі, чаму гэта вы яму медаль не на грудзі, а на задніцу прысабачылі? Га?

— Не дастаў, дзед. Дальбог, не дастаў. Сяргейка нават на плот стаў, я яго за ногі трымаў, а ўсё роўна да грудзей не дацягнуўся.

— Значыцца, трэба вам яшчэ расці ды расці. Можа і вы, дасць Бог, па медалю на старасць заробіце, — памяркоўна гаворыць дзед Мікіта, бярэ драбіны і ідзе на вуліцу. Унук — следам за дзедам.

# 2011-Ы: ПАШАНЦУЕ ПРАДПРЫМАЛЬНЫМ





**НАГАДАЕМ: у адпаведнасці з усходняй астралагічнай традыцыяй, наступны год будзе Годам Труса (Ката). Увогуле, гэта не самыя дужыя і смелыя прадстаўнікі жывёльнага пантэону, але і яны валодаюць пэўнымі карыснымі якасцямі, якія дапамагаюць іх суродзічам выжываць у дзікай прыродзе. Што са звычак і ўласцівасцяў пушыстых сімвалаў новага года варта ўзяць на ўзбраенне чалавеку, расказала астролаг Нэлі ПАЦЁМКІНА-ГУНЕВА.**

Першае, што абагульняе гэтых жывёл, дык гэта здольнасць прызямляцца на чатыры лапы. І ў свой год яны перададуць гэтую здольнасць нам. **Таму, як бы ў наступныя 12 месяцаў жыццё ні выпрабоўвала, у якія б абставіны ні заганяла, у нас усё роўна будзе магчымасць вывернуцца і «прызямліцца на чатыры лапы», сцвярджае астролаг. А адляжаўшыся, можна зноў крочыць па сваіх справах.**

Нагадаем, згодна з народнымі вераваннямі, у ката 9 жыццяў. Ён — хітрун і адзіночка, ходзіць там, дзе захоча, яму ніхто не начальнік, але і ён нікому асабліва і не замінае. Трус увогуле не драпежнік, а істота мірная і надзвычай сімпатычная. Ні Трус, ні Кот не любяць «выскачак», паколькі самі яны — жывёлы невялікія і сціплыя. Для таго, каб выжыць, Трус павінен пастаянна лавіраваць, прыстасоўвацца, мяняць шубку, таму гэтыя якасці будуць вітацца на працягу ўсяго 2011 года. Кот увогуле заўсёды быў віртуозам прыстасавання (ніхто так не дэманструе сваю любоў да гаспадара, як галодныя барсікі-мурзікі). Адсюль вынікае, што энергетыка года будзе схіляць не столькі да канфліктаў, колькі да пошуку асабістай выгады, да ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, да ўмення знаходзіць кампрамісы дзеля дасягнення сваіх інтарэсаў.

**— У 2011-м адназначна пашанцуе людзям дзелавым, спакойным, прагматычным, рацыянальным і мэтанакіраваным, — сцвярджае Нэлі Іванаўна. Але ў першай палове года яна раіць бізнэсменам прыпыніць усе свае планы і ініцыятывы, паназіраць, як складзецца сітуацыя надалей.**

Вельмі верагодна, што няпростым для ўсіх часам стане наступная вясна, асабліва сакавік-красавік. У гэты перыяд Юпітэр будзе «прабягаць» па знаку Авена, што павысіць верагоднасць усплёскаў незадаволенасці — чымсьці ці кімсьці, спробаў вярнуцца да сітуацыі лета 2010 года, ініцыяваць канфлікт, адважыцца на авантуру. Шмат каму з нас давядзецца адстойваць свой імідж, сваю рэпутацыю, выратоўваць асабістыя адносіны, якія могуць апынуцца пад пагрозай. Сітуацыя ўскладніцца з-за таго, што прыхаванае і патаемнае можа стаць агульнавядомым. Сакавік і красавік запатрабуюць ад нас большай шчырасці ва ўсіх сферах жыцця. Асабліва небяспечнай сітуацыя можа скласціся ў тых, хто ў апошнія два месяцы 2010 года паддаўся на авантуру, арганізаваў маштабны праект. Ім давядзецца неадкладна ўносіць у свае планы карэктывы.

Бліжэй да чэрвеня градус напружанасці пачне спадаць. Лета-2011 будзе спрыяльным часам для росквіту бізнэсу, для праяўлення дзелавой ініцыятывы. Жаданне жыць лепш, зарабіць больш грошай можа стаць добрым стымулам для павышэння актыўнасці ў галіне бізнэсу і прынесці адчувальныя дывідэнды. Аднак астролаг папярэдзіла, што **сваю рэалізацыю атрымаюць планы, размешчаныя, так бы мовіць, у «гарызантальнай фінансавай плоскасці» (павелічэнне прыбытку), а вось на дасягненне новых кар'ерных вышынь і заваяванне новых «прастораў» разлічваць сёлета не варта.**

Калі напружанай вясной у кагосьці, хто мае слабасць да авантур, і атрымаецца «выбіцца» з агульнай масы, дасягнуць нейкага поспеху, то ўжо восенню яму давядзецца трымаць за ўсё справаздачу. У грамадстве будуць панаваць настроі шукаць вінаватых, жаданне пакараць, таму ў Год Труса ахвотнікам рызыкаваць вельмі спатрэбіцца асцярожнасць. Увогуле, восень будзе добрым часам для замацоўвання пазіцый, заваяваных летам. Але сезон збору ўраджаю для многіх стане перыядам вымушаных страт, расходаў. У гэты час важна з розумам «згубіць», каб потым «знайсці». Энергетыка восені не прадугледжвае моцнага супраціўлення падзеям, што будуць адбывацца.

У цэлым год будзе схіляць нас да асцярожнасці, пошуку кампрамісу, умацавання індывідуалізму, рацыяналізму і прагматызму. Узорам такой жыццёвай стратэгіі могуць быць народжаныя на пачатку 80-х.

**Нечага выключна экстраардынарнага, непераадольнага ў наступным годзе не прадбачыцца, запэўніла астролаг.** Але яна нагадала, што мы жывём у пераходны перыяд, калі адна эпоха (Рыб) змяняе другую (Вадалея). У такі час у чалавецтва заўсёды павялічваецца доля праблем і выпрабаванняў (прыродныя катаклізмы, тэхнагенныя катастрофы, перамены ў дзяржаўных, фінансавых структурах і г.д.).

— Так бывае заўсёды на стыку дзвюх эпох (кожная эпоха доўжыцца 2160 гадоў), таму ўсе паводкі, пацяпленні і пахаладанні клімату, якія назіраюцца на планеце апошнім часам, падзенні самалётаў і іншыя праблемы — вынік таго, што Зямля мяняе свой энергетычны паток. Такім чынам, ставіцца да ўсіх згаданых перамен і сітуацый як да прадвесця канца свету — няправільна. Год Белага Труса проста працягвае ланцуг гэтых пераўтварэнняў, да якіх нам давядзецца прыстасоўвацца.

**Адным з памылковых стэрэатыпаў пра Год Труса (Ката) з'яўляецца сцвярджэнне аб выключнай спрыяльнасці гэтага года для абрання шлюбам і нараджэння дзяцей.** І ў якасці асноўнага аргумента прыхільнікі гэтай тэорыі ківаюць на высокую пладавітасць абедзвюх жывёл. Але ніхто не акцэнтуе ўвагу на тым факце, што і Трус, і Кот — пяшчотныя эгаісты. Калі іх любяць — яны любяць у адказ, але іх вялікае патомства не з'яўляецца сведчаннем іх сямейнасці. Гэтыя жывёлы — эгаісты. **Стварыць сям'ю ў Год Труса (Ката) можна, але трэба памятаць, што потым прымусіць партнёра па шлюбе выконваць свае сямейныя, бацькоўскія абавязкі не атрымаецца.** Не прынясе карысці і спроба «націснуць» на свайго каханага, каб заахвоціць яго нарэшце пабрацца шлюбам. Раздражненне ад навязвання адказнасці можа мець вельмі непрывабныя формы, партнёр пачне пазбягаць вас, таму лепш узброіцца пяшчотай, ласкай, хітрасцю і цярпеннем, раіць Пацёмкіна-Гунева. З наскоку ў Год Труса зрабіць нічога не атрымаецца. Калі ў пары ёсць сумненні — ісці ў загс ці яшчэ пачакаць, варта звярнуцца па кансультацыю да астролага. Толькі складанне індывідуальных гараскопаў абаіх партнёраў зможа праясніць сітуацыю.

**Год Белага Труса (Ката) настане толькі 3 лютага 2011 года (у Беларусі яго можна пачынаць святкаваць у 4 гадзіны 42 хвіліны раніцы). А ў ноч з 31 снежня на 1 студзеня яшчэ будзе працягвацца Год Тыгра, таму не трэба спяшацца ўладкаваць Труса ці Ката — Тыгр можа раззлавацца і наслаць на вашу галаву непрыемнасці ў першы месяц года.**

**Таіса ВАСІЛЬЕВА.**

## Занатоўкі мастака



### КОЖУХ І БАЛЬЗАМ

Сядзім я ды Вова Кожух у жывапіснай майстэрні, што вокны ў вокны з музеем Максіма Багдановіча. З тым самым, дзе я некалі меў літаратурную школу «Вянок». Сядзім, каву збіраемся піць. Тут Кожух і кажа: «Мо бальзаму ў каву наліць, для водару?» — «Не, мне не трэба!» — «А я сабе налью...» Сядзім, п'ём каву, Вова Кожух — з духмяным бальзамам, а я — пустую і без цукру. «Я з бацькам любіў выпіць гарэлкі. Бацькі не стала, і няма з кім па-сур'ёзнаму выпіць. З бацькам выпіць — сур'ёзная справа!» — кажу Кожуху. «І я з бацькам любіў выпіць. Прыеду дамоў раніцай. Зазвычай я дамоў раніцаю прыязджаў. Я прыеду, а бацька на рабоце. Званю яму. Ён кажа, што раней за абед не прыйдзе. У абед мы ўжо сядаем і па-сур'ёзнаму выпіваем...» — кажа Кожух. «З бацькам выпіць было за шчасце...» — кажу. «А хто твой бацька?» — пытаецца Кожух... Нарэшце! Я там, дзе мяне ведаюць толькі як мяне.

### ЦІШЫН І ЧАРГОВАЯ ВЫСТАВА

Ігар Цішын прывозіў з Брусэля ў Мінск выставу жывапісу. Выстава працавала ў Музеі сучаснага мастацтва. Усе пабеглі на адкрыццё, а я не пабег, бо раніцаю, бегаючы ў парку, падвярнуў нагу і расцягнуў звязкі. Усе любаваліся новымі творамі Цішына, а я перабіраў старыя малюнкі. У мяне назбіралася шмат чужых малюнкаў. Я іх ніколі не збіраў, яны неяк самі заставаліся ад сумесных прац, ад сумеснага малявання ў адной майстэрні, ад агульных праектаў. Некалі разам з Ігарам мы планавалі напісаць пано «Вялікія архітэктурныя стылі». Пано не напісалася, а малюнкі засталіся. У мяне ёсць «Готыка» і «Антычны цыркус» Ігара Цішына. Выдатныя малюнкі. Цішын заўжды быў выбітным малявальшчыкам. Можа, і добра, што я не пайшоў на ягоную чарговую выставу. Добра, бо я не расчараваўся ў Цішыне. Мог бы пайсці і расчаравацца, а я не пайшоў, бо нага баліць, бо мне не трэба нікуды ісці, каб пабачыць працы таварыша Цішына.

### МАМА І ВЯСЕЛЛЕ

З мамаю я павінен быў пайсці на вяселле Аліны Абрамовіч і Сашы Нічыпаровіча. Збіраюся, грошы ў святочную капэрту закладаю, тут мама і тэлефануе: «Я не змагу пайсці на вяселле...» — «Ма-а-а, ну што такое?» — «Упала! Прыняла ванну. Вылазіла і ўпала. Пабілася моцна. Ударылася галавою. Цяпер галава баліць...» На вяселлі я сядзеў побач з пустым крэслам. Еў чырвоную рыбу і думаў пра маму. Нешта мне не завесялілася. Ціха, не развітваючыся, я сышоў.

### БАРАБАНСКІ І ЎЗНАГАРОДЫ

Партрэтыст моцнай, але крыху драўлянай, рукі Кірыл Барабанскі прыйшоў прасіць у кіраўніцтва Саюза мастакоў узнагароду. «Дайце мне званне! Працую-малюю-пішу, можна сказаць, што ўсё жыццё я прапісаў-прамаляваў-прапрацаваў, а ўзнагароды няма!» — «Званняў мала, а прэтэндэнтаў, сам разумееш, як у балоце чарцей!» — «Дайце медаля!» — «Ды з медалямі гэтымі яшчэ горш, чым з тымі званнямі!» — «Блі-і-ін, ну дайце хоць штонебудзь! А-а-а-а-а!» Праз год Барабанскі атрымаў медаля.

### КАЗІК КІСЕЛЬ І ПАТЭФОН

Дзядзька Казік Кісель свайму сыну Толіку і мне аддаў стары патэфон і дзясятак тоўстых плытак. На двухколай тачцы мы павінны былі завезці на сметнік той цёмна-чырвоны патэфон і чорныя плыткі ў шэрых папяровых капэртах з круглымі дзіркамі пасярэдзіне. На сметніку мы апошні раз завялі рыпучы і непаслухмяны састарэлы патэфон. Ён праспяваў нам песню пра баранаў, якія ранкам сышліся на вузкім мосце і не саступалі адзін аднаму дарогі. Патэфонныя бараны пабіліся, уваліліся ў рэчку і патанулі. Мы паразбівалі плыткі, патрушчылі камянямі патэфон, падралі папяровыя капэрты. Нешта барановае было ў нашым дзіцячым вандалізме. На памяць пра тую падзею ў мяне засталася патэфонная іголка, кароткая і тоўстая. Ёй зручна было прыколваць да чырвона-ліловай сціральнай гумкі злоўленага матылька.

### САВІЧЫ І ЯМА

Міліцыянер Савіч са сваёй міліцыянерыхай выбраліся ў Мінск. Гэта быў той час, калі нават па розную гаспадарчую драбязу даводзілася ездзіць з Дзяржынска ў Мінск, таму ў сталіцу местачкоўцы выбіраліся на цэлы дзень. Раніцай — туды, а позна ўвечары з вялізнымі сумкамі ў абедзьвух руках — назад. Савічы накуплялі ўсяго ўсялякага: і гумовыя боты тром сынам, і міліцыянерысе буркі з галёшамі, і самому міліцыянеру чаравікі з рантам. Батонаў набралі з абаранкамі, сушак ванільных, цукерак-падушачак з павідлам слівовым... Валізы былі як падняць. Цёмнымі дзяржынскімі вуліцамі Савічы валаклі валізы з чыгуначнай станцыі ажно на другі бок мястэчка, на сваю прымогілкавую вуліцу Чапаева. Як на зло, аўтобус на станцыю не прыйшоў, пэўна, зноў зламаўся. Давялося ўсю дарогу прайсці пешкі. Міліцыянер ішоў шпарчэй: вядома, мужчына. Каля рамбазы ён ужо апярэджваў жонку на метраў сто, калі не больш. Ён радаваўся, што хутка дом і можна будзе адкаркаваць пляшку гарэлкі. Ён бачыў пляшку з маленькай чаркаю і не заўважыў глыбокай яміны, якую ўдзень выкапалі вайскоўцы каля сваёй рамбазы. Нейкую трубу збіраліся яны пракладаць. Раніцай яміны не было, таму Савіч, як ішоў, так і пайшоў-паляцеў у цемру поўную халоднай гразі. Упаў, адчуў, што нагу пашкодзіў, сцяўся і змоўк. Ён маўчаў, бо вырашыў дачакацца жонкі, каб паглядзець, як яна ў гразкую яму зваліцца. Калі ён упаў, хай і яна ляціць у карказломную цемру. Яна і паляцела разам з батонамі ды абаранкамі. Савічыха паляцела на свайго Савіча. «Што ж ты не гукнуў мяне? Што ж ты мяне, жонку сваю, не папярэдзіў, чорт вусаты?»— «Каб табе, шаптуха чортава, было, як і мне. Калі муж у яміну ўваліўся, дык і жонка павінна была ўваліцца і ўвалілася! Гы-гы-гы!» Выпаўзлі Савічы з гразкай яміны, прыйшлі дамоў злыя і перапэцканыя з галавы да пятаў. Нагрэлі вады, памыліся, павячэралі, крыху выпілі і думалі забыцца на гісторыю з гразкай ямінай. Але гісторыя не забылася. Як хто ў мястэчку пачынае іншаму яму капаць, так яму і нагадаюць пра міліцыянера Савіча, якому на падкурчаную нагу жонка ўпала.

### АНДРЫЕЎСКАЯ І ДЭЛЬФІНЯНЯ

Мая знаёмая дзяўчынка — Ева Андрыеўская — выйшла ў святочны горад разам з татам. Тут, у сталічным і ўрачыстым Мінску, мы і сустрэліся. Ева гуляла з татам, які вярнуўся з падарожжа па Крыме. З самага Чорнага мора ён прывёз кубак з намаляваным дэльфінём. Ева з вялікім захапленнем распавяла пра свой новы кубак, у які можна наліць вады, і тады намаляванае дэльфіняня будзе плаваць.

**Адам ГЛОБУС.**

Минский городской центр недвижимости

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 27 декабря 2010 года ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА**

| | |
|---|---|
| **Наименование и характеристики продаваемого имущества** | **Административное помещение № 7 общей площадью 422,5 кв. м, инв. номер 500/D-7092844** |
| **Местонахождение имущества** | г. Минск, ул. Орловская, д. 58, пом. 7 |
| **Балансодержатель** | «Научно-производственное республиканское унитарное предприятие «КБТЭМ-СО», просп. Партизанский, 2, корп. Б, комн. 303, г. Минск |
| **Организатор аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, 220030, г. Минск, (017) 227 48 36 |
| **Начальная цена** | 1 285 522 200 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 120 000 000 белорусских рублей |

На продаваемое имущество обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней, примененных экономических санкций.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **27 декабря 2010 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 13.12.2010 по 24.12.2010 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 227 48 36, 227 40 22.**

**ООО «Бонди плюс» (УНП 190806765) РЕОРГАНИЗУЕТСЯ В ФОРМЕ ВЫДЕЛЕНИЯ ДВУХ УНИТАРНЫХ ПРЕДПРИЯТИЙ**

В связи с реорганизацией уставный фонд ООО «Бонди плюс» уменьшается до размера 6 089 839 212 (Шесть миллиардов восемьдесят девять миллионов восемьсот тридцать девять тысяч двести двенадцать) белорусских рублей.

**Требования кредиторов принимаются по адресу: Республика Беларусь, 220117, г. Минск, пр. имени газеты «Звязда», 16, комн. 5.**

**ООО «БОНДИ» (УНП 100868030) РЕОРГАНИЗУЕТСЯ В ФОРМЕ ВЫДЕЛЕНИЯ ДВУХ УНИТАРНЫХ ПРЕДПРИЯТИЙ**

В связи с реорганизацией уставный фонд ООО «Бонди» уменьшается до размера 3 139 600 (Три миллиона сто тридцать девять тысяч шестьсот) белорусских рублей.

**Требования кредиторов принимаются по адресу: Республика Беларусь, 220117, г. Минск, проспект имени газеты «Звязда», дом 16, комн. 1.**



Адбудаваны замак стаў сапраўднай разынкай для Ліды!

# ЧАМУ ПАСЯРОД ЛІДСКАГА ЗАМКА БУДУЮЦЬ НЕМАВЕДАМА ШТО?

**І што робіць у Лідскім замку «Юрий Миколаевич Радзивил» — разбіраўся на месцы <u>спецыяльны карэспандэнт «Звязды» Глеб ЛАБАДЗЕНКА.</u>**

Да «Дажынак» Лідскі замак ажыў. Другая вежа, якую не маглі дабудаваць дзесяцігоддзямі, нарэшце скончаная. Перарабілі і драўляныя галерэі на сценах — цяпер па іх хадзіць не страшна. На адной са сцен пераклалі верх, няякасна зроблены ў савецкі час. Што, праўда, зрабілі з гэтай жа таннай цэглы, якая яўна не пратрымаецца 700 гадоў... Я сабе на камін на лецішчы такую не рызыкнуў браць, узяў даражэйшую.

Я прайшоў у старую вежу (адбудаваная яшчэ пры камуністах). Многіх экспанатаў там няма, бо ў двары ідзе будоўля, па заканчэнні якой будзе ствараца новая экспазіцыя. Але і сярод таго, што пабачыў, знайшоў цікавостку.

На сценах — фотаздымкі і малюнкі, прысвечаныя вядомым родам, якія мелі маёнткі на Лідчыне, іх сямейным гербам. Тут — Радзівілы, Нарбуты, Друцкія-Любецкія... Аздоблена ўсё па-руску, што выглядае недарэчна — у сямісотгадовым замку Гедыміна, гонару БЕЛАРУСКАЙ зямлі... Адзін з подпісаў мяне ўвогуле, мякка гаворачы, здзівіў: «Юрий Миколаевич Радзивил». Так і хочацца дадаць нешта кшталту — «старшы навуковы супрацоўнік лідскага музея» альбо «загадчык фермы». Сумняваюся, што нехта звяртаўся да князя менавіта так... Бо было прынята альбо даваць некалькі імёнаў (Юрый Мікалай Радзівіл) альбо казаць «Юры, Мікалаеў сын». Імя па-бацьку тады не было як такога.



У двары замка збіраюцца будаваць, мяркуючы па падмурках, нешта грандыёзнае...

У музеі мне адказалі, што экспазіцыю ствараў іх супрацоўнік Валерый СЛІЎКІН. Да яго я наўпрост і звярнуўся.

— Зрабіў па-руску, бо не было часу перакладаць, трэба было паспець да «Дажынак»!.. — шчыра адказаў Валерый Сліўкін. — Там ёсць складанасці: назвы гербаў я знайшоў толькі па-руску, па-беларуску іх няма. Таму, каб не нарабіць памылак, я аздобіў па-руску. Ясна, з цягам часу пераробім, бо беларуская мова — нашая родная!..

Прызнацца, у часе наведвання замка не толькі «Юрий Миколаевич Радзивил» выклікаў у мяне пытанне. У замкавым двары збіраюцца будаваць нешта грандыёзнае — выкапаныя двухметровыя катлаваны, у якіх закладаюць капітальныя бетонныя падмуркі. Неяк трывожна на сэрцы, калі бачыш усё гэта ў замку 1323 года.

— Цяпер я рыхтую ліст да міністра культуры Паўла Латушкі, — кажа Валерый Сліўкін. — Бо гэтыя пабудовы, якія зараз узводзяцца ў замкавым двары, абсалютна не адпавядаюць гістарычнай рэчаіснасці!.. Гэтыя новыя пабудовы — выключна фантазія архітэктараў. Мы, музейныя супрацоўнікі, вывучалі гэтае пытанне. На тэрыторыі замка, паводле гістарычных звестак, былі драўляныя казармы каля заходняй сцяны, дамочак каменданта каля паўночнай і маленькая студня. Усё! Бо замак — гэта месца, дзе магло размясціцца як мага больш людзей у выпадку нападу ворагаў. Для таго Гедымін і збудаваў яго!.. А цяпер там з'явіцца нейкі рэстаран, гандлёвыя рады, нават адміністрацыйныя будынкі!.. Нашы краязнаўцы не маюць дакладных звестак аб тым, што там будзе. Я не ведаю, куды глядзела тая Рада па ахове спадчыны!..

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**
**Фота аўтара.**

### КАМЕНТАР ЛІДСКІХ ЧЫНОЎНІКАЎ
### «А вось я і не ведаю, навошта для драўляных пабудоў двухметровыя бетонныя падмуркі»

**Уладзімір САМСОНАЎ, начальнік аддзела культуры Лідскага гарвыканкама**, таксама сітуацыі не праясніў.

***— Уладзімір Віктаравіч, разгортваецца скандал, што ў двары нашага славутага Лідскага замка будуецца немаведама што... Што там дакладна будзе?***

— Я не магу адказаць... У цэлым — гэта праект, распрацаваны «Мінскпраектам». Яны 5 гадоў гэтую дакументацыю распрацоўвалі і згодна з ёй усё робіцца.

***— Колькі паверхаў будуць гэтыя пабудовы?***

— Аднапавярховыя. Там будзе казарма і кшталту такога... для рамеснікаў навеса.

***— А з якога яны будуць матэрыялу?***

— Драўляныя.

***— А навошта для драўляных пабудоваў такія капітальныя двухметровыя бетонныя падмуркі?***

— А вось я і не ведаю... Я так не ўнікаў у гэтае пытанне, бо працы ідуць згодна з праектам.

***— А чаму вы не ведаеце, калі вы — начальнік аддзела культуры?***

— На перыяд рэканструкцыі гэтым займаюцца аблвыканкам, упраўленне капітальнага будаўніцтва. Яны гэтым і займаюцца...

### КАМЕНТАР МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
### «Тое, што там будуецца, не адпавядае гістарычнай праўдзе»

Сапраўды, куды глядзела Рэспубліканская навукова-метадычная рада? Гэтае пытанне мы задалі **начальніку Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Ігару ЧАРНЯЎСКАМУ.**

***— Спадар Ігар, ці маюць лідчукі дазвол на тое, што будуюць у замку?***

— Яны маюць дазвол на работы як такія, без указання — ці будынак узводзіць, ці на сценах працаваць... Іншая справа, што яны не маюць дакладнай дакументацыі. Яны выкапалі катлаван, закладуць падмуркі — але што будуць рабіць над падмуркамі?..

***— Ці ж можна капаць такі катлаван без папярэдніх археалагічных раскопак?***

— Можна, калі на гэтым месцы праводзіліся раскопкі раней. У замку яны былі шырокамаштабныя. Але я не магу сказаць дакладна, ці трапілі яны гэтай будоўляй у пляму раскопак, ці не.

***— Гэтыя будынкі, пад якія ўжо выкапаны катлаваны і закладзены падмуркі, — ці адпавядаюць яны гістарычнай праўдзе?***

— Не, гістарычнай праўдзе яны не адпавядаюць па той простай прычыне, што ніхто не ведае, якія там будынкі былі. Ад старых будынкаў знойдзена толькі некалькі камянёў падмурка. Мы нават прыблізна не можам здагадвацца, якія гэта былі будынкі па памеры. Бо не выяўленыя контуры падмуркаў, а частка — у адным месцы, вугал — у іншым... Таму новая будоўля будзе толькі набліжанай да праўды стылізацыяй, а не аднаўленнем гістарычных будынкаў.

***— Ці будзеце вы прымаць нейкія захады, каб кантраляваць гэтую сітуацыю?***

— Будзем прымаць. Але хацелася б, каб гэтую сітуацыю, згодна з законам, кантраляваў той, каму гэта належыць. Біць пугай па хвастах — самі разумееце, гэта неэфектыўна... Калі на месцах сядзяць спецыялісты, якім напраму пунктам 2 артыкула 10 Закона аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны прадпісана гэта рабіць — і яны гэтага не робяць... З Мінска ўсім не накіруешся... Зараз я спрабую даведацца, што гэта будуць за будынкі...



«Очэнь прыятна, Юрий Миколаевич Радзивил!..»

---

Погляд

# БУЛЬДОЗЕР КАЛЯ ГІСТАРЫЧНАГА БУДЫНКА

## *Як абараніць канкрэтны помнік гісторыі і культуры: пікетамі альбо эфектыўнымі мерамі юрыдычнай адказнасці?*

**2011-ы аб'яўлены на тэрыторыі СНД годам культурнай спадчыны. І менавіта наш зямляк Ігар МАРТЫНЕНКА па даручэнні Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва СНД цяпер працуе над падручнікам па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Мяркуецца, што ён будзе выдадзены ў наступным годзе ў Маскве для будучых юрыстаў і студэнтаў іншых гуманітарных спецыяльнасцяў з усіх постсавецкіх краін.**

— Цяжка паверыць, але факт: юрыдычныя аспекты аховы гісторыка-культурнай спадчыны сёння сістэмна не вывучаюцца ні па адной спецыяльнасці. Па гэтай прычыне работнікі органаў аховы помнікаў і праваахоўных структур не ведаюць у поўным аб'ёме нюансаў прававога рэгулявання ў гэтай сферы. Мо адсюль і нізкая эфектыўнасць працы? — тлумачыць мэту стварэння гэтай вучэбнай праграмы Ігар Мартыненка. — У кампетэнтныя органы краін СНД і Балтыі накіравана 370 запытаў аб прымяненні заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Аналітычная праца ў гэтай сферы ў такім маштабе на постсавецкай прасторы раней не праводзілася.

**Што ж датычыцца непасрэдна беларускіх рэалій у сферы гісторыка-культурнай спадчыны, то некаторыя ключавыя праблемы, на думку Ігара Мартыненкі, наступныя.**

### ШТО АХОЎВАЦЬ І АБАРАНЯЦЬ?

— На жаль, дзяржаўны ўлік гісторыка-культурных помнікаў далёкі ад дасканаласці. Для таго, каб арганізаваць дзяржаўную ахову, трэба дакладна ведаць, што ахоўваць і абараняць. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь павінен быць абсалютна даступны кожнаму — і спецыялісту, і журналісту, і любому іншаму грамадзяніну.

Што ж маем цяпер? Спісы помнікаў былі надрукаваныя ў 1990 годзе пры дапамозе добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, потым з'явіўся іх электронны варыянт, а летась убачыла свет даведачнае выданне «Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь». Аднак... У тым жа годзе рашэннем урада былі ўнесены змяненні ў дачыненні да 48 аб'ектаў. А сёлета зменены характарыстыкі яшчэ 26 гісторыка-культурных каштоўнасцяў і праяўленняў чалавечай творчасці, прынятыя на ўлік больш за 80 новых помнікаў. У выніку прыгожым на выгляд даведнікам можна карыстацца, толькі адначасова трымаючы ў руках пастановы Саўміна. Наколькі гэта зручна — пытанне рытарычнае.

Пры гэтым, на мой погляд, Дзяржаўныя спісы асабліва каштоўных гісторыка-культурных аб'ектаў павінны зацвярджацца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, а помнікаў рэспубліканскага значэння — урадам.

### ЯК АХОЎВАЦЬ І АБАРАНЯЦЬ?

— Злачынствы супраць гісторыка-культурнай спадчыны не выяўляюцца, меры юрыдычнай адказнасці фактычна не прымяняюцца. За апошнія дзесяць гадоў у Беларусі не прад'яўлена ніводнага іску (?!) аб кампенсацыі страт, прычыненых канкрэтнаму помніку гісторыі і культуры, архітэктуры і горадабудаўніцтва, археалогіі. Хоць Закон (арт. 934 Грамадзянскага кодэкса) дазваляе нават папярэдзіць правапарушэнне: у судовым парадку можна патрабаваць спынення (прыпынення) дзейнасці, якая стварае пагрозу існавання гісторыка-культурнай каштоўнасці. Інакш кажучы, не трэба наладжваць пікеты каля гістарычнага будынка, які зносіцца бульдозерам, альбо помніка археалогіі, што разбураецца ў сувязі з будаўніцтвам дарогі. Упаўнаважаныя дзяржаўныя органы не проста маюць права, а ў большасці выпадкаў абавязаныя прад'явіць у суд іск аб спыненні такой дзейнасці. Але дзе такія іскі? А парушэнні закона ў гэтай сферы працягваюцца.

**ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»**

**Ігар Мартыненка — кандыдат юрыдычных навук, загадчык кафедры грамадзянскага права і працэсу Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Мае практычны вопыт працы на аператыўных пасадах у раённай, абласной і рэспубліканскай пракуратуры. Па пытаннях прававой аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў дванаццаці краінах надрукавана больш за 180 яго навуковых работ, у тым ліку 6 кніг.**

Працягваецца і варварства «чорных археолагаў». Вучоныя-гісторыкі даўно б'юць трывогу. І што ж? Сёння любы чалавек можа свабодна набыць металашукальнік і гэтак жа свабодна ім карыстацца. Адпаведная інфармацыя змешчана ў інтэрнэце. Таму нелегальныя археалагічныя раскопкі, як і раскопкі вайсковых пахаванняў, трэба кваліфікаваць як крымінальнае злачынства. Санкцыя павінна прадугледжваць канфіскацыю прадметаў, знойдзеных падчас незаконных раскопак, а таксама выкарыстанага пры гэтым абсталявання.

На заканадаўчым узроўні неабходна арганізаваць і барацьбу з інтэрнэт-рэсурсамі, якія прапагандуюць злачынныя формы скарбашукальніцтва. Прапаную ўнесці адпаведныя змяненні ў сумесную пастанову аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і Міністэрства сувязі і інфарматызацыі аб парадку абмежавання доступу карыстальнікаў інтэрнэт-паслуг да інфармацыі, забароненай да распаўсюджвання ў адпаведнасці з заканадаўствам. У выніку Міністэрства ўнутраных спраў зможа падрыхтаваць спіс сайтаў, якія ўтрымліваюць звесткі аб незаконным продажы прадметаў старажытнасці з археалагічных помнікаў.

Дарэчы, у нас няма закона па рэгуляванні аховы і выкарыстання археалагічнай спадчыны. Цяжка патлумачыць гэта нейкімі прычынамі, але факт застаецца фактам: прававы вакуум запаўняецца ведамаснымі інструкцыямі. У 1995-2006 гадах вытворчасць археалагічных даследаванняў рэгламентавалася ведамаснай «Інструкцыяй да дазволаў на выкананне археалагічных разведак і раскопак», якая была прынята на агульным сходзе Інстытута гісторыі НАН Беларусі і не з'яўлялася нарматыўна-прававым актам. Часткова запоўніўшы прававы прабел, што ўтварыўся пасля спынення дзеяння нарматыўных дакументаў СССР, гэтая інструкцыя рэгулявала працэдуру атрымання дазволаў на такую працу. Цяпер дзейнічае новая інструкцыя, зацверджаная 12 мая 2006 года бюро Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Аднак яна не зарэгістраваная ў Нацыянальным рэестры прававых актаў Рэспублікі Беларусь. Не з'яўляецца нарматыўным прававым актам і «Інструкцыя аб складзе, парадку распрацоўкі і зацвярджэння праектаў зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў», зацверджаная пастановай Міністэрства культуры ад 21 мая 2007 года.

Мяркую таксама, што Беларусі варта далучыцца да Канвенцыі ЮНЕСКА «Аб ахове падводнай культурнай спадчыны», да якой належаць гідраархеалагічныя помнікі. Аднак летась адзін адказны беларускі работнік, апаніруючы такой прапанове, заявіў, што «... Беларусь — не Грэцыя і не Крым». Каментарыі, як гаворыцца, залішнія.

А хіба ж не трэба ўстанавіць крымінальную адказнасць (у якасці самастойнага складу злачынства) за крадзёж прадметаў і дакументаў, якія маюць асаблівую гістарычную, мастацкую, навуковую і іншую культурную каштоўнасць, як гэта зроблена ў большасці краін СНД? Пакуль жа, згодна з беларускім заканадаўствам, крадзеж абраза альбо старажытнага рукапісу па сутнасці нічым не адрозніваецца ад крадзяжу электрычнага чайніка, мера адказнасці залежыць толькі ад ацэначнага кошту.

Мэтазгодна змяніць (павялічыць) тэрміны даўнасці прыцягнення да крымінальнай адказнасці за злачынствы, здзейсненыя ў дачыненні да прынятых на дзяржаўны ўлік гісторыка-культурных каштоўнасцяў. І тады асобы, вінаватыя ў зносе помніка ў розных завуаляваных формах (напрыклад, пад выглядам рэстаўрацыі), і тыя, хто ім садзейнічаў — у тым ліку работнікі кантралюючых органаў, — яшчэ доўга не змогуць спаць спакойна.

### ЯКІМ ПАВІНЕН БЫЦЬ КАНТРОЛЬ?

— Лічу, што ўжо даўно наспела неабходнасць аптымізацыі арганізацыйнай структуры органаў аховы помнікаў шляхам стварэння самастойнай дзяржаўнай інспекцыі па ахове і аднаўленні гісторыка-культурнай спадчыны, якая б падпарадкоўвалася непасрэдна Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь альбо ўраду і мела ў сваім складзе раённых ці міжрэгіянальных інспектараў з падпарадкаваннем толькі па вертыкалі.

Цяпер грамадскі кантроль ажыццяўляецца на падставе ўзгодненага з Міністэрствам культуры штогадовага плана, дзе адлюстроўваюцца аб'екты кантролю і пералік пытанняў, што падлягаюць разгляду на пасяджэнні камісіі. Гэта, дарэчы, прадугледжана п.14 Палажэння аб парадку ажыццяўлення грамадскімі аб'яднаннямі грамадскага кантролю за выкананнем заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны, зацверджанага пастановай Саўміна ад 22 кастрычніка 2008 года. У выніку ствараюцца рэальныя перадумовы для кіравання дзейнасцю па ажыццяўленні грамадскага кантролю.

На мой погляд, у нашых агульных інтарэсах стварыць такую сістэму, каб грамадскія аб'яднанні ўдзельнічалі ў абмеркаванні і распрацоўцы ўсіх ініцыятыў у сферы гісторыка-культурнай спадчыны, выступалі з уласнымі прапановамі па ўдасканаленні заканадаўства.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

БЕЗ РЭЦЭПТА

## Дапаможа часнок

**Рымскія патрыцыі называлі яго «смярдзючай ружай», ганарыстыя англічане — «вылюдкам», старажытныя кітайцы лічылі, што ён адпуджвае злых духаў.**



У 1720 годзе гэтая дзіўная расліна выратавала тысячы еўрапейцаў ад чумы. У розныя часы ў розных краінах часнок дапамагаў ад сардэчных і ныркавых захворванняў, сабачых укусаў і зубнога болю, астмы і пахмелля, рэўматызму і прастуды.

Сучасныя медыкі цэняць часнок не менш за сваіх папярэднікаў. Японскія вучоныя прыйшлі да высновы, што нават невялікая колькасць часночнага экстракту засцерагае наш арганізм ад разбуральнага ўздзеяння цяжкіх металаў — свінцу, ртуці, кадмію. У краінах, дзе стравы шчодра прыпраўляюць часнаком, анкалагічныя захворванні сустракаюцца радзей. Арыгінальны пах і смак часнаку залежыць ад вялікай колькасці эфірных алеяў, у ім таксама шмат вугляводаў, мінеральных соляў, вітамінаў групы B, вітаміну C, бэта-караціну, бялку.

**ЯК, КАЛІ І КОЛЬКІ?**

***Пры грыпе і прастудзе*** дапамагае сумесь часночнай кашкі з мёдам у суадносінах 1:1. Скруціце з ваты невялікія турундачкі, апусціце іх у кашку і ўстаўце ў кожную ноздру, мяняйце кожныя 2 гадзіны.

***Бародаўкі, лішаі, мазалі*** таксама можна лячыць часночнай кашкай. Для яе прыгатавання абабраныя зубкі часнаку разатрыце ў драўлянай ці фарфоравай ступцы драўлянай лыжкай.

***Пры атэрасклерозе і гіпертаніі*** выратуе сумесь часнаку і лімона (1:1), разведзеная гатаванай вадой. Піць яе трэба па 1 ст. лыжцы тры разы на дзень за 30 хвілін да яды на працягу месяца.

БУДЗЬЦЕ ЗДАРОВЫЯ

## Парым ногі правільна

**Вы прамерзлі і адчуваеце, што пачынаеце «расклейвацца»? Тэрмінова прыміце меры. Самае галоўнае — хуценька сагрэць ногі. Для гэтага зрабіце ножную ванну. Справа быццам простая і знаёмая ўсім з дзяцінства. Насамрэч, гэта самая сапраўдная фізіятэрапеўтычная працэдура, і яе эфектыўнасць залежыць ад таго, наколькі правільна мы яе праводзім.**

Працэдура грунтуецца на рэфлекторным расшырэнні крывяносных сасудаў ног пад дзеяннем тэмпературных раздражняльнікаў. Менавіта яны аказваюць вельмі эфектыўны ўплыў на арганізм.

1. Наліце ў таз цёплую ваду тэмпературай 37—39 °С. Распусціце ў ёй сухую гарчыцу з разліку 50 г (прыкладна 5 сталовых лыжак) на 5 л вады.



2. Апусціце ногі ў таз. Добра, калі вада будзе даходзіць да сярэдзіны галёнкі ці нават да каленяў. На працягу 3—5 хвілін дайце нагам сагрэцца.

3. Пачынайце падліваць у таз гарачую ваду так, каб кожныя 2 хвіліны яе тэмпература павышалася на 1 °С. Прыблізна праз 10—15 хвілін вы дасягнеце тэмпературнага піку ў 40—45° — для кожнага ён індывідуальны. У гэты час вы канчаткова пазбавіцеся ад адчування зябкасці і дрыжыкаў. Атрымлівайце асалоду ад цяпла на працягу яшчэ некалькіх хвілін.

4. Дастаньце ногі з таза, вымыйце цёплай вадой, насуха вытрыце ручніком, надзеньце шарсцяныя шкарпэткі і выпіце кубачак духмянай травяной гарбаты з мёдам і лімонам, пры жаданні можна дадаць туды адну чайную лыжку каньяку.

**-2712-**

СЕЗОННЫЯ КЛОПАТЫ

## У чым пойдзем па снежнай кашы?

**83 тысячы кіламетраў — прыкладна столькі, як падлічылі вучоныя, чалавек у сярэднім праходзіць за ўсё жыццё, таму, выбіраючы абутак, яго зручнасць мы цэнім у першую чаргу. Для зімовых чаравікаў гэты крытэрый пры нашым кліміце і не прыбраных ад наледзі ды хлюпоты вуліцах важны ўдвайне.**

Самым прыдзірлівым чынам трэба паставіцца да падэшвы. Яна павінна: не трэснуць у марозы, не адклеіцца ў слату, захоўваць цяпло, быць аднachасова трывалай і пластычнай (ёй давядзецца вытрымліваць да трох тысяч выгінаў на дзень) і, нарэшце, мінімальна слізгацець. З сучасных падэшвенных матэрыялаў самыя прыдатныя — поліўрэтан і тэрмапласт. Першы добра ўтрымлівае цяпло, не баіцца солі, але можа не вытрымаць марозу і падвесці ў галалёдзіцу. Чаравікі на тэрмапласце, прама скажам, — не «пушынкі», затое гэты падэшвенны матэрыял, нават у гладкім варыянце, лепш утрымлівае на ледзяной паверхні. Калі ж на ім маецца рыфленне, то шанц паслізнуцца яшчэ меншы. Прычым «палоснае» рыфленне больш учэпістае, чым у выглядзе сеткі і шыпоў.

Выбраўшы боты, прымервайце абавязкова абодва — у большасці з нас памеры левай і правай ступняў адрозніваюцца. Калі абутак, падбіты футрам, цеснаваты, не разлічвайце, што футра «абамнецца» і чаравікі стануць свабоднымі. Футра, якое «ўтрамбавалася», ужо не так грэе, а з-за адсутнасці свабоднага месца пальцы ног будуць мерзнуць.

***КАРЫСНАЯ ПАРАДА: не марце зімой пра вытанчаную ножку Пяпялушкі — абутак для гэтай пары года трэба набываць на 1—1,5 памера большы, чым той, які вы носіце ў іншыя сезоны.***

За выжывальнасць зімовага абутку давядзецца грунтоўна пазмагацца. Майце на ўвазе, што бляск пры дапамозе крэму і шчоткі наводзіць трэба толькі на сухі абутак. Але рабіць гэта трэба гадзін за 10 —12 да выхаду на вуліцу. Менавіта за гэты час крэм утварае плёнку, якая засцерагае скуру ад вады і бруду. Абутак, пачышчаны зранку, перад імі зусім безабаронны.

САМІ З РУКАМІ

## Святочная паштоўка



**Любую віншавальную паштоўку можна купіць у краме, а можна зрабіць сваімі рукамі. Вышыўка крыжыкам, якая стала зноў моднай у апошнія гады, дазволіць зрабіць ваша віншаванне па-сапраўднаму эксклюзіўным.**

**ВАМ СПАТРЭБІЦЦА:** *баваўняная канва, мулінэ.*

Вышытыя па схеме карцінкі можна выкарыстаць і ў якасці ўпрыгажэння для кухоннага ручніка, сурвэтак, святочнага настольніка. Калі такую вышыўку ўставіць у рамку, атрымаецца выдатная карціна на сцяну і цудоўны падарунак.

ЗАНАТУЙЦЕ

## Прадукты, якія дадаюць аптымізму

**Какава і шакалад.** Яны змяшчаюць вялікую колькасць магнію, без якога наш арганізм літаральна трасе ад напружання. Дастаткова з'ядаць па кавалачку шакаладу кожны дзень.

**Арахіс.** Змяшчае тыямін — вітамін «аптымізму». Неабходна штодня з'ядаць па 5 шт. арахісу.

**Бананы.** Адзін банан у дзень стымулюе ў нашым арганізме выпрацоўку сератаніну. А калі гэтага рэчыва не хапае, нашы нервы пачынаюць «сваволіць» на роўным месцы.

**Аўсянка.** Талерачка кашы зранку — і ваш настрой у поўным парадку, бо авёс змяшчае тыямін і магній — «двайны зарад бадзёрасці».

**-2713-**

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

## Дзевам трэба пазбягаць паспешлівасці, а Блізняты не павінны паддавацца ўпадніцкаму настрою

**АВЕН**. Можа з'явіцца маса задум і сіл для іх ажыццяўлення. На вышыні будзе і вынаходлівасць, дзякуючы чаму заслужыце павагу з боку калег. Цяпер неабходна разабрацца з назапашанымі справамі і ўхіліць недаробкі. У аўторак пажадана не прадпрымаць нічога новага, будзьце асцярожней і ўважлівей.

**ЦЯЛЕЦ**. Засяродзьцеся на рашэнні першачарговых задач, бо з усімі справамі адразу не справіцеся, прынамсі — без староннняй дапамогі. Не спяшайцеся і назапасьцеся ўвагай і цярпеннем: паспешлівасць толькі павялічыць колькасць працы. Паспрабуйце пазбягаць адкрытага супрацьстаяння, бо канфлікты пакажуць вас не з лепшага боку. Не выключана, што перапыніцца вашы адносіны з кімсьці.

**БЛІЗНЯТЫ**. Паспрабуйце не паддавацца ўпадніцкаму настрою. У справах пажадана прытрымлівацца традыцыйных пунктаў гледжання. На працы верагодныя рэзкія змены, аднак такое становішча спраў не вельмі паўплывае на вынік вашай дзейнасці. Магчыма, калі праявіце зацікаўленасць і актыўнасць, з'явіцца вельмі перспектыўны праект. Тыдзень можа прынесці абнаўленне некаторых партнёрскіх адносін. Гэтак жа гэты перыяд, верагодна, будзе звязаны з канструктыўнымі дыялогамі. Асноўныя праблемы могуць прынесці такія заняткі, як выхаванне дзяцей і добраўпарадкаванне кватэры.

**РАК**. З дапамогай творчага падыходу і кемлівасці вы многага можаце дасягнуць. Можа стаць цяжарам пільная цікавасць з боку партнёраў і калегаў. Не выключана, што нядобразычліўцы паспрабуюць справакаваць вас на канфлікт. І ўсё ж поспех будзе спадарожнічаць вам. У пятніцу адбудзецца падзея, якая можа адкрыць перад вамі новыя магчымасці.

**ЛЕЎ**. Практычна ўсё, што плануеце на гэты тыдзень, спраўдзіцца. Але для гэтага спатрэбіцца рашучасць, актыўнасць, уменне хутка рэагаваць на сітуацыю, якая стварылася. Засталося здзейсніць нязначны рывок наперад, пасля чаго можна будзе з чыстым сумленнем заняцца падрыхтоўкай да святаў. Задумайцеся аб важным набыцці. Начальства ацэніць вашы ідэі і, цалкам верагодна, прапануе павышэнне. Сустрэчы з сябрамі, абмен уражаннямі і новымі ідэямі — усё гэта дасць магчымасць раскрыцца вашаму патэнцыялу.

**ДЗЕВА**. Можаце дасягнуць вялікіх поспехаў пры рэалізацыі тых задач, якія дыктуюцца імгненнай неабходнасцю. Толькі пазбягайце паспешлівасці, рабіце ўсё калі не па вызначаным загадзя плане, то хаця б спакойна і паслядоўна. Змены, якіх вы так доўга чакалі, не наступяць без рашучых дзеянняў. Вельмі карысна цяпер раіцца з калегамі. Часцей з'яўляйцеся ў прыемным вам асяроддзі. Новыя знаёмствы могуць адыграць важную ролю ў вашым жыцці.

**ШАЛІ**. Сябры могуць зрабіць цікавую прапанову, якая адкрые новыя магчымасці. Мінулыя заслугі дазволяць пачаць досыць перспектыўную справу. Не давайце эмоцыям захапіць вас і памятайце, што гнеў — дрэнны дарадца. Старанна фільтруйце атрыманую інфармацыю. У выхадныя вырашацца сямейныя праблемы, пачнецца перыяд поўнага паразумення і неабходнай дапамогі з боку блізкіх людзей.

**СКАРПІЁН**. Праца не запатрабуе залішняй напругі. На ваш кар'ерны рост можа станоўча паўплываць чалавек, які даўно працуе з вамі, так што дарма пазбягаеце больш цеснага супрацоўніцтва з ім. Калі вы адправіцеся падарожнічаць, то чакайце выгадных знаёмстваў з замежнымі партнёрамі і камерцыйных прапаноў, якія лепш не адхіляць. Не выключана, што выявяцца калісьці выкрадзеныя або зніклыя рэчы. У нядзелю вам прыйдзецца паспяшацца на дапамогу камусьці са сваякоў.

**СТРАЛЕЦ**. Дапамажыце іншым людзям — у працэсе зразумееце, як лепш справіцца са сваімі праблемамі. З'явіцца магчымасць адправіцца ў невялікую паездку, кагосьці наведаць, з кімсьці сустрэцца. Пры кантактах з дзелавымі партнёрамі могуць паўстаць нечаканыя сітуацыі, якія пацягнуць нешаблонных дзеянні з іх боку. Парады, якія вы дасце сваякам, будуць вельмі своечасовыя і могуць дапамагчы ім палепшыць стан свайго здароўя.

**КАЗЯРОГ**. З'явіцца нядрэнныя шанцы прасунуцца па кар'ерных усходах. Для гэтага неабходная добрасумленнасць, своечасовае выкананне працы, а калі паспееце за адведзены час выканаць нешта звыш сваіх абавязкаў, то поспех вам тым больш забяспечаны. Пачнуць рэалізоўвацца запаветныя жаданні. Не забудзьцеся наведаць сваякоў, ім неабходна ваша ўвага. Паспрабуйце супамерна расходаваць свае сілы, каб не вытхнуцца да канца тыдня.

**ВАДАЛЕЙ**. Аднолькава значнымі фактарамі будуць і ваш сацыяльны статут, і добрыя адносіны са сваякамі. Узрастае сіла перакanання, якая дапамагае наладжваць новыя карысныя сувязі. Не бойцеся ўплыву вышэйстаячага кіраўніцтва і дзейнічайце, зыходзячы з грамадскіх інтарэсаў. Адстойвайце сваё меркаванне ў гэтым пытанні.

**РЫБЫ**. Калі возьмецеся за будаўніцтва замкаў, не выкарыстоўвай ў якасці асноўнага матэрыялу паветра, а замест падмурка — пясок. Глядзець на жыццё на гэтым тыдні трэба максімальна прагматычна. Паспрабуйце завяршыць усе сур'ёзныя і неадкладныя справы, каб не вяртацца да іх пасля.



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

| Наименование предмета аукциона | Капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка | Капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|---|
| Местонахождение недвижимого имущества | Брестская обл., Барановичский р-н, 1,5 км южнее д. Млынок | Брестская обл., Барановичский р-н, 1,5 км южнее д. Млынок |
| Продавец недвижимого имущества | Главное управление командующего внутренними войсками Министерства внутренних дел, тел.: 80163 45 72 33, 45 25 01 | |
| Сведения о предмете аукциона | Специальное хранилище из бетона с четырьмя воздухозаборными трубами, площадь – 1365,1 кв.м. Земельный участок площадью 0,3004 га, срок аренды – 99 лет. | Сооружение специального хранилища из бетона, площадь – 951,0 кв.м. Земельный участок площадью 0,5322 га, срок аренды – 99 лет. |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 65 812 180 | 67 284 407 |
| Сумма задатка, руб. | 6 581 000 | 6 728 000 |
| Реквизиты счета для перечисления задатка | р/с 3642902530005 ГФ по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538, срок внесения – до подачи заявления на участие в аукционе | |
| Организатор аукциона | ***Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел.: 20 87 85, 23 12 63, www. brest–region.by*** | |

Аукцион состоится **24 декабря 2010 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Более подробная информация об участии в аукционе опубликована в газете «Звязда» от 11.09.2010 № 178.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержд. постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404, 413, фонд «Брестоблимущество» в рабочие дни с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30; прием заявлений заканчивается 24 декабря 2010 года в 10.00.**


## Кацяня стала закадычным сябрам павіяна з Мінскага заапарка

Малпачка з Мінскага заапарка па мянушцы Ціпі моцна пасябравала з кацянём. Пра гэта карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» расказала заатэхнік Эла Рабава.

На свет Ціпі з'явілася ўсяго некалькі месяцаў назад і жыла ў кватэры дырэктара заапарка. Справа ў тым, што ў нявол павіяны-гамадрылы (да гэтага роду прыматаў належыць Ціпі) часта забіваюць сваіх дзіцянят, і іх даводзіцца выходжваць работнікам. Новананароджаную малпачку паілі з бутэлечкі, мянялі ёй падгузкі і нават пашылі спецыяльны касцюмчык. Нядаўна настаў час прывучаць малпачку да жыцця ў заапарку. Таму на цэлы дзень Ціпі пакідалі ў вальеры, а каб ёй не было сумна, пазнаёмілі яе з кацянём. Работнікі нямала здзівіліся таму, як хутка яны пасябравалі. Цяпер кожны наведвальнік заапарка можа ўбачыць, як гуляюць незвычайныя прыяцелі.

*«Мінск—Навіны».*


**Наблюдательный совет открытого акционерного общества «ДСТ № 2, г. Гомель» СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ, которое состоится 23 декабря 2010 года по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 28, 4-й этаж (конференц-зал).**

**Повестка дня:**

1. Об оказании безвозмездной помощи.

Начало собрания в 10.00.

Регистрация акционеров, их представителей с 9.00.

С собой иметь **документ, удостоверяющий личность акционера**, представителям — **доверенности.**

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




## АДКАЗЫ НА СКАНВОРД

**Па гарызанталі:** Алекс. Аер. Анды. Ямал. Прыбор. Ажур. Спадак. Кама. Ліст. Анабас. Ракада. Ікол. Іран. Алі. Відэлец. Удача. Руна. Антэна. Рубанак. Кока. Арак. Адам. Атака. Жытомір. Гіра. Аэрастат. Талент. **Па вертыкалі:** Пуня. Міні. Кавун. Столін. Ласт. Лідар. Лыжка. Лаба. Атрад. Арбат. Цана. Тога. Парабак. Аксаміт. Нож. Кубак. Кір. Друкар. Апарат. Сары. Рана. Бут. Макі. Дэка. Табар. Анод. Ада. Чака. Асанна. Аметыст.

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
| --- | --- | --- | --- |
| Мінск — | 8.17 | 15.48 | 7.31 |
| Віцебск — | 8.14 | 15.30 | 7.16 |
| Магілёў — | 8.08 | 15.38 | 7.30 |
| Гомель — | 7.56 | 15.43 | 7.47 |
| Гродна — | 8.31 | 16.04 | 7.33 |
| Брэст — | 8.23 | 16.13 | 7.50 |

## Месяц

*Першая квадра 13 снежня. Месяц у сузор'і Рыбы.*

## Імяніны

**Пр.** *Аляксея, Васіля, Івана, Мікалая, Пятра, Рыгора, Сцяпана, Фёдара.*

**К.** *Дануты, Клары, Сабіны, Даніэля, Сцяпана.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.








Віншуем дарагую **Праскоўю Захараўну КАВАЛЁВУ**, ветэрана ВАВ і працы, з 98-годдзем!

Жадаем усяго самага лепшага!

**Прапраўнучка Аня, праўнукі Дзіма, Саша, Валя, Лена, Санька, унукі Уладзімір, Андрэй, Наталля, дачка Валя і зяць СІТНІК.**

## Усміхнемся!

**Калі муж храпе, гэта значыць, што ён сёння начуе дома!**

☺

Урач уваходзіць у палату і чуе, як пацыент з высокай тэмпературай кажа сваёй жонцы, якая сядзіць каля яго ложка:

— Ты мая прыгажуня, мая разумніца, маё багацце, самая прыгожая на свеце...

Урач звяртаецца да жанчыны:

— І даўно ў яго трызненне пачалося?

☺

**Асаблівасці нашай медыцыны. Насамрэч плацяць усе: хто можа — грашыма, хто не можа — здароўем.**

☺

Дыялогі ў сеціве.

— Лянота мыць посуд, а чысты канчаецца...

— Табе патрэбна пасудамыечная машына.

— Я ўжо нагледзеў... але яе бацькі супраць )))

☺

**Лепшы спосаб пазбегнуць выпадковых знаёмстваў — гэта, вяртаючыся з крамы, весела махаць туалетнай паперай.**




# КОЛЬКАСЦЬ ВЯНКОЎ ХАТЫ

● У складаным працэсе будаўніцтва хаты цікавасць выклікае агульная колькасць вянкоў. На Рускай Поўначы, дзе ўзводзіліся двух'ярусныя хаты, іх магло быць 19 ці 21. Там, дзе было цяплей і жыллё было аднапавярховым, клалі 13 вянкоў (у любым выпадку — няцотная колькасць).

● Пра што можа сведчыць лік 13 у будаўнічым кантэксце? Такая колькасць вянкоў з'яўляецца яшчэ адным прамым сведчаннем таму, што жыллё чалавека ўвасобіла ў сабе мадэль свету, Сусвету, Космасу. Вядома, што найважнейшым структураўтваральным лікам міфалагічнай светабудовы з'яўляецца лік 12 — як вытворнае ад сумяшчэння каардынат прастораў (чатыры бакі свету) і часу (трохмерное вымярэнне: мінулае, цяперашняе і будучае): 4 х 3 = 12. Столькі ж сузор'яў праходзіць сонца на працягу гадавога колазвароту, столькі ж месяцаў мае наш каляндарны год, такая колькасць вучняў у Ісуса Хрыста. Жыццёвая прастора хаты складалася з 12 вянкоў. Разам з тым драўляны зруб замыкаў (закругляў, закальцоўваў) 13-ы вянок, які знаходзіўся ўжо над узроўнем столі, выходзіў за рамкі жыллёвай прасторы і функцыянальна выконваў зусім іншую ролю. Ён быў пераходным, «злучным звяном» паміж светам жывых і чароўнай сферай — месцам рассялення вярхоўных багоў.

● У чырвоным куце паміж трэцім і чацвёртым бервяном клалі сярэбраную ці залатую манету. Відавочна, у гэтым старажытнаславянскім знаку ахвярапрынашэння адбіўся ўплыў хрысціянскай праваслаўнай традыцыі, у якой адмысловым шанаваннем карысталася трыадзіная сутнасць Бога — Бог Бацька, Бог Сын і Святы Дух.

● Як толькі апошняе бервяно будзе старанна падагнанае, перакладзенае высушаным мохам, гаспадыня падае наверх гліняную міску са збожжам. Адзін з майстроў-цесляроў абыходзіць будынак па перыметры і пасыпае збожжам зямлю па абодва бакі сцен, жадаючы гаспадарам шчасця, здароўя, багацця.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

# ФЭН-ШУЙ ГАРАСКОП

**Нядзеля, 12 снежня**

Пачатак актыўнага перыяду і настрою на зносіны, выхад у людзі. Праўда, ролі першага плана выканаюць хутчэй знешнія эфекты, чым рэальныя вынікі. Добры час для адпачынку, сустрэч, паходаў па цікавых месцах, а таксама пакупак эстэтычнай скіраванасці. Час папаўнення запасаў маральных сіл.

**Панядзелак, 13 снежня**

Засяродзіцца на працы і чыста практычных момантах павінна быць звычайна прасцей, чым звычайна. Ніякіх фактараў, якія адцягваюць увагу, парываў і імпульсаў: усё проста, роўна і прама, як і бывае, калі не знаходзіцца парушальнікаў спакою. Праўда, адваротным бокам медалю стане дэфіцыт баявога настрою з куражом, а таксама эмацыйная стрыманасць.

**Аўторак, 14 снежня**

Перыяд характарызуецца кантактнасцю і кароткім, але адчувальным эмацыйным уздымам. Неабдуманыя, але радыкальныя крокі калі і не матэрыялізуюцца ў пэўныя пралікі, то нервовасць і турботу прынесці могуць. Нікуды не спяшайцеся і не фарсіруйце падзеі.

**Серада, 15 снежня**

Імкнуцца наперад з новымі планамі і задумамі трэба не тое каб з аглядкай, але выразна ўяўляючы сабе сённяшнія вузкія месцы. Час адзначаны неўраўнаважанасцю, павышанай аварыйнасцю і праблемамі ва ўзаемаадносінах з навакольнымі. Сёння лепш праявіць як мага больш развагі і акуратнасці, а таксама, улічваючы агульны канфліктны фон, не націскаць на пытанні, якія патрабуюць сумеснай працы.

**Чацвер, 16 снежня**

Лепш мінімізаваць сваю актыўнасць, мабілізаваць увагу з асцярогай і нікуды не спяшацца — не да часу развітая бурная дзейнасць можа забяспечыць вялікім аб'ёмам працы на лік вызваліцца наступствам, ды і для здароўя будзе значна карысней і бяспечней на ўмоўным беразе.

**Пятніца, 17 снежня**

Гэта не час наибольшай канцэнтрацыі, дакладнай арганізацыі і магутных валявых якасцяў, але, па-першае, не да ўсіх мэт лепш ісці прама, а па-другое, добры настрой і ўменне прыцягнуць памагатых, якія валодаюць неабходнымі ведамі або рэсурсамі, часта аказваюцца значна больш карыснымі якасцямі.

**Субота, 18 снежня**

Не самы час заняцца сур'ёзнай справай, але яго можна прысвяціць цікаваму і актыўнаму адпачынку. Вядома, пажадана ў гэтым не перашчыраваць — пачуццё меры не шкодзіць практычна ніколі — і не ператварыць працэс запраўкі сіламі і эмоцыямі ў іх выкід у космас.

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by; e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ: тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by.

Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33 310. Індэкс 63850.
Зак. № 6038. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12